View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk

brought to you by CORE

Установа адукацыі

“Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”

# ДАКРАНУЦЦА ДА САПРАЎДНАЙ ПАЭЗІІ: ВЫВУЧЭННЕ ВЕРШАВАНЫХ ТВОРАЎ У ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЕ

Дапаможнік

Брэст

БрДУ імя А.С. Пушкіна

2017

УДК 028.1(075.2)=161.3
ББК 74.202.4-5*84
С 99

*Рэцэнзенты:*
дацэнт кафедры
прыродазнаўчых і лінгвістычных
дысцыплін і методык іх выкладання
УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы»,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
**З.М. Тамашэвіч**

прафесар кафедры беларускага літаратуразнаўства
УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна,
доктар філалагічных навук
**З.П. Мельнікава**

**Сянкевіч М.І.**
С 99 Дакрануцца да сапраўднай паэзіі:вывучэнне вершаваных твораў у пачатковай школе : дапаможнік / М.І. Сянкевіч ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2017. – 81 с.

У дапаможніку раскрываюцца метады і метадычныя прыёмы навучання малодшых школьнікаў асэнсаванаму ўспрыманню класічных вершаваных твораў, даюцца метадычныя парады па далучэнні дзяцей да разумення вобразаўтваральнай функцыі слова, а таксама рэкамендацыі па аналізе канкрэтных мастацкіх твораў, што трывала замацаваліся ў чытанках для пачатковай школы.

Адрасуецца студэнтам псіхолага-педагагічнага факультэта, выкладчыкам, настаўнікам.

УДК 028.1(075.2)=161.3
ББК 74.202.4-5*84

# СЛОВА ДА ЧЫТАЧА

Па абавязку працы мне часта даводзіцца прысутнічаць на ўроках літаратурнага чытання, на якіх вывучаюцца класічныя вершы. І вось што адразу трапляе пад увагу: неспрактыкаваны настаўнік не заўсёды ўлічвае тое, што лірычны твор, акрамя знешняга зместу, мае яшчэ і ўнутраны падтэкст, які прыхаваны за словам. Былі і небеспадстаўныя папрокі: чаму ў нас адсутнічаюць метадычныя дапаможнікі, якія б прапаноўвалі ўзоры аналізу лірычных твораў, давалі кампетэнтныя парады? Праўду сказаць, асобныя рэкамендацыі па вывучэнні творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа, некаторых іншых беларускіх класікаў друкаваліся і друкуюцца цяпер на старонках часопіса «Пачатковая школа». Ёсць яны і ў метадычных распрацоўках да падручнікаў па літаратурным чытанні, хоць, трэба прызнаць, далёка не заўсёды належнай якасці.

Задума дапаможніка ўзнікла падчас гутарак са студэнтамі і настаўнікамі, некаторыя змешчаныя ў ім матэрыялы ўжо пабачылі свет у перыядычным друку і былі прыхільна сустрэты чытачамі.

Аўтар дазволіў сабе папярэдзіць канспекты ўрокаў кароткімі прадмовамі. Асобнымі ўкрапленнямі (яны пазначаны літарамі З. М. – заўвагі метадыста) пададзены парады, якія адрасаваны найперш студэнтам спецыяльнасці «Пачатковая адукацыя» псіхолага-педагагічнага факультэта. Аўтар, не прэтэндуючы на абсалютную ісціну, выказвае свой пункт гледжання, нярэдка адыходзіць ад традыцыйнай методыкі.

Пры выбары твораў для разгляду мы не арыентаваліся на канкрэтныя падручнікі. На гэта маюцца свае прычыны: па-першае, пры перавыданні чытанак вершы часта «пераходзяць» з аднаго класа ў другі; з’яўляюцца на старонках падручнікаў і знікаюць, каб праз пэўны час вярнуцца зноў. Але пры ўсім тым, аналізуючы верш, мы абавязкова прымалі пад увагу ўзрост вучняў.

У невялікім па аб’ёме дапаможніку нельга разгледзець усе вершы, якія паспяхова прайшлі выпрабаванне часам і назаўсёды засталіся гонарам беларускай дзіцячай літаратуры. Усім нам – навукоўцам, метадыстам, настаўнікам пачатковых класаў – трэба прыкласці вялікія намаганні, каб навучыць малодшых школьнікаў як мага глыбей разумець класічныя ўзоры слоўнага мастацтва.

Спадзяёмся, што змешчаныя ў вучэбным дапаможніку канспекты ўрокаў з метадычнымі каментарыямі да іх падштурхнуць будучага настаўніка да педагагічнай творчасці, стануць прадметам для роздуму.

М.І. Сянкевіч

## *Байка Францішка Багушэвіча «Воўк і Авечка»*

Злавіў воўк ягнятка
І панёс жывое!
Плачуць сын і матка,
Як бабры, абое.

На гэтым уроку адбудзецца першая сустрэча малодшых школьнікаў з творчасцю аднаго з пачынальнікаў сучаснай беларускай літаратуры Францішка Багушэвіча, таму вельмі важна, каб яна запомнілася вучням на ўсё жыццё, паспрыяла выхаванню ў іх нацыянальнай свядомасці, гонару за нашу мову і нацыянальную літаратуру.

***Мэты:***

– пазнаёміць вучняў з жыццём і творчасцю беларускага паэта-дэмакрата Францішка Багушэвіча;

– пашырыць веды вучняў пра байку як літаратурны жанр;

– дапамагчы вучням зразумець ідэйна-эстэтычны змест байкі «Воўк і Авечка»;

– выхоўваць пачуццё гонару за беларускую нацыянальную літаратуру.

***Парадак працы***

1. Слова настаўніка пра жыццё і творчасць Францішка Багушэвіча

Настаўнік паказвае вучням партрэт народнага заступніка.

– Перад вамі, дзеці, партрэт вядомага пісьменніка, аднаго з пачынальнікаў беларускай літаратуры Францішка Багушэвіча. Запомніце гэтае імя. Яго павінен ведаць кожны адукаваны беларус. *(Імя і прозвішча запісваюцца на дошцы.)* Заўважце, якімі мудрымі, уважлівымі, крыху стомленымі вачыма глядзіць на нас пісьменнік. Францішак Багушэвіч жыў у вельмі складаны для нашай Радзімы час. *(Запісваюцца гады жыцця паэта: 1840–1900.)* Яго маладосць прыпала на гады паўстання за незалежнасць Беларусі. Багушэвіч актыўна дапамагаў паўстанцам і сам быў паранены ў нагу. Францішак Багушэвіч актыўна выступіў у абарону нашай мовы. Ён пераконваў, што беларуская мова нічым не горшая за нямецкую і французскую, заклікаў любіць і шанаваць яе.

Багушэвіч працаваў адвакатам у судзе, абараняў бедных людзей. Сяляне любілі яго за справядлівасць, за тое, што гаварыў на зразумелай ім беларускай мове.

Першая кніга Францішка Багушэвіча «Дудка беларуская» выйшла ў 1891 годзе за мяжой, у Кракаве. На Радзіму, у Беларусь, на кірмашы і ў крамкі яе дастаўлялі кніганошы. Многія з іх за гэта трапілі ў турму і на-

ват паплаціліся жыццём. А простыя людзі шукалі кніжачкі Багушэвіча, цягнуліся да яго паэзіі.

2. Паведамленне тэмы ўрока, падрыхтоўка да асэнсаванага ўспрымання мастацкага твора

– Сёння мы пазнаёмімся з байкай Францішка Багушэвіча «Воўк і Авечка». Але перш чым пачуць яе, скажыце, калі ласка, што вы ведаеце пра байку? З якіх частак яна складаецца? *(Высвятляецца адметнасць байкі як літаратурнага жанру.)*

– Што вам вядома пра характар ваўка і авечкі. *(Воўк: злосны, бязлітасны, заўжды галодны, у многіх казках («Лёгкі хлеб», «Воўк і ліса» і інш.) – яшчэ і неразумны. Пра авечку кажуць, што яна дурная, упартая, аблудная. Мабыць, па той прычыне, што жывёліна палохаецца свайго ценю, часам без прычыны ўпіраецца, не пазнае свайго двара.)*

3. Чытанне твора настаўнікам

4. Праверка першаснага ўспрымання

– Каму вы спачуваеце ў гэтай байцы?

– Чаму, па якой прычыне?

5. Паўторнае чытанне байкі вучнямі і яе аналіз

**З. М.** У метадычнай літаратуры існуюць два погляды на парадак аналізу твораў гэтага жанру. Традыцыйна аналіз пачынаецца з раскрыцця канкрэтнага зместу байкі. Пасля гэтага высвятляецца алегарычны план і, нарэшце, аналізуецца мараль. Прыхільнікі развіццёвага навучання прапануюць адразу ж пасля чытання (без папярэдняй гутаркі) задаць пытанне класу «Якая асноўная думка байкі?», а пасля – «Якая мараль байкі?». Далей, з іхняга пункту гледжання, трэба працаваць над зместам і мовай твора. Іншымі словамі, аналіз прапануецца весці ад галоўнай думкі да маралі і канкрэтнага зместу. На нашу думку, пры выбары таго ці іншага шляху многае (калі не ўсё) залежыць ад канкрэтнага матэрыялу, ад таго, ці даступны галоўная думка і мараль малодшым вучням ужо пасля першага чытання. Калі гаварыць пра аналіз байкі Францішка Багушэвіча «Воўк і авечка», то можна сказаць другому падыходу катэгарычнае «не», бо, па-першае, мы маем справу з творам, што ўтрымлівае дастаткова вялікую колькасць слоў і выразаў, не характэрных для сучаснай літаратурнай мовы, а па-другое, дзеці не маюць дастатковай практыкі аналізу твораў дадзенага жанру. Таму мы прапануем традыцыйны аналіз байкі з улікам паглыбленай увагі да яе моўных сродкаў.

– Перачытайце байку яшчэ раз і падумайце, на якія дзве няроўныя часткі можна падзяліць твор (мараль пад увагу не бярэцца). *(Байка складаецца з дзвюх частак. Першая з іх уключае ўсяго чатыры радкі. Асноўнае дзеянне адбываецца ў другой частцы.)*

– Падрыхтуйцеся прачытаць першыя чатыры радкі – з’яўленне ваўка.

– Хто такі аканом? *(Аканомы – кіраўнікі гаспадаркі ў панскіх маёнтках.)*

– Аканомы не былі літасцівымі да прыгонных. Акурат ад іх найбольш непрыемнасцей мелі абяздоленыя паншчынай сяляне. Успомніце беларускія народныя казкі.

Мала якая з іх абыходзіцца без панскага служкі. Беларускі народ нямала паздзекаваўся са сваіх крыўдзіцеляў. Згадайце: «Лоб нізкі, нос слізкі – адразу відаць, што лізаў панскія міскі».

– Ці можаце вы сказаць, што такое аўчына? *(Высвятляецца значэнне слова.)*

– Што значыць воўк «у аўчыну перабраўся». *(Ён з'еў ягнятка і пераапрануўся ў авечую шкуру.)*

– А як вы разумееце выраз «ідзе з паклонам»? *(Воўк робіць выгляд, што нічога не здарылася. Ён прыкідваецца добрым, уважлівым, клапатлівым.)*

– Падумайце, як трэба прачытаць словы ваўка? Чаму? *(Воўк гаворыць лісліва, стараецца дагадзіць авечцы, спадабацца ёй.)*

– Падрыхтуйцеся да чытання гэтай часткі байкі ўслых, але спачатку скажыце, ці ўсе словы вам зразумелыя. *(Высвятляецца значэнне слоў, пра якія пытаюць дзеці.)*

– Што значыць «стаў такі дасужы»? За што воўк хваліць авечага сына? Падбярыце блізкія па значэнні словы. *(Цікаўны, настырны, усюды лезе, да ўсяго яму ёсць справа.)*

Удакладняецца таксама значэнне іншых слоў і выразаў: «жыве... без нужы» (без клопату, ні ў чым не мае патрэбы), «пазуры» (кіпцюры), «у хлеў ніхто не гоне» (жыве на свабодзе, нікому не падпарадкоўваецца), «імасць» (форма ветлівага звароту да таго, каго лічаць вышэйшым па становішчы.

– На каго, па словах ваўка, стаў падобны сын авечкі*? (Да самога ваўка.)*

– Правільна вы заўважылі. Воўк лічыць, што клыкі і кіпцюры – гэта і ёсць найлепшыя ўпрыгожанні. Толькі звер з клыкамі і кіпцюрамі варты павагі... Што прапануе «добры» воўк?

– Што для ваўка галоўнае ў жыцці? *(Каб было многа ежы, каб есці без адпачынку.)*

– З якой жа мэтай воўк запрашаў авечку ў госці? *(Ён хацеў з'есці і яе.)*

– Адкуль бачна, што воўк неразумны? *(Авечкі не могуць есці мяса.)*

– Падрыхтуйцеся прачытаць адказ авечкі.

Чытанне гэтага, як і папярэдняга, урыўка добра папярэдзіць лексічнай працай. Увагі заслугоўваюць словы «ягамосці» (форма звароту: пан, васпан), «дабрадзей» (той, хто робіць дабро, аказвае паслугу).

– Ці зразумела авечка воўчыя хітрыкі? *(Так, зразумела. Яна смяецца з ваўка, называе панам, дабрадзеем, а ў канцы – ілгуном.)*

– У якіх словах заключаецца асноўная думка твора? *(Ды скінь шкуру, дабрадзею, бо зубкі ідаць.)*

– Якому чалавеку можна сказаць такія словы? *(Які толькі прыкідваецца, што спачувае, а сам радуецца чужой бядзе, хоча зрабіць яшчэ больш балюча.)*

– Прачытайце мараль і скажыце, аб чым папярэджвае аўтар. *(Пра тое, што падман, няпраўду нельга схаваць. Ілгуна, злога чалавека заўсёды можна распазнаць, хоць ён і прыкідваецца сябрам.)*

– Мне здаецца, гаворачы пра ваўка, Францішак Багушэвіч меў на ўвазе царскіх чыноўнікаў, якія толькі рабілі выгляд, што клапоцяцца пра сялян, а самі даводзілі іх да галечы.

**З. М.** Ужо ў старэйшых класах, звяртаючыся да байкі «Воўк і авечка», настаўнік беларускай літаратуры скажа, што Францішак Багушэвіч выразна бачыў іклы навязанага беларускаму народу царскага рэжыму, прыхаваныя пад наміткай вялікадзяржаўных клопатаў пра лёс сялянства. Абарону сялян ад гэтых іклаў і кіпцюроў Багушэвіч лічыў справай усяго свайго жыцця. Па сведчанні Язэпа Янушкевіча, аднаго з даследчыкаў творчасці Багушэвіча, захаваўся аўтограф паэта на заяве селяніна Крэўскай воласці Міхаіла Вольскага на імя старшыні Віленскага акруговага суда: «Весці справу задарма згодзен».

Францішка Багушэвіча, сялянскага заступніка, не разумела начальства, не разумелі нават родныя дзеці, абвінавачваючы ў «хлапаманстве», а ён заўсёды заставаўся самім сабою.

6. Падрыхтоўка да выразнага чытання байкі

Пасля падрыхтоўкі вучні чытаюць байку па ролях. Можна завучыць дыялогі на памяць і выкарыстаць элементы драматызацыі.

7. Дамашняе заданне

Да наступнага ўрока настаўнік даручае вучням падрыхтаваць кароткія паведамленні пра асабліва яркія эпізоды з жыцця Францішка Багушэвіча паводле кніг Васіля Хомчанкі, Міхася Стральцова ці Уладзіміра Содаля. Матэрыялам, вядома ж, павінен забяспечыць дзяцей настаўнік.

### ***Верш Янкі Купалы «Над калыскай»***

Калыхала маці сына
У калысцы у ліповай
І пяяла яму песню
Вось як тутка, слова ў слова:
– Люлі, люлі, мой міленькі:
Спі і сні вясёлкі-гулі,
Як жа вырасцеш вялікім, –
Не забудзься ты матулі...

Вершаў Янкі Купалы ў чытанках для пачатковых класаў, на жаль, вельмі няшмат, і таму неабходна з асаблівай увагай ставіцца да кожнага ўключанага ў падручнік твора.

***Мэты:***

– пашырыць веды вучняў пра калыханку як жанр вуснай народнай творчасці;

– актывізаваць эмацыянальную памяць вучняў, стварыць атмасферу суперажывання, пачуццёвага водгуку на твор;

– дапамагчы вучням зразумець ідэйна-вобразны змест верша Янкі Купалы «Над калыскай»;

– паказаць ролю параўнанняў, вобразных азначэнняў, гукапісу ў абмалёўцы мастацкага вобраза;

– вучыць пачынаючага чытача бачыць асобу аўтара, разумець аўтарскую пазіцыю.

***Парадак працы***

1. Знаёмства з калыханкай як фальклорным жанрам

Пытанні настаўніка могуць быць наступнымі:

– Чаму калыханку так называюць?

– Якія калыханкі вы ведаеце? Адкуль?

– Хто складаў калыханкі?

– Пра што спяваюць у калыханках?

Абагульняючы адказы вучняў, настаўнік гаворыць, што ў калыханках маці спявалі пра свае трывогі, клопаты, мары. Слухаючы мацярынскія калыханкі, дзіця не толькі супакойвалася, паволі засынала, але і адначасова вучылася роднай мове. Беларусы вельмі цанілі гэтае майстэрства і перадавалі яго з пакалення ў пакаленне. Калі толькі дачка падрастала і пачынала гуляць з самаробнымі лялькамі, маці вучыла яе калыханкам. А дзяўчынкі ў шэсць ці сем гадоў самі калыхалі малодшых або нават найначаліся ў чужыя сем'і.

2. Першаснае ўспрыманне твора

Настаўнік чытае верш на памяць, павольна, задуменна, інтанацыйна выразна.

3. Праверка першаснага ўспрымання

**З. М.** Пасля чытання ніколі не трэба спяшацца з разборам, каб не гасіць пачуццяў і эмоцый дзяцей пытаннямі. Праца душы можа адбывацца і ў поўнай цішыні. Не варта таксама злоўжываць пытаннямі тыпу «Якія пачуцці вы перажылі, слухаючы верш?». Усё не так хутка, не адразу. Не перажытыя, а толькі названыя адчуванні раздвойваюць дзіцячую псіхалогію, прывучаюць вучняў быць няшчырымі. Не выклікае сумнення і другое: усякія ўнутраныя перажыванні заўсёды складанейшыя за іх назвы. Таму недастаткова назваць пачуццё, трэба «прымусіць» дзяцей

задумацца над яго сутнасцю, заўважыць адценні, прасачыць сувязь з іншымі гранямі чалавечага жыцця.

– Якая ж песня ў маці? *(Ласкавая, пяшчотная, шчырая...)*

– Чым калыханка Янкі Купалы падобная да народных калыханак? *(Некалькі разоў паўтараецца «Люлі-люлі, мой міленькі»; як і ў народных калыханках, у ёй многа «ласкавых» слоў: міленькі, матуля, далонькі...)*

– Перачытайце першы радок і скажыце, якія галосныя паўтараюцца часцей за ўсё? Чаму? *(Часцей за ўсё паўтараецца гук а. Гайдаючы калыску, іншы раз маці спяваюць толькі гэты гук: а-а-а-а-ааа.)*

– А цяпер я прачытаю калыханку яшчэ раз, а вы заплюшчце вочы і ўявіце сабе тое, пра што піша аўтар. Хто запомніў словы, можа ціхенька дапамагаць мне.

4. Паўторнае чытанне і аналіз

Пасля паўторнага чытання верша паводле яго зместу робіцца калектыўны слоўны малюнак: сялянская хата; цемрадзь і цішыня за акном; падвешаная да столі сплеценая з ліпавай кары калыска; маці схілілася над дзіцём; няярка гарыць газнічка; з цемры выступаюць лаўкі ўздоўж сцен і абразы ў куце... Пасля гэтага настаўнік задае пытанні, якія дапамагаюць вучням глыбей зразумець вобразны змест твора. Адначасова з гэтым вучні практыкуюцца ў выразным чытанні асобных чатырохрадкоўяў.

– На якія дзве часткі можна падзяліць верш? *(Словы аўтара і калыханка маці.)*

– Прачытайце першую частку і скажыце, ці ўсе словы вы зразумелі.

**З. М.** Думаецца, тут, як і ў іншых падобных выпадках, каб зэканоміць час, не патрэбна спецыяльна спыняць увагу вучняў на неўласцівых сучаснай беларускай мове словаформах тыпу «пяяла», «тутака»... Гэтыя словы вучні зразумеюць без дадатковых каментарыяў.

– Падрыхтуйцеся прачытаць выразна другую страфу.

Каб дапамагчы дзецям выбраць правільную інтанацыю, педагог можа прапанаваць такі гульнёвы прыём: уявіце, што побач спіць, усміхаецца ў сне малое дзіця. Чытайце не шэптам, але так, каб не разбудзіць яго. Настаўнік сочыць таксама за тым, каб вучні правільна вымаўлялі мяккія зычныя (у першым радку суадносіны мяккіх і цвёрдых 9:1). Яны надаюць словам маці асаблівую пяшчоту. Не трэба забываць і пра асіміляцыйную мяккасць (*с’н’і, с’н’і*). Зразумела, што на гэтым уроку (матэрыял падказвае) дзяўчынкі будуць чытаць часцей, чым хлопчыкі.

– Якое ж найпершае жаданне ў маці? Пра што думае яна, схіляючыся над калыскай? Скажыце сваімі словамі. *(Выслухоўваюцца адказы вучняў. Настаўнік патрабуе, каб яны будавалі поўныя сказы.)*

Пасля выразнага чытання трэцяй страфы дзеці падбіраюць сінонімы да слова старонка: Радзіма, родны край, бацькоўскі дом.

Далей чытаецца апошняя страфа. Пасля гэтага настаўнік звяртаецца да класа з пытаннем:

– Які сэнс уклаў паэт у словы:

Як жа вырасцеш вялікім, –
Не забудзься гэтай песні.

Купала гаворыць пра мову і маці. Калі вучні не адразу зразумеюць гэта, можна спытаць:

– На якой мове спявала калыханку маці ў Купалавым вершы? *(На роднай ёй, беларускай, мове.)*

– На вялікі жаль сёння дзеці ўсё радзей чуюць беларускую калыханку і гэты вельмі шкада. Ігнараваць сваё, спрадвечнае – тое ж самае, што смяяцца з маці. Такіх людзей лічаць здраднікамі, іх ніхто не паважае ў свеце. Памятайце пра гэта заўсёды.... Дык што ж сцвярджае Купала вуснамі маці? *(Зракацца роднай мовы нельга.)*

– Вельмі правільна. Калыханка дапамагае немаўляткам запамінаць родныя словы, адчуваць іх прыгажосць... Давайце паставім тры самыя моцныя жаданні маці побач. *(Настаўнік запісвае на дошцы*: *«Не забудзься матулі, старонкі, песні».)*

– Перачытайце калыханку моўчкі. Пра што яшчэ клапоціцца кожная маці? *(Каб сын добра спаў, рос здаровым, прыгожым, «як кветка напрадвесні»...)*

– А цяпер я хачу, каб пра ўсё гэта вы расказалі як запомнілі. *(Выслухоўваюцца звязныя выказванні вучняў.)*

5. Удакладненне галоўнай думкі верша, «пошук аўтара»

– Мы з вамі ўвесь час гаварылі пра маці, хоць добра ведаем, што верш напісаў Янка Купала. Значыць, гэта сам паэт вуснамі маці выказваецца пра тое, якім ён хоча бачыць маленькага беларуса. Ці згодны вы са мной? Атрымліваецца, што «Над калыскай» – Купалаў запавет усім нам: каб стаць вартым чалавекам, трэба шанаваць сваю маці, сваю мову і сваю Радзіму. Паэт сам вельмі клапаціўся пра тое, якімі вырастуць дзеці беларусаў. На лецішчы ў Ляўках кожны працоўны дзень ён пачынаў з наведвання дзіцячага садка. Спачатку размаўляў з дзецьмі і толькі тады ехаў па сваіх справах. Людзі заўважалі, што пасля такіх сустрэч паэт паўдня ўсміхаўся.

6. Практыкаванні ў выразным чытанні і завучванне верша на памяць

Калі на ўроку яшчэ застанецца час, яго можна патраціць на практыкаванні ў выразным чытанні. Не менш як палова вучняў яшчэ ў класе запомніць калыханку Янкі Купалы на памяць. Астатнія зробяць гэта дома.

### *Верш Янкі Купалы «Восень»*

З буйных ліп і бяроз
Лісты валяцца.
Між павалаў і лоз
Рассцілаюцца.
Шапацяць, шалясцяць
Залацістыя.
Увысь галінкі глядзяць
Пусталістыя...

Так, менавіта пятнаццаць слоў (калі не лічыць службовых часцін мовы) мае змешчаны ў падручніку для чацвёртага класа беларускамоўных школ верш народнага паэта. Пятнаццаць слоў, з якіх складзены ажно чатыры вобразныя малюнкі. Як на нашу думку, зразумець гэты купалаўскі верш здолелі б вучні другога, а то і першага класа. Але калі ўжо трапіў ён у чытанку для старэйшых пачаткоўцаў, то варта ўскладніць, наколькі дазваляе ўзрост вучняў, пытанні і заданні пры аналізе.

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець эстэтычны змест верша Янкі Купалы «Восень»;

– дапамагчы вучням усвядоміць, што кожнае ўжытае паэтам слова найлепшым чынам адпавядае дадзенаму кантэксту, з’яўляецца незаменным;

– спрыяць развіццю ўзнаўляльнага і творчага ўяўленняў; вучыць дзяцей бачыць створаныя аўтарам зрокавыя і слыхавыя малюнкі прыроды;

– вучыць дзяцей разуменню выразнасці гукавога ладу мовы (гукапісу);

– развіваць цікавасць да паэзіі, выхоўваць павагу да пісьменніцкай працы.

***Парадак працы***

1. Падрыхтоўка да асэнсаванага ўспрымання мастацкага твора

У пачатку ўрока настаўнік гаворыць пра тое, што Янка Купала вельмі любіў краявіды роднай зямлі, многаму вучыўся ён у прыроды. Асабліва падабаліся паэту вясна і восень.

2. Першаснае ўспрыманне твора; ацэнка першаснага ўспрымання

Гучыць восеньская мелодыя, і на яе фоне настаўнік чытае верш Янкі Купалы. Пасля таго, як чытанне закончана, вучні яшчэ некаторы час слухаюць музыку.

– Пастарайцеся як мага падрабязней перадаць словамі, які малюнак вам уявіўся, – дае заданне настаўнік. *(Выслухоўваюцца звязныя выказванні вучняў.)*

3. Паўторнае чытанне і аналіз

Па заданні настаўніка вучні перачытваюць верш упаўголаса.

– Які перыяд восені апісвае паэт? *(Лістапад, перадзім'е.)*

– Чаму вы так рашылі? Лісты пачынаюць падаць яшчэ ў верасні, кастрычніку. *(Янка Купала піша, што лісты валяцца, што галінкі пусталістыя).*

– Правільна! Малайцы! Калі ўначы дыхнуць першыя маразы, лісты *валяцца.* За адзін-два дні лес скідае свой багаты восеньскі ўбор. А чаму яшчэ паэт ужыў менавіта гэтае слова? *(Ліпы і бярозы б у й н ы я, р а з г а- л і с т ы я, в ы с о к і я.)*

– З вамі нельга не згадзіцца. З маладзенькіх дрэў лісце ўжо абляцела. Іх кроны не былі такімі багатымі. А як падала лісце ранняй восенню, у час бабінага лета? (*Лісце ападала паволі, кружылася ў паветры, яно з л я т а л а з дрэў.)*

– Пабудуйце сказы так, каб носьбітамі дзеяння былі дрэвы. Як кажуць пра дрэвы восенню? (*Дрэвы распраналіся, скідалі лісце, гублялі лісце.)*

– А калі налятаў вецер, што ён рабіў? *(Вецер атрасаў лісце, зрываў лісце.)*

– Калі лісце ўсцілала зямлю, што атрымоўвалася? *(Дыван, коўдра, рознакаляровая посцілка.)*

– Дакажыце словамі верша, што паэт назірае за лістападам у старым лесе. *(Лісты рассцілаюцца між павалаў, старых дрэў, што аджылі свой век.)*

– Перачытайце верш упаўголаса і скажыце, у якіх словах чуецца перашэптванне лістоў. *(Вучні заўважаюць, як з дапамогай гукапісу паэт перадае шамаценне лістоты: ра**ссс**цілаюцца, **шш**апацяць, **шш**алясцяць.)*

– Янка Купала назваў свой верш «Восень». А якую назву маглі б прапанаваць вы? *«Лістапад», «Лістапад у лесе», «У лесе восенню».)*

4. Адпрацоўка выразнасці чытання

Вучні з дапамогай настаўніка выбіраюць тэмп чытання, інтанацыю, вызначаюць лагічны націск (дарэчы, тут ён падае амаль паўсюдна на дзеясловы-выказнікі).

**З. М.** Настаўніку трэба ўважліва сачыць за арфаэпічна правільным вымаўленнем асобных слоў. Як паказвае практыка, найчасцей сустракаюцца наступныя памылкі:

– вучні чытаюць доўгія пяціскладовыя словы па частках;

– не перадаюць падаўжэнне зычных;

– не ўлічваюць асімілятыўную мяккасць свісцячых.

Каб гэтага не здарылася, карысна папярэдне папрактыкавацца ў чытанні цяжкіх слоў на дошцы.

5. Завучванне верша на памяць

Гэты невялікі верш можна завучыць на памяць на гэтым жа ўроку. На гэтым жа, або на наступным уроку настаўнік можа правесці конкурс на

выразнае, правільнае (без адзінай арфаэпічнай памылкі) чытанне верша на памяць.

**З. М.** Паколькі праца над творам нават пры такім падрабязным аналізе зойме толькі першую палову ўрока, на другую яго частку трэба запланаваць разгляд іншага матэрыялу. Гэта можа быць блізкі па тэме класічны верш ці празаічны ўрывак. Тады ў настаўніка з’явіцца магчымасць параўноўваць агульны настрой твораў, а таксама моўныя сродкі, з дапамогай якіх аўтары вырашаюць мастацкую задачу.

6. Дамашняе заданне

У якасці дамашняга задання настаўнік прапануе вучням напісаць кароткае сачыненне пра лістапад. Цікавымі, інтрыгуючымі ўяўляюцца такія назвы: «Пра што мне расказаў апошні бярозавы лісток», «Апошні лісток на маёй далоні» і інш.

### *Верш Янкі Купалы «Мароз»*

Іду я, сняжысты, ўсясільны,
Па сцежках-пуцінах пустых,
І ночкай і днём безупынна
Пільную абшараў сваіх...

***Мэты:***

– дапамагчы дзецям зразумець эстэтычны змест верша Янкі Купалы «Мароз»;

– вучыць дзяцей параўноўваць вобразныя малюнкі ў аднатэмных вершах розных паэтаў;

– фарміраваць уменне вызначаць танальнасць верша, яго агульны настрой;

– спрыяць развіццю ўзнаўляльнага і творчага ўяўленняў пачынаючых чытачоў; вучыць дзяцей бачыць і эмацыянальна адчуваць створаныя аўтарам малюнкі прыроды.

***Парадак працы***

1. Падрыхтоўка да асэнсаванага ўспрымання мастацкага твора

Калі да моманту сустрэчы з гэтым вершам вучні ўжо вывучалі верш Якуба Коласа «Дзед-госць», а таксама ўрывак з паэмы М.А. Някрасава «Мароз, Чырвоны нос», добра ўзнавіць у іх памяці названыя творы, успомніць, якую характарыстыку давалі вучні дзеючым асобам. Мароз у Някрасава строгі, грозны, уладны, багаты, выхвальны. Коласаўскі Мароз – добры, клапатлівы, вясёлы, з хітрынкай. Настаўнік гаворыць, што ў дзяцінстве Якуб Колас і Янка Купала захапляліся творчасцю вялікага рускага паэта, а купалаўскі верш «Мароз», пра які пойдзе гаворка на ўроку, у нечым нават пераклікаецца з вершам М.А. Някрасава.

2. Першаснае ўспрыманне твора

Настаўнік чытае верш на памяць. Падручнікі ў гэты час загорнутыя.

3. Праверка першаснага ўспрымання

– Якія малюнкі зімовай прыроды вы ўявілі, слухаючы гэты верш?

– Якім бачыцца купалаўскі Мароз?

– Пра значэнне якіх слоў вам хочацца запытацца?

4. Паўторнае чытанне; параўнанне вершаў Янкі Купалы, Якуба Коласа і М.А. Някрасава па форме

– Ад імя каго выказваецца паэт? *(Ад імя Мароза.)*

– А ў Якуба Коласа? *(Пра Дзеда Мароза гаворыць аўтар.)*

– А ў Някрасава? *(Някрасаўскі верш складаецца з дзвюх частак. У першай пра Мароза-ваяводу расказвае аўтар, у другой частцы Мароз сам выхваляецца, спявае пра ўласную сілу.)*

– У Янкі Купалы героі часта расказваюць пра сябе, а паэт як бы застаецца ўбаку. Ён пакідае чытача сам-насам са створанымі персанажамі, дае яму магчымасць ацаніць іх паводзіны і ўчынкі. Ці не зможаце вы прывесці прыклады? *(Верш «Над калыскай» напісаны ад імя маці, а вядомы яшчэ з буквара «Хлопчык і лётчык» – зварот сямігадовага героя да таварыша-пілота.)*

5. Падрыхтоўка да выразнага чытання

Перад тым, як пачаць павобразны аналіз, які заўсёды спалучаецца з адпрацоўкай выразнасці, выбіраецца тэмп чытання і інтанацыя. У працэсе гутаркі клас прыходзіць да высновы, што верш чытаецца павольна. Мароз нікуды не спяшаецца, у яго шмат часу. Настаўнік сочыць за тым, каб вучні дакладна перадалі ўладарны тон Мароза.

6. Аналіз мастацкага твора

Асобныя вучні практыкуюцца ў чытанні першай страфы. Клас (настаўнік дапамагае ў гэтым) ацэньвае іх працу.

– Як вы разумееце выраз «Пільную абшараў сваіх»? *(Мароз сочыць за тым, каб усюды быў парадак.)*

– А якія абавязкі былі ў Някрасавага Мароза-ваяводы? Ці помніце? *(«Глядит, хорошо ли метели лесные тропы замели...»)*

Настаўнік спыняе ўвагу вучняў на пачатку першай страфы:

– Як вы думаеце, чаму Купала пераставіў словы месцамі: *іду я*, а не *я іду*? *(Я іду можа сказаць пра сябе кожны чалавек, а Мароз магутны, усясільны.)*

– Малайцы! Вы правільна заўважылі. Можна сказаць нават, што ён не проста ідзе, а *ўладна ступае...* Яшчэ скажыце, чаму Мароз ідзе па *пустых* сцежках-пуцінах? *(Усе лясныя жыхары пахаваліся, разышліся, даючы яму дарогу.)*

– Згодзен з вамі. А з кім параўноўвае аўтар Мароза? *(З уладаром, князем.)*

– У кожнага ўладара, як нам вядома, ёсць свае знакі ўлады і багацця: карона, трон, золата і дарагія камяні, слугі і палацы. Ці ёсць яны ў Купалавага Мароза? Перачытайце яшчэ раз другую і трэцюю страфу і раскажыце пра гэта падрабязна. *(Выслухоўваюцца адказы дзяцей на аснове намаляваных паэтам вобразаў. Апорныя словы можна напісаць на дошцы.)*

– А ці заўважылі вы, што Мароз усё ж трохі хваліцца?

Няхай тут вучні трохі падыскутуюць. На самай справе цяжка ўявіць, як служыць марозу воўк ці мядзведзь. Тым больш што мядзведзь да вясны залёг у бярлог.

– Прачытайце апошнюю страфу і скажыце, што новага вы даведаліся пра Мароза? *(Тут Мароз клапатлівы, уважлівы і зычлівы гаспадар. Ён зусім не страшны.)*

Далей настаўнік просіць яшчэ раз успомніць вершы Якуба Коласа і М.А. Някрасава, каб параўнаць Купалавага Мароза з Дзедам-госцем і Марозам-ваяводам. Нягледзячы на некаторае падабенства персанажаў, вучні ўсё ж выявяць многа адрозненняў.

7. Высвятленне аўтарскай задумы, «пошук аўтара»

Абагульняючы вынікі аналізу, настаўнік задае пытанні, якія дапамагаюць дзецям «убачыць аўтара», зразумець, якія творчыя задачы былі ім пастаўлены.

– Чаму народнаму паэту ўдалося стварыць запамінальны верш пра зіму?

– Для дзяцей ці для дарослых чытачоў напісаны твор?

– Якую мэту ставіў перад сабою паэт перад тым, як скласці яго?

8. Практыкаванні ў адпрацоўцы выразнага чытання ўсяго твора

9. Дамашняе заданне

Падрыхтавацца да выразнага чытання верша Янкі Купалы; па жаданні вывучыць яго на памяць.

### ***Верш Янкі Купалы «Зімой у лесе»***

І лягла ж цішыня
У бары за гарой, –
Каб травінка адна
Хоць кіўнула сабой...

Праца з гэтым невялікім вершам таксама не зойме ўвесь урок, і таму настаўніку трэба падумаць, з якім матэрыялам ён будзе працаваць астатнюю яго частку.

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець эстэтычны змест верша Янкі Купалы «Зімой у лесе»;

– вучыць дзяцей разуменню выразнасці гукавога ладу мовы (гукапісу);

– спрыяць развіццю ўзнаўляльнага і творчага ўяўленняў вучняў; вучыць іх бачыць і эмацыянальна перажываць створаныя аўтарам зрокавыя і слыхавыя малюнкі прыроды;

– выхоўваць цікавасць да паэзіі; заахвочваць вучняў да самастойнай літаратурнай творчасці.

***Парадак працы***

1. Падрыхтоўка да асэнсаванага ўспрымання твора

– Дзеці, многім з вас даводзілася быць у зімовым лесе. Раскажыце, калі ласка, падрабязна, што можна пачуць, калі спыніцца і ўважліва прыслухацца. *(Выслухоўваюцца звязныя выказванні вучняў.)*

2. Самастойнае знаёмства вучняў з вершам Янкі Купалы

– Уважліва, двойчы прачытайце верш Янкі Купалы, падумайце, з якой сілай голасу неабходна чытаць, які тэмп выбраць. *(Выслухоўваючы адказы, настаўнік сочыць за тым, каб у сваіх развsitu разважаннях вучні спасылаліся на тэкст.)*

3. Узорнае чытанне верша настаўнікам на памяць

4. Аналіз мастацкага твора

– Якія радкі ў вершы паўтараюцца? Чаму? *(Аднолькава гучаць першая і апошняя строфы. Янка Купала хоча падкрэсліць, што цішыня незвычайная, казачная.)*

– Паэт гаворыць, што цішыня *лягла*. Як вы думаеце, чаму ён выбраў менавіта гэтае слова? *(Лес спіць, нішто не варушыцца.)*

– Чаму ж у бары, сасновым лесе, пануе цішыня? *(Ён за гарою, тут зацішна, няма ветру.)*

– Правільна, я вельмі рады, што вы такія ўважлівыя. Ніводнае слова паэт не ўжывае проста так, каб было складна. Мне самому асабліва падабаецца радок «у бары за гарой». Доўга думаў, што ў ім незвычайнага, і нарэшце зразумеў: гэты радок напамінае калыханку. «У б*аа*ры з*аа* г*аа*рой». Ці не праўда?.. (Настаўнік запісвае купалаўскія словы на дошцы, падкрэслівае галосную *а,* яшчэ раз перачытвае ўслых.) Глядзіце, нават першы склад, як у калыханкі, без слоў: *баа*ры – *баа*ю... А цяпер скажыце, калі ласка, словы якой часціны мовы ў творы адсутнічаюць зусім? *(У вершы зусім няма прыметнікаў.)*

– Згадзіцеся, нават трохі дзіўна: прыметы прадметаў не названы, але бор нам бачыцца старым, гара – высокай, дрэвінкі – тоненькімі... Настолькі ўдала падабрана паэтам кожнае слова! А якая ў Янкі Купалы цішыня? Выберыце словы, якія перадаюць цішыню апісанага ў творы зімовага лесу найбольш дакладна. (Адкрываюцца загадзя падрыхтаваныя на дошцы азначэнні: глыбокая, незвычайная, мёртвая, непарушная, сонная, дрымучая, глухая, знямелая... Зрэшты, можна абаперціся і на слоўнікавы запас саміх вучняў, калі клас дастаткова падрыхтаваны.)

Дзеці выбіраюць патрэбныя словы, тлумачаць свой выбар. Настаўнік таксама ўдзельнічае ў гэтым працэсе. Адну прапанову ён прымае, іншыя аргументавана адводзіць. Калі праца закончана, педагог яшчэ раз дзякуе дзецям за ўвагу да слова і нечакана пытае:

– А ці можа быць цішыня белаю? *(Выслухоўваюцца адказы вучняў.)*

Настаўнік гаворыць, што пагодлівым зімовым днём пасля снегападу цішыня ў лесе чыстая, белая, як у Янкі Купалы. Белую цішыню можна слухаць не толькі зімою. Летам яе можна пачуць у беластволым бярэзніку, жнівеньскім ранкам – над азёрнай вадою.

– Што часам парушае цішыню? Прачытайце. *(Вучні практыкуюцца ў выразным чытанні другой страфы.)*

– Як працуе чалавек, які прыехаў у дровы? Падмацуйце сваю думку словамі тэксту. *(Чалавек працуе ў ахвоту. Тапор ажно свішча, а піла звініць.)*

5. Практыкаванні ў выразным чытанні верша

Перад чытаннем усяго верша ўдакладняецца, які настрой трэба перадаць, пазначаюцца словы, на якія прыпадае лагічны націск. У працэсе выпрацоўкі навыку выразнага чытання настаўнік сочыць за правільным вымаўленнем зацвярдзелага *р*, а таксама мяккіх свісцячых.

6. Высвятленне аўтарскай задумы, «пошук аўтара»

У заключэнні ўрока педагог пытае, з якой мэтай Янка Купала стварыў гэты верш. Абагульняючы адказы вучняў, кажа, што народны паэт быў захоплены, заваражаны цішынёй і прыгажосцю зімовага лесу і не мог не падзяліцца сваімі ўражаннямі з чытачамі. Ён хацеў, каб яны таксама ўбачылі, як «лягла цішыня ў бары за гарой», каб прыгледзеліся, прыслухаліся да жыцця зімовага лесу і здзівіліся, зрабілі для сябе паэтычнае адкрыццё.

7. Дамашняе заданне

Вывучыць верш Янкі Купалы «Зімой у лесе» на памяць.

Скласці кароткія вусныя апавяданні «Пра што мне расказаў зімовы лес» або «Хто парушае лясны спакой» ці «Чароўны дойлід Зіма».

***Урывак з паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка»***

О, край родны, край прыгожы!
Мілы кут маіх дзядоў!
Што мілей у свеце божым
Гэтых светлых берагоў,
Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,
Дзе бары-лясы гудуць,
Дзе мядамі пахнуць грэчкі,
Нівы гутаркі вядуць...

Вучні чацвёртага класа з дапамогай настаўніка здольныя зразумець і асэнсаваць урывак са знакамітай паэмы народнага паэта. На гэты час малодшыя школьнікі дастаткова добра знаёмы з біяграфіяй паэта, маюць першапачатковае ўяўленне пра творчую манеру яго пісьма, ведаюць на памяць добры дзясятак Коласавых вершаў. Гэта ў некаторай ступені аблегчыць задачу настаўніка на дадзеным уроку.

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець ідэйна-эстэтычны змест урыўка з паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка»;

– практыкаваць пачынаючых чытачоў у вымаўленні пытальна-рытарычных сказаў і сказаў са звароткамі;

– вучыць дзяцей разуменню выразнасці гукавога ладу мовы (гукапісу);

– вучыць дзяцей выказваць свае ўражанні, даказваць правамернасць сваіх поглядаў, абапіраючыся на тэкст твора;

– спрыяць развіццю ўзнаўляльнага і творчага ўяўлення дзяцей, вучыць іх бачыць і эмацыянальна адчуваць створаныя аўтарам вобразныя малюнкі прыроды;

– фарміраваць у пачынаючых чытачоў пачуццё нацыянальнай годнасці, заахвочваць іх да самастойнай літаратурнай творчасці.

***Парадак працы***

1. Уступнае слова настаўніка

– Сёння мы будзем чытаць урывак з паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка». Паэт пачаў працаваць над ёй яшчэ ў астрозе, пасля яшчэ тройчы папраўляў і перапісваў. «Сымон-музыка» – адзін з найбольш вядомых твораў народнага паэта. Цалкам вы пазнаёміцеся з паэмай у старэйшых класах.

2. Чытанне ўрыўка з паэмы настаўнікам на памяць

**З. М.** Уступ да чацвёртай часткі паэмы – узвышаны гімн красе роднай прыроды. Пра «мілы кут сваіх дзядоў» паэт гаворыць з захапленнем, сыноўняй любоўю. Пры гэтым важна, каб настаўнік, а следам за ім і вучні не збіліся на фальшывую патэтыку, бяздумнае дэкламаванне, крыклівасць. Захапляцца можна і моўчкі.

3. Праверка першаснага ўспрымання

– Якія пачуцці ўклаў паэт у пачутыя вамі радкі? *(Пачуццё радасці, гонару за сваю Радзіму, пачуццё захаплення яе прыгажосцю.)*

4. Самастойнае чытанне ўрыўка з паэмы вучнямі

– Для таго, каб лепш уявіць сабе намаляваныя паэтам вобразы, давайце, як заўсёды, не спяшаючыся, прачытаем верш самі сабе.

5. Падрыхтоўка да асэнсаванага чытання ўслых

– Прагледзьце верш яшчэ раз і падумайце, у якім тэмпе трэба яго чытаць. *(Дзеці выказваюць свае прапановы. У працэсе непрацяглай дыскусіі клас*

*пагаджаецца з тым, што верш чытаецца ў звычайным тэмпе. Другая частка – трохі паскорана: захоплены прыгажосцю паэт нібы спяшаецца даць малюнак за малюнкам. У гэтай частцы трэба зрабіць трохі большыя паўзы на месцы кропкі з коскай (два выпадкі), каб аддзяліць групы залежных сказаў сінтаксічнага цэлага.)*

6. Выразнае чытанне і аналіз твора

– Прачытайце, запомніце і скажыце па памяці, з якімі словамі звяртаецца Якуб Колас да роднага краю. *(Вучні практыкуюцца ў чытанні разгорнутага звароткa.)*

– Якімі словамі паэт характарызуе свой край? *(Родны, прыгожы, мілы.)*

– Ці не праўда, цудоўныя словы?! Мілы. Прыгожы. Родны. На першы погляд, яны вельмі простыя, але ў той жа час як выдатна перадаюць пачуццё аўтара! У старэйшых класах вы пазнаёміцеся з іншымі вершамі народнага паэта, што пачынаюцца падобным зваротам.

Настаўнік чытае на памяць: «Вобразы мілыя роднага краю...», «Мой родны кут, як ты мне мілы!..»

– Прагледзьце яшчэ раз верш да канца і скажыце, колькі сказаў у другой частцы? *(Усяго адзін сказ.)*

– Які знак стаіць у канцы? *(Аўтар паставіў пытальнік.)*

– Дык выходзіць, што гэта пытальны сказ і нам неабходна шукаць адказ? *(Не, ён утрымліваецца ў самім пытанні. Для Якуба Коласа няма нічога даражэйшага на свеце за вобразы роднага краю.)*

– Правільна, паэты часта ўжываюць такі прыём. Хто з вас успомніць падобныя пытанні ў вершы Якуба Коласа «Родныя вобразы»? *(«Што маё сэрца да вас парывае? // Чым так прыкаваны я... ?»)*

– Падрыхтуйцеся выразна прачытаць наступныя пасля звароткa шэсць радкоў. *(Чытаюць 2-3 вучні, папярэдне паведаміўшы, якое пачуццё яны хочуць перадаць. Клас ацэньвае працу сваіх сяброў.)*

– Знайдзіце, калі ласка, радкі, дзе паэт захапляецца гукамі роднай зямлі. *(«Дзе бруяцца срэбрам рэчкі; // Дзе бары-лясы гудуць...»)*

– А цяпер заплюшчце вочы і прагаварыце першы радок. Толькі не спяшайцеся: нашы рэкі цякуць павольна, спакойна. *(«Дзе* ***бр****уяцца* ***срэбр****ам* ***р****эчкі...»)*

– Што вам здалося? *(Вада булькоча, пераліваецца праз каменне,ззяе на сонцы.)*

– Якія спалучэнні гукаў дапамаглі пачуць гэта? *(Спалучэнні бр, ср, гук р. Рака нібы злуецца на нешта.)*

– Вельмі правільна вы заўважылі. У нашай роднай мове ёсць выдатнае, вельмі гаваркое слова *бруіцца – цячы, пераліваючыся струменямі пад сонцам.* Вымаўляеш яго – і адразу чуеш і бачыш раку пагодлівым летнім днём. Заплюшчце яшчэ раз вочы і гэтак жа павольна прагаварыце наступны радок. *(«Дзе баааpыы-ляасы гуудуууць».)*

– Што вы пачулі на гэты раз? *(Гудуць старыя сосны.)*

– Адкуль жа ўзяўся гэты гул? *(Адразу пасля зычных ідуць галосныя, якія можна цягнуць. Усе склады цвёрдыя. Таму дрэвы гудуць, а не звіняць.)*

**З. М.** Няма сэнсу ў дадзеным шасцірадкоўі шукаць метафарычна выкарыстаныя словы, тлумачыць іх пераноснае значэнне, бо, працуючы над вершам «Родныя вобразы», вучні ўжо гаварылі і пра «лесу высокага шум-гуд шчаслівы», і пра «гоман спелае нівы».

– Як вы разумееце спалучэнне «гмахаў безгранічных»?

**З. М.** Можа так здарыцца, што спалучэнне слоў «гмахаў безгранічных» давядзецца «перакласці» на сучасную літаратурную мову. *Гмах,* паводле слоўніка, – высотны дом. Калі дзецям будзе цяжка ўнікнуць у сэнс аўтарскіх слоў, настаўнік павінен патлумачыць, што гаворка ідзе пра незлічоную колькасць балот і азёр, «дзе пад гоман хваль крынічных думкі думае простор». Працытаваныя радкі – непаўторны зрокавы вобраз. Пры яго разглядзе ў настаўніка маецца выдатная магчымасць задзейнічаць творчае ўяўленне вучняў. Далёка не кожнае вобразнае паэтычнае назіранне мастака слова (як і ў дадзеным выпадку) можна раскрыць адназначна ці хоць бы з большай ці меншай ступенню дакладнасці. На тое яна і ёсць Вялікая Паэзія. Безумоўна, педагог можа выказаць і сваю думку, пры чым не толькі тады, калі дзіцячае ўяўленне не спрацуе.

– Падзяліце заключную частку верша на вобразныя малюнкі і падрыхтуйцеся прачытаць іх услых. *(Чытаюць тры выкліканыя настаўнікам вучні.)*

Дзе увосень плачуць лозы,
Дзе вясной лугі цвітуць,
Дзе шляхом старым бярозы
Азначаюць гожа пуць.

– Ці бачылі вы, як плачуць лозы ўвосень?

Калі дзеці не здолеюць адразу зразумець метафарычнае значэнне выразу, педагог падводзіць да гэтага паступова. Ён расказвае:

– Усё лета лозы нізка да вады схілялі свае тонкія галінкі з дробным лісцем. Увосень лісце пажоўкла, наляцеў ветрык, і... *(Вербы заплакалі, лісточкі адзін за адным паляцелі на ваду.)*

– Правільна, малайцы. Бачыце, як удала Якуб Колас выбраў патрэбнае слова. Я думаю, мы з вамі маглі б расказаць пра тое, як кружацца гэтыя лісточкі на вадзе, куды паплывуць, што раскажуць прыбярэжным чаратам, але давайце зробім гэта іншым разам. Нам засталося разгледзець яшчэ адзін выдатны малюнак. Давайце толькі папярэдне ўдакладнім, што паэт разумее пад словам *шлях. (Слова ўжыта ў значэнні ‘дарога, гасцінец’.)*

– А як вы разумееце спалучэнне слоў *адзначаюць пуць*? *(Указваюць напрамак.)*

– Раскажыце, калі ласка, што вам бачыцца за словамі «Дзе шляхом старым бярозы адзначаюць гожа пуць». *(Заслухоўваюцца звязныя выказванні вучняў.)*

– А якія яшчэ дрэвы могуць «гожа адзначаць пуць» нашым шляхам, дарогам, гасцінцам? *(Узбоч дарог часта растуць магутныя старыя вербы, стромкія таполі, разгалістыя ліпы.)*

– Малайцы! Калі разам з бацькамі будзеце падарожнічаць па Беларусі, абавязкова паназірайце, як дрэвы ўздоўж дарогі падказваюць, куды ісці. Я думаю, што тады вам абавязкова ўспомняцца выдатныя радкі паэта.

7. Практыкаванні ў выразным чытанні ўсяго ўрыўка

Перад чытаннем прыгадваюцца выпрацаваныя ў пачатку ўрока падыходы.

8. Творчае заданне

– А што калі мы з вамі пастараемся прадоўжыць верш? Вядома, ніхто не можа зраўняцца з паэтам, але ў кожнага з нас ёсць свае запамінальныя вобразы роднага краю.

Каб ажывіць эмацыянальную памяць, творчае ўяўленне сваіх выхаванцаў, настаўнік таксама прымае ўдзел у працы, паказвае ўзор. Магчыма, што з яго дапамогай на дошцы з’явяцца наступныя паэтычныя радкі:

– дзе вясною лясы глухнуць ад птушыных спеваў;

– дзе азёры блакітнымі вачыма глядзяць у неба;

– дзе буслы захінаюць зямлю ад бяды сваімі магутнымі крыламі;

– дзе восенню яркім полымем гарыць рабіна на ўзлеску;

– дзе сланечнікі кожную раніцу падстаўляюць сонцу свае твары;

– дзе аблокі начуюць на вершалінах соснаў;

– дзе баравікі самі просяцца ў кошык да грыбніка.

9. Усведамленне аўтарскай задачы, «пошук аўтара»

– Чаму Якубу Коласу ўдалося скласці выдатны, запамінальны верш, які палюбіўся многім пакаленням вучняў? *(Выслухоўваюцца звязныя выказванні дзяцей.)*

Абагульняючы адказы дзяцей, педагог гаворыць, што такі верш мог напісаць толькі чалавек, улюбёны ў прыроду роднага краю, бо без гэтага светлага пачуцця не можа быць любові да Радзімы. Паэт хацеў перадаць нам, чытачам, сваё захапленне роднымі краявідамі.

10. Заключнае слова настаўніка

– Шчыра дзякую вам за працу на ўроку. Сёння мы з вамі вучыліся назіраць, слухаць, дзяліцца сваімі ўражаннямі. Мы вучыліся цаніць паэтычнае слова, і дапамог у гэтым урывак з паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка».

11. Дамашняе заданне

– Вывучыць урывак з паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка» на памяць.

**З. М.** Урыўкі з класічных паэтычных твораў, што будуць вывучацца ў старэйшых класах, пажадана завучваць на памяць. Пройдзе ўсяго некалькі гадоў, і вучні прачытаюць поўны варыянт паэмы Якуба Коласа. Сустрэча са знаёмымі радкамі стане для іх шчаслівай сустрэчай з сапраўднай Паэзіяй.

## *Верш Якуба Коласа «Родныя вобразы»*

Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я

К вам, мае ўзгорачкі роднага поля,
Рэчкі, курганы, лясы.
Поўныя смутку і жальбы нядолі,
Поўныя сумнай красы?..

Вучні чацвёртага класа з дапамогай настаўніка могуць паўнавартасна ўспрыняць элегію Якуба Коласа. Ім можна прапанаваць поўны варыянт твора, бо, калі адкінуць (як гэта было зроблена раней у «Родным слове» для другога класа) апошнюю страфу

Вобразы мілыя, вобразы смутныя.
Родныя вёскі і люд.
Песні цягучыя, песні пакутныя!..
Бачу і чую вас *тут*,

поўнасцю размываецца аўтарская задума. Настаўніку цяжка прывесці вучняў да разумення падтэксту. Дазволім сабе разгледзець поўны варыянт верша, арыентуючыся на вучняў трэцяга-чацвёртага класаў.

***Мэты:***

– пашырыць звесткі вучняў аб жыцці і творчасці Якуба Коласа; дапамагчы пачынаючым чытачам зразумець ідэйна-эстэтычны змест верша Якуба Коласа «Родныя вобразы»;

– фарміраваць уменне вызначаць танальнасць верша, яго агульны настрой;

– практыкаваць вучняў у чытанні разгорнутых рытарычных пытанняў-метафар;

– дапамагчы вучням зразумець, што кожнае ўжытае паэтам слова найлепшым чынам адпавядае дадзенаму кантэксту;

– вучыць пачынаючых чытачоў «бачыць асобу аўтара», разумець аўтарскую пазіцыю;

– фарміраваць нацыянальную самасвядомасць вучняў, павагу да пісьменніцкай працы, пачуццё гонару за беларускую нацыянальную літаратуру.

***Парадак працы***

1. Падрыхтоўка да асэнсаванага ўспрымання твора

– Якуб Колас пачынаў пісаць у той час, калі само слова *Беларусь* усё яшчэ ўспрымалася варожа, не кажучы ўжо пра беларускую мову, якой паэт асмеліўся размаўляць з людзьмі. Якуб Колас добра бачыў, якія здзекі церпіць беларускі народ ад царскіх чыноўнікаў і не мог з гэтым мірыцца. Ён вучыў сялянскіх дзяцей, дапамагаў іх бацькам адстойваць свае правы. 15 верасня 1908 года за ўдзел у забароненым настаўніцкім з’ездзе малады настаўнік быў прыгавораны да трох гадоў турмы. У Мінскім астрозе ён напісаў верш «Родныя вобразы», які цяпер вядомы кожнаму адукаванаму беларусу. Гэты твор Якуба Коласа быў змешчаны ў першым зборніку вершаў паэта, які выйшаў у 1910 годзе і меў назву «Песні жальбы» *(запісваецца на дошцы).*

2. Слоўнікавая падрыхтоўка

– Жальба... Сёння мы не адзін раз будзем вымаўляць гэтае слова. А як можна сказаць яшчэ? *(Смутак, жаль, горыч, туга, журба.)*

3. Чытанне верша настаўнікам на памяць

4. Аналіз першаснага ўспрымання

– Які агульны настрой гэтага верша? Чаму?

5. Самастойнае чытанне верша вучнямі

6. Аналіз мастацкага твора, падрыхтоўка да асэнсаванага чытання ўслых

Пасля таго, як дзеці перачытаюць верш моўчкі, настаўнік акцэнтуе іх увагу на заключным радку:

– «Песні цягучыя, песні пакутныя! Бачу і чую вас *тут*». *Тут* – гэта дзе? *(У турме, у астрозе.)*

– Але ж за тоўстымі мураванымі сценамі турэмнай камеры, у якую святло прабівалася толькі праз пакрытае кратамі акенца, паэт не мог нічога бачыць і чуць? *(Ён успамінае, уяўляе сабе.)*

– Правільна, словы *бачу* і *чую* Якуб Колас ужыў у пераносным значэнні.

– Што ж бачыць паэт, як толькі прыплюшчыць вочы? *(Перачытваецца другая страфа.)*

– Што чуецца яму ў гэты час? *(Дзеці перачытваюць наступную страфу.)*

– «Узгорачкі роднага поля, рэчкі, курганы, лясы...», «гоман спелае нівы», «ціхая жальба палёў», «шчаслівы шум-гуд лесу», «песня магутных дубоў»... Як усё гэта называе паэт? *(Родныя вобразы.)*

– Правільна, для Якуба Коласа гэта ўсё «вобразы мілыя роднага краю». Доўгімі днямі і начамі зняволены паэт успамінаў, уяўляў родныя яму вобразы. А які ж настрой яны выклікалі ў яго душы? Уважліва прачытайце пачатак твора. *(Смутак і радасць.)*

– Як вы думаеце, чаму вобразы роднага краю будзілі ў душы маладога паэта супрацьлеглыя пачуцці? *(Яму прыемна ўсмамінаць тое, што заўсёды цешыла, радавала, і адначасова шкада, што ўсё гэта далёка, на свабодзе.)*

– Якія яшчэ словы перадаюць супрацьлеглыя пачуцці? *(Ціхая жальба палёў – шчаслівы шум-гуд лесу.)*

– У самым пачатку твора Якуб Колас задае пытанне, на якое вельмі цяжка даць адказ і яму самому, і кожнаму чалавеку: за што мы любім родны край? Падрыхтуйцеся да выразнага чытання першых двух чатырохрадкоўяў.

Пасля самастойнай падрыхтоўкі вучні практыкуюцца ў выразным чытанні. Праводзіцца калектыўная ацэнка якасці чытання, з дапамогай настаўніка карэктуюцца тэмп і інтанацыя.

– Якія словы выкарыстоўвае аўтар, каб перадаць пачуцці свайго героя? *(Нівы – (гамоняць), палі – (жаляцца), лес – (шчасліва гудзе і шуміць), дубы – (спяваюць).)*

– Паспрабуйце памяняць некаторыя словы месцамі, і ў вас нічога не атрымаецца. Напрыклад, магутным дубам жаліцца няма на што. Не могуць яны і гаманіць, бо шамацець, перагаворвацца здольныя толькі каласы. На гэтым прыкладзе мы з вамі можам яшчэ раз пераканацца, што кожнае слова ў мастацкім творы незаменнае... На што ж скардзяцца, ціха жаляцца палі? *(На неўраджай, на засуху.)*

– Магчыма, яшчэ і на тое, што сабранага хлеба селяніну не хопіць да новага ўраджаю, што наступным годам яму не будзе чым засеяць ніву... Якою ж красой надзяляе паэт родныя вобразы? *(Якуб Колас піша: «поўныя сумнай красы»* і *«зззяючы мілай красой».)*

– А якія песні ў беларускага селяніна? *(Яго песні цягучыя і пакутныя.)*

– Чаму? *(Беларускі селянін быў забіты, неадукаваны. Ён многа і цяжка працаваў, а жыў у пастаяннай нястачы.)*

7. Асэнсаванне ідэйна-вобразнага зместу твора, «пошук аўтара»

– Як вы думаеце, ці толькі свой лёс, сваю адзіноту аплаквае паэт у вершы «Родныя вобразы»? (Выслухоўваюцца звязныя выказванні вучняў.)

**З. М.** Можа здарыцца так, што пытанне выкліча цяжкасці, але гэтага не варта баяцца. Паводле сучаснай дыдактыкі, усякія заданні павінны ісці наперадзе развіцця дзіцяці. Пры аналізе мастацкага твора (такі аналіз, як зазначалася раней, вядзецца «ад вучня») педагог заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу сваім выхаванцам, ён не прамінае выпадку ўдакладніць

і «падправіць» выказванне («Ты ж гэта хацеў сказаць?»), падхапіць думку, ад якой можна адштурхнуцца.

Спрактыкаваны чытач без цяжкасці адчуе, што асабістае ў вершы Якуба Коласа «Родныя вобразы» цесна паяднана з сацыяльным, грамадзянскім. Дзецям зразумець гэта не так проста, таму педагогу трэба добра падумаць, як ім дапамагчы.

Абагульняючы выказванні дзяцей, настаўнік гаворыць, што за словамі верша добра бачыцца постаць самога Якуба Коласа – шчырага, глыбока заклапочанага лёсам Бацькаўшчыны паэта, які не можа быць шчаслівым, калі пакутуюць іншыя. Думкі аб лёсе беларускага селяніна-працаўніка не пакідалі Якуба Коласа нават у астрозе.

8. Выпрацоўка навыкаў выразнага чытання ўсяго верша і завучванне яго на памяць

9. Дамашняе заданне

Вывучыць верш Якуба Коласа «Родныя вобразы» на памяць.

### *Верш Якуба Коласа «Адлёт жураўлёў»*

Сцелюцца валокны,
Тчэцца павуціна –
Блізка, блізка восень,
Смутная часіна!..

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець эстэтычны змест верша Якуба Коласа «Адлёт жураўлёў»;

– спрыяць развіццю ўзнаўляльнага і творчага ўяўленняў пачынаючых чытачоў; вучыць іх бачыць і адчуваць створаныя аўтарам вобразныя малюнкі прыроды;

– дапамагчы зразумець, што кожнае ўжытае аўтарам слова найлепшым чынам адпавядае дадзенаму кантэксту, з’яўляецца незаменным;

– вучыць дзяцей параўноўваць вобразныя малюнкі ў вершаваных і празаічных творах;

– развіваць цікавасць да паэзіі, выхоўваць павагу да пісьменніцкай працы, пачуццё гонару за беларускую нацыянальную літаратуру;

***Парадак працы***

1. Падрыхтоўка да асэнсаванага ўспрымання твора

Гутарка на матэрыяле экскурсіі ў асеннюю прыроду з мэтай актывізаваць эмацыянальную памяць вучняў, стварыць атмасферу суперажывання, пачуццёвага водгуку на твор.

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

Настаўнік чытае верш Якуба Коласа павольна, быццам прыслухоўваючыся да цішыні, нібы ўглядаючыся ў малюнкі, створаныя аўтарам, выдзяляючы іх.

3. Высвятленне эмацыянальнага ўздзеяння твора на вучняў

– Якая ж восень у Коласа? *(Невясёлая, сумная.)*

– Чаму паэт убачыў яе такой? *(Яму шкада, што заканчваецца лета, гіне прыгажосць. Наперадзе дажджы і холад, таму і сумна.)*

4. Самастойнае чытанне верша вучнямі

5. Аналіз мастацкага твора, падрыхтоўка да асэнсаванага чытання ўслых

– Удумліва перачытайце першае чатырохрадкоўе напаўголасу, пастарайцеся ўявіць створаныя паэтам малюнкі. *(Даецца час на выкананне задання.)*

– Які дзень апісвае Якуб Колас? *(Пагодлівы дзень, ветру няма, сонечна і ціха.)*

– Чаму вы так вырашылі? *(Аўтар піша, што «павуціна тчэцца», «валокны сцелюцца». Так бывае ў добрае бязветранае надвор'е.)*

– З вамі нельга не згадзіцца. Малайцы! На маю думку, у гэтым вершы Якуб Колас выкарыстаў яшчэ адно слова, якое паказвае на тое, што надвор'е стаіць добрае. Якое ж гэта слова? *(Якуб Колас піша, што неба «бязмежнае», значыць, высокае, блакітнае, чыстае.)*

– Малайцы, а чым жа адметны наступныя чатыры радкі? *(У Коласа асобны радок – як самастойны малюнак.)*

– Ваша праўда. Калі б кожны з нас расказаў, які малюнак ён бачыць, чытаючы Коласавы радкі, то малюнкі аказаліся б вельмі розныя. Чаму так, пагаворым пазней, а цяпер на хвілінку ўявіце: мы на ўроку беларускай мовы. Маюцца чатыры самастойныя сказы, падзеленыя коскамі. Што вы можаце пра іх сказаць? *(Сказы складаюцца ўсяго з двух слоў.)*

– Чаму, як вы лічыце? Якуб Колас выдатна ўмее падабраць да слова патрэбную прымету, у гэтым мы з вамі не раз пераконваліся. А тут прымет няма зусім. *(Выслухоўваюцца звязныя выказванні вучняў.)*

**З. М.** Хоць гэта чацвёрты год навучання, але адказаць на падобнае пытанне настаўніка зможа далёка не кожны вучань. Галоўнае, каб дзеці шукалі адказ, у ходзе дыскусіі маглі хоць у нейкай меры наблізіцца да разумення аўтарскай мастацкай задумы. І нават калі адказам стане цішыня – вялікай бяды не бачыцца, бо ў класе ёсць настаўнік, які можа прапанаваць для абмеркавання свой пункт гледжання. На нашу думку, ствараючы простыя сваёй геніяльнасцю радкі

Замірае лета,
Заціхаюць далі,
Сірацее рэчка,
Халадзеюць хвалі,

Якуб Колас наўмысна не абцяжарвае вобразы-метафары, каб даць прастор творчай фантазіі чытача. Ужытыя паэтам дзеясловы нясуць надзвычай моцную эмацыянальна-вобразную нагрузку яшчэ і з-за таго, што стаяць менавіта ў пачатку неразвітага сказа.

– Што значыць «асірацець»? Як вы разумееце гэтае слова? *(Асірацець – значыць застацца без некага блізкага, роднага, таго, хто пра цябе вельмі клапоціцца.)*

– Чаму ж сірацее рэчка? (*Найбольш характэрныя выказванні вучняў:*

*– Дзеці не ходзяць больш на рэчку купацца. Вада стала халоднай.*

*– На беразе рэчкі ўсё менш рыбакоў. Рыба адыходзіць далей, на глыбіню. У сонечны дзень не бачна, як гуляюць на сонцы малькі, як плешча па вадзе вялікая рыба.*

*– Прапалі ластаўкі-берагавушкі. У іх выраслі дзеці, і птушыныя сем'і паляцелі ў вырай. Засталіся толькі домікі-норкі. Яны асірацелі таксама.*

*– Птушкі, якія жылі ў прыбярэжных кустах, таксама зніклі.*

*– Не лятаюць над вадою рознакаляровыя стракозы.*

*– Рачныя чайкі не кідаюцца па здабычу.*

*– Нават травы, што растуць каля берага – асака і чарот, шумяць не па-летняму.*

*– Мяняецца колер вады. Яна робіцца шэрай, зеленаватай.)*

**З. М.** Як можна заўважыць, усяго адно слова-метафара выклікала вялікую колькасць асацыяцый, прымусіла працаваць памяць і ўяўленне. Рэчка жыла сваім насычаным жыццём, і цяпер яна не можа не адчуваць адзіноту, бо кожны дзень трэба з некім ці з нечым развітвацца, каб урэшце рэшт зусім сцішыцца пад ледзяным панцырам. У час, пра які ідзе размова, і рэчка, і лес, і сам паэт развітваюцца з жураўлямі, а развітвацца заўсёды сумна. Таму і настрой верша такі невясёлы.

Наўрад ці варта настолькі падрабязна спыняцца на кожным вобразе-метафары. Урэшце ўсе яны: і той, на якім мы спыніліся, і суседнія два («заціхаюць далі», «халадзеюць хвалі») – блізкія. Намаляваныя Якубам Коласам вобразы ўзаемадапаўняюць адзін аднаго і ствараюць цэласны паэтычны вобраз – «замірае лета».

– Перачытайце наступную страфу. Паэт піша, што жураўлі «мкнуцца над лясочкам». Ці не лепш было б сказаць «спяшаюцца», «ляцяць»? *(«Ляцяць» – недакладна. «Спяшаюцца» – таксама дрэнна: зіма яшчэ не зусім блізка, і жураўлі не спяшаюцца.)*

– Перачытайце, калі ласка, чацвёртую страфу. Ці толькі сум, шкадаванне ў радках паэта? *(Не толькі. Тут яшчэ і замілаванне, пяшчота.)*

– Якія словы перадаюць названыя вамі пачуцці? *(Жураўлі ляцяць «роўненькім шнурочкам». У вырай яны імкнуцца «над лясочкам», а не над лесам.)*

– Мне здаецца, што ў паэта замілаванасць і сум зліліся ў адзінае шчымлівае пачуццё, назавём яго светлым сумам.

– Падрыхтуйцеся прачытаць услых наступныя чатыры радкі. Але перад тым назавіце, калі ласка, у кожным радку дзеясловы. *(Запісваюцца на дошцы.)*

– Што вы заўважылі? *(Дзеясловы размешчаны па меры паслаблення сілы дзеяння: «меншыцца», «тае», «ледзь-ледзь цямнее», «прападае».)*

– Пастарайцеся перадаць голасам, як губляецца за даляглядам жураўліны шнурочак. *(Вучні практыкуюцца ў выразным чытанні.)*

– Уважліва прачытайце апошнія радкі верша і адкажыце, што, на вашу думку, страціў паэт. *(Выслухоўваюцца разважанні вучняў.)*

– Нам, чытачам, вельмі цяжка адказаць на гэтае няпростае пытанне. Страчана нешта дарагое, блізкае. Прыйдуць іншыя восень і лета. Магчыма нават, што яны будуць лепшымі. Але гэтыя, што прайшлі, не вернуцца ніколі. Многае яны забіраюць з сабою, пакідаючы адно ўспаміны.

6. Асэнсаванне вобразнага зместу твора, «пошук аўтара»

Для таго, каб дзеці глыбей усвядомілі аўтарскую задуму, настаўнік прапаноўвае адказаць на наступныя пытанні:

– З якой мэтай Якуб Колас напісаў верш «Адлёт жураўлёў»?

– Чаму паэту ўдалося стварыць запамінальны верш, вядомы кожнаму адукаванаму беларусу?

Абагульняючы адказы вучняў, настаўнік гаворыць аб паэтычным майстэрстве Якуба Коласа, які некалькімі ўдала знойдзенымі словамі здолеў стварыць маляўнічы, запамінальны вобраз. Усё гэта магчыма толькі таму, што паэту бясконца дарагая зямля роднага краю.

7. Параўнанне вобразных малюнкаў у вершаваных і празаічных творах

**З. М.** Аднатэмныя празаічныя і вершаваныя творы вельмі карысна параўноўваць. Цікава заўважыць: «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Якуба Коласа пабудавана такім чынам, што ў ім суседнічаюць аднайменныя вершы і апавяданні. Як зазначаў сам пісьменнік, вершы паэтызуюць расказанае ў прозе, а проза канкрэтызуе напісанае ў вершах.

Параўнанне вершаваных і празаічных твораў не толькі дапамагае засвоіць элементарныя веды па тэорыі літаратуры, але і дае першапачатковыя ўяўленні аб мастацкай манеры пісьменніка, дапамагае больш глыбока-му разуменню вобразаў, намаляваных у прозе і ў вершах. Метадычна апраўдана нават у вонкава падобных мастацкіх карцінах шукаць адметнасці, не затрымліваючыся на аналогіі. Падобную працу можна праводзіць параўноўваючы таксама творы розных аўтараў.

Вучні вяртаюцца да апавядання Якуба Коласа «Асеннія ясныя дні» (вывучалася годам раней), перачытваюць яго. Суадносяцца празаічныя і вершаваныя ўрыўкі:

Сцелюцца валокны,
Тчэцца павуціна… (Якуб Колас. Адлёт жураўлёў).

«Плаўна носіцца ў паветры белая павуціна, сцелецца па зямлі, чапляючыся за кусты і сухую траву» (Якуб Колас. Асеннія ясныя дні).

У бязмежным небе
Роўненькім шнурочкам
Жураўлі на вырай
Мкнуцца над лясочкам.

Меншыцца шнурочак,
У паднеб'і тае,
Вось ледзь-ледзь чарнее,
Міг – і прападае (Яуб Колас. Адлёт жураўлёў).

«Ключом пранясуцца жураўлі і схаваюцца ў сініх хвалях далёкага яснага неба. Крык іх заціхае памалу і замрэ, расплывецца ў цішыні асенняга дня» (Якуб Колас. Асеннія ясныя дні).

– Параўнайце палёт жураўлёў. У чым адметнасць празаічнага ўрыўка? *(Па-першае, жураўлі ляцяць «ключом», па-другое, яны «пранясуцца».)*

– Чаму аўтар выкарыстаў у апавяданні менавіта гэтае слова? *(У вершы Якуб Колас піша: «Блізка-блізка восень». Значыць, пакуль яшчэ лета. Апавяданне ж пачынаецца словамі: «Сярод гнілой восені выдаюцца часам ясныя, светлыя дні». У апавяданні, такім чынам, апісваецца сярэдзіна восені. Жураўлі спяшаюцца ў вырай.)*

– У вершы жураўлі «мкнуцца» ў вырай у «бязмежным небе». А ў празаічным урыўку? *(Жураўлі «схаваюцца ў сініх хвалях далёкага яснага неба».)*

– Бачыце, празаічнае апісанне неба выразнае, яно нібы раскрывае змест вершаванага. Якія адрозненні вы яшчэ заўважылі? *(Жураўлі ў вершы ляцяць моўчкі, у той час як у апавяданні гаворыцца пра жураўліны крык.)*

– Вы вельмі ўважлівыя. «Замірае лета, заціхаюць далі…» Нават жураўлі сваім развітальным крыкам асцерагаюцца парушыць гэтую сумную цішыню. Жураўлі, піша Якуб Колас, «пранясуцца і схаваюцца». Але ў апавяданні ёсць словы, якія, калі можна так сказаць, «запавольваюць» палёт. Назавіце гэтыя словы. *(«Крык іх заціхае памалу і замрэ, расплывецца ў цішыні асенняга дня».)*

Мы з вамі заўважылі: і ў вершы, і ў апавяданні вобразы дастаткова блізкія. Але добра запомніце: вершаваны твор ніколі нельга пераказаць прозаю.

8. Дамашняе заданне

Вывучыць верш на памяць. Скласці вусныя апавяданні на тэму «Як мы праводзілі птушак» ці «Як буслы развітваліся са сваімі гнёздамі» або «Аб чым крычалі журавы».

## ***Верш Якуба Коласа «Жытні колас»***

На саломцы тонкай
У траве густой
Спее адзінокі
Колас сіратой.

Нялёгка бывае іншы раз адчуць мастацкую глыбіню твораў, у якіх, можа скласціся ўражанне, усё ляжыць на паверхні. «Простым» у асобных сваіх творах здаецца і Якуб Колас. Але як карпатліва і ўважліва трэба чытаць і перачытваць яго вершы, каб узняцца да ўзроўню суперажывання, сутворчасці, да ўсведамлення эстэтычнай задумы аўтара!

Пры павярхоўным прачытанні верш Якуба Коласа «Жытні колас» нічым не здзіўляе: у густой траве спее адзінокі сірата-каласок, але такое толькі на першы погляд...

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець ідэйна-эстэтычны змест верша Якуба Коласа «Жытні колас»;

– фарміраваць уменне вызначаць танальнасць верша, яго агульны настрой;

– вучыць дзяцей выказваць свае ўражанні, даказваць правамернасць сваіх поглядаў, абапіраючыся на тэкст твора; развіваць маўленчую практыку вучняў;

– вучыць пачынаючых чытачоў «бачыць асобу аўтара», разумець аўтарскую пазіцыю;

– выхоўваць пачуццё любові да свайго краю, яго прыроды, да родных і блізкіх людзей.

***Парадак працы***

1. Паведамленне тэмы ўрока; падрыхтоўка да асэнсаванага ўспрымання твора

На ўрок настаўнік прыносіць жменю буйных каласоў. Іх сцяблíны згінаюцца пад цяжарам зерня.

– Як вы думаеце, – пытае настаўнік, – дзе выраслі гэтыя каласы? *(У полі; на школьнай вопытнай дзялянцы.)*

– Сёння мы пазнаёмімся з вершам народнага паэта Беларусі Якуба Коласа «Жытні колас». Успомніце, калі ласка, сапраўднае прозвішча паэта. *(Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч.)*

– Правільна, Колас – гэта псеўданім. Бачыце, якое цікавае супадзенне назвы твора і псеўданіма аўтара... Паслухайце верш і скажыце, ці пра такі колас (настаўнік зноў бярэ ў рукі каласы) піша паэт.

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

3. Аналіз першаснага ўспрымання

Пасля кароткай паўзы вучні адказваюць на пастаўленае пытанне, аргументуючы свае адказы.

4. Паўторнае чытанне твора

– Якія пачуцці трэба перадаць пры чытанні? *(Верш сумны. Аўтару шкада каласка.)*

– Якія словы гэта пацвярджаюць? *(«Адзінокі», «сірата», «ные», «плача».)*

5. Аналіз верша

Верш чытаецца ланцужком, вызначаюцца ключавыя словы. У першым чатырохрадкоўі лагічны націск падае кожны раз на канец радка: «тонкай», «густой», «адзінокі». Наступныя дванаццаць радкоў – здагадкі, меркаванні, адкуль ён мог з’явіцца тут, у густой траве. Увага вучняў засяроджваецца на асобных выразах : «птушка божжа», «неба яго знае» (ніхто не ведае, адзін толькі Бог).

– Як адчувае сябе колас? Чаму сонца і вецер не сябры яму на чужой старане? *(Каласок вельмі адзінокі, таму яго сушыць сонца і хіліць долу нават слабы вецярок. Калі б каласоў было многа, яны нічога не баяліся б.)*

– Чаму ж, як гаворыць паэт, «ные сірацінка, плача каласок»?

Вучні чытаюць дзве перадапошнія страфы, у якіх паэт дае адказ на гэтае пытанне. Настаўнік сочыць за тым, каб яны выдзялялі голасам ключавыя словы і словазлучэнні: «дарэмна», «роднае душы», «птушкі падзяўбуць», «ветрыкі паб’юць».

– Што значыць «дарэмна»? Як вы разумееце гэтае слова? *(Не народзяцца новыя каласы. На радзіме ніхто не даведаецца пра тое, як рос, што бачыў колас.)*

– Перачытайце яшчэ раз тэкст і пастарайцеся апісаць, якім вы бачыце жытні каласок. Асаблівую ўвагу звярніце на апошнюю страфу. *(Ён кволы, на тонкай белай саломцы.)*

– Чаму на тонкай? *(Перашкаджае расці густая трава.)*

– Чаму аўтар піша, што каласок плача, «падняўшы ўгору стромкі валасок»? Няўжо ён такі ганарысты? *(Зусім не. Яго зярняткі кволыя, не налітыя, таму каласок лёгкі і саломіна не згінаецца.)*

– Уявіце, што жытні каласок умее гаварыць. У якія словы вылілася б яго крыўда? *(Выслухоўваюцца меркаванні вучняў.)*

– Падумайце, ці толькі сум перадае паэт? *(Не толькі сум, але і пяшчоту, шкадаванне. Якуб Колас ужывае словы «саломка», «сірацінка», «зярняткі».)*

– У гэтым вершы, як і ў іншых вершах паэта, пяшчота і сум зліліся і атрымалася асабліва шчымлівае пачуццё.

– У якіх творах мы з вамі часцей за ўсё сустракаем словы «сірацінка», «зярнятка», «дожджык»? *(У беларускіх народных песнях.)*

– Прачытаце верш напаўголасу, прыслухайцеся да яго гучання. Што вы заўважылі? *(Гэты верш можна спяваць. Ён напеўны.)*

– Што яшчэ збліжае верш Якуба Коласа з народнай песняй? *(У ім, як і ў песні, паўтараюцца асобныя радкі.)*

***З. М.*** Настаўнік можа дапамагчы вучням заўважыць адметнасць рыфмавання: у кожнай страфе рыфмуюцца толькі другі і чацвёрты радкі. Гэта таксама адна з адметнасцяў фальклорных твораў. Верш Коласа – своеасаблівая песня-жальба, песня-скарга.

6. Асэнсаванне аўтарскай задумы, «пошук аўтара»

Настаўнік дапамагае вучням заўважыць, што, акрамя прамога сэнсу, верш Якуба Коласа мае і другі, пераносна-метафарычны план, абумоўлены сімвалічнай семантыкай слоў.

– Падумайце і адкажыце на вельмі няпростае пытанне: ці толькі аб коласе журыцца паэт? *(Выслухоўваюцца звязныя выказванні вучняў.)*

Абагульняючы адказы дзяцей, настаўнік падводзіць сваіх выхаванцаў да думкі, што гэта верш пра чалавека на чужыне, які знаходзіцца далёка ад сям'і і сяброў («нідзе не згледзіш роднае душы»). Педагог расказвае дзецям, што і сам народны паэт часта не па ўласнай волі быў адарваны ад радзімы (сядзеў у астрозе, удзельнічаў у імперыялістычнай вайне). Выходзіць, што ён пісаў у тым ліку і пра сябе. Без Радзімы, у адзіноце, чалавек падобны да адзінокага каласка. Ён загіне. Пра яго ўсе забудуць.

– У які раздзел нашага падручніка (верш знаходзіцца ў «восеньскім» раздзеле чытанкі для чацвёртага класа рускамоўных школ «Чабарок») можна было б змясціць гэты твор? *(У першы раздзел «Радзіма мая дарагая...».)*

7. Практыкаванні ў выразным чытанні верша

8. Дамашняе заданне

Падрыхтавацца да выразнага чытання твора. (Тыя, хто пажадае, могуць вывучыць верш на памяць.) Падумаць, чаму аўтар піша менавіта пра жытні колас, а не пшанічны ці які іншы.

## ***Верш Якуба Коласа «Зіма»***

Надышлі марозы,
Рэчкі закавалі,
Белыя бярозы
Шэранем убралі.

Восем радкоў гэтага верша, што на працягу доўгага часу змяшчаліся ў беларускамоўных букварах пад партрэтам народнага пісьменніка, не адно пакаленне першакласнікаў прымусілі глянуць на свет іншымі вачыма, на ўсё жыццё палюбіць паэзію Якуба Коласа, адчуць велічнасць і недасягальнасць лепшых яе ўзораў. Да цяперашняга часу не перастае здзіўляць тое, што для перадачыназірання, настрою, для стварэння запамінальнага малюнка (як у гэтым вершы) паэту дастаткова ўсяго некалькіх слоў. І вось ужо мы, чытачы, не толькі бачым, але і адчуваем усёй істотай хараство зімовай прыроды, блізкае і дарагое для ўражлівай чалавечай душы.

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець эстэтычны змест верша Якуба Коласа «Зіма»;

– спрыяць развіццю ўзнаўляльнага і творчага ўяўленняў, вучыць дзяцей бачыць і эмацыянальна ўспрымаць створаныя аўтарам вобразныя малюнкі прыроды;

– вучыць дзяцей параўноўваць вобразныя малюнкі ў празаічных і вершаваных творах.

***Парадак працы***

1. Падрыхтоўка да асэнсаванага ўспрымання твора

Падрыхтоўку да ўспрымання верша добра правесці на матэрыяле экскурсіі, асабліва калі яна адбылася незадоўга пасля снегападу і дзеці яшчэ знаходзяцца пад уражаннем ад убачанага. Педагог ставіць задачу ўзнавіць у свядомасці вучняў канкрэтныя карціны зімовай прыроды, каб лягчэй наладзіць асацыятыўныя сувязі з вершаванымі вобразамі, стварыць атмасферу суперажывання, эмацыянальнага водгуку на твор. Ён просіць апісаць, якое было надвор’е, успомніць, што бачылі, калі падыходзілі да поля, да лесу, як выглядалі пад снегам елкі, маладыя бярозкі, як сустрэла рака. Можна пазначыць апорныя словы: *поле, дарога ў лес, дрэвы ў лесе, рэчка*. Вучні расказваюць, настаўнік, дзе трэба, дапамагае ім, папраўляе, удакладняе асобныя дэталі: які колер снегу ў лесе і ў полі; на што падобны гурбы снегу ля дарогі; што напамінаюць занесеныя снегам кусты.

**З. М.** Педагог таксама можа расказаць пра ўласныя дзіцячыя ўражанні ад наступлення зімы, пра першую сустрэчу з вершам Якуба Коласа. Не толькі змест гутаркі, але і тон, настрой, які суправаджае яе, выразны жэст павінны паказаць дзецям, што настаўнік сам вельмі любіць гэты верш і заўсёды рады новай сустрэчы з ім.

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

Настаўнік выразна чытае верш на памяць, нібы прыслухоўваючыся да цішыні, зімовага спакою. Дзеці слухаюць, не заглядаючы ў падручнікі.

3. Высвятленне эмацыянальнага ўздзеяння верша

– Якія пачуцці выказаў паэт, апісваючы зіму?

– Які малюнак найбольш запомніўся?

4. Самастойнае чытанне верша вучнямі; падрыхтоўка да асэнсаванага чытання ўслых

Вучні, не спяшаючыся, перачытваюць верш, думаюць над тым, які тэмп трэба выбраць, якое пачуццё данесці да слухача. Выслухаўшы адказы дзяцей, настаўнік робіць падагульненне: чытаць трэба не вельмі гучна, бо ў вершы ўсё нібыта застыла ў зімовым сне. Зіма ў Якуба Коласа ціхая, спакойная, прыгожая. Неабходна перадаць замілаванне, зачараванасць зімовымі краявідамі.

5. Аналіз верша

**З. М.** Верш можна чытаць ланцужком па асобных малюнках, з якіх складаецца цэласны вобраз зімы, але пажаданей усё ж не драбіць страфу, бо пры чытанні па два радкі няма цэласнай інтанацыі, цяжка вызначыць ключавыя словы, нарэшце, губляе сваё значэнне рыфма.

– З чым параўноўвае паэт снежнае покрыва? *(З мяккаю пярынай, белай плянёнкай.)*

– Як вы разумееце выраз «рэчка анямела»? *(Пакрылася лёдам; яе засыпала снегам; не відаць берагоў.)*

– Якія яшчэ словы дапамагаюць адчуць нерухомасць, спакой? *(«...Рэчкі закавалі», «стаіць журботна», «амярцвелі лозы».)*

Настаўнік яшчэ раз звяртае ўвагу на паэтычнае майстэрства Якуба Коласа, падрабязна спыніўшыся на найбольш маляўнічай карціне – зімовы лес пад цяжарам снегу.

– Параўнайце выраз «Галінкі дрэў згінаюцца ад снегу» і паэтычны тэкст:

Лес, як дзед убогі
З доўгімі вусамі,
Апусціў галіны
І стаіць журботна...

Які з гэтых выразаў лепш перадае карціну зімовага лесу і чаму? *(Выслухоўваюцца звязныя выказванні вучняў.)*

– Дакажыце словамі верша, што паэт піша пра сонечны зімовы дзень. *(«Мяккая пярына // Вочы адбірае».)*

– Што значыць «вочы адбірае»? Калі так гавораць? *(Снег бліщчыць, іскрыцца, ззяе. Калі на яго глядзіш, робіцца балюча вачам, выступаюць слёзы.)*

– Перачытайце апошнія радкі. Чаму марозы і вятры «гуляюць у палях»? *(Ім тут вольна, ніхто не перашкаджае. Снежнае покрыва параўняла раўніны і ўзгоркі.)*

6. Асэнсаванне аўтарскай задумы, «пошук аўтара»

Настаўнік просіць падумаць і сказаць, з якой мэтай Якуб Колас напісаў верш «Зіма». Выслухаўшы дзіцячыя адказы, педагог гаворыць пра тое, што сапраўды верш не толькі раскрывае пачуцці паэта, але і дапамагае кожнаму з нас угледзецца ў свет вакол сябе, вучыць быць назіральным і чуйным да прыгажосці роднай прыроды.

7. Практыкаванні ў выразным чытанні верша; завучванне твора на памяць.

Як паказвае школьная практыка, пры чытанні верша Якуба Коласа «Зіма» дзеці часта робяць аднолькавыя па працягласці паўзы ў канцы кожнага радка. Каб папярэдзіць гэтую памылку, настаўнік павінен надаць належную ўвагу расстаноўцы паўз, вызначэнню іх працягласці, пошуку слоў і словазлучэнняў, на якія падае лагічны націск.

**З. М.** Настаўнік павінен памятаць пра тое, што зусім не абавязкова пераносіць работу па выпрацоўцы гэтага навыку на апошні этап урока. Практыкаванні ў выразным чытанні ідуць паралельна з аналізам эстэтычнага зместу твора.

8. Дамашняе заданне

Вывучыць верш на памяць, падрыхтавацца да конкурсу чытальнікаў.

## *Верш Якуба Коласа «Дзед-госць»*

Ходзіць дзед белабароды
Полем, лесам, пералескам,
Засцілае рэчкі лёдам,
Брыльянцістым снежным блескам.

Сярод запамінальных вершаў, якія суправаджаюць нас ад першых гадоў школьнага навучання, вылучаецца сваёй вобразнай выразнасцю, прыгажосцю, нейкім асаблівым даверам да чытача верш Якуба Коласа «Дзед-госць». Цяжка ўявіць, колькі разоў чытаўся ён Дзеду Марозу і Снягурцы на дзіцячых ранішніках у садках і школах! Бясспрэчна, што названы верш трэба вывучаць цалкам, як гэта было прапанавана ў падручніках ранейшых гадоў выдання, бо інакш вучням цяжка будзе зразумець нават яго назву.

***Мэты:***

– дапамагчы дзецям зразумець вобразна эстэтычны змест верша Якуба Коласа «Дзед-госць»;

– фарміраваць уменне вызначаць танальнасць верша, яго агульны настрой;

– спрыяць развіццю ўзнаўляльнага і творчага ўяўлення дзяцей,

вучыць іх бачыць і эмацыянальна адчуваць вобразныя малюнкі, стварыць атмасферу пачуццёвага водгуку на твор;

– выхоўваць пачуццё павагі да творчасці беларускіх пісьменнікаў-класікаў.

***Парадак працы***

1. Уступная гутарка

– Якія вершы Якуба Коласа пра зіму вам запомніліся?

– Якія з іх можаце прачытаць на памяць?

– Чам прываблiваюць вершы паэта?

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

3. Праверка першаснага ўспрымання

– Пра якога белабародага дзеда гаворыцца ў вершы?

4. Самастойнае чытанне верша вучнямі, падрыхтоўка да асэнсаванага чытання ўслых

– Прагледзьце верш моўчкі і падумайце, у якім тэмпе трэба яго чытаць, якія пачуцці неабходна пастарацца перадаць. *(Высвятляецца, што першыя чатыры страфы патрабуюць няспешнага чытання. На гэта ўказваюць дзеясловы «ходзіць», «засцілае». Запаволенасць, размеранасць перадаецца таксама аднароднымі членамі сказа. Белабароды дзед ходзіць «полем, лесам, пералескам», воўнаю-кажухам ён крые «руні, травы, лозы».)*

5. Аналіз вобразнага зместу мастацкага твора, практыкаванні ў выразным чытанні

– Якім вы ўяўляеце сабе дзеда-госця? *(Калі вучні адчуюць цяжкасць у падборы слоў-характарыстык, настаўнік прыходзіць ім на дапамогу. На дошцы з’яўляюцца словы-падказкі: «усемагутны», «грозны», «вясёлы», «добры», «дбайны», «клапатлівы»...)*

– Чаму вы так думаеце? *(Мароз нікога не марозіць. Ён, піша аўтар, «туліць дрэвы лёгкім пухам». Так дарослыя ўхутваюць дзяцей, каб тым не было холадна зімою на вуліцы. Воўнаю-кажухам мароз пакрывае палі, траву, дрэвы і кусты, ратуе іх ад сцюжы. Белабароды дзед ходзіць усюды, нібы той клапатлівы, дбайны гаспадар. Ён хвалюецца, каб зямлі не было холадна.)*

– А што абазначае выраз «Усюды носяць ногі»? Калі і пра каго так кажуць? *(Дзед Мароз – вялікі працаўнік. Ён увесь час у дарозе, ніколі не адпачывае. Белабародага дзеда чакае шмат працы. Нават да дзяцей ён прыйдзе на хвілінку.)*

– Малайцы! Вы добра адчуваеце паэтычнае слова. Да Коласавага Мароза мы з вамі яшчэ неаднойчы будзем звяртацца, вывучаючы творы іншых паэтаў.

– Заўважце, якое адзенне дорыць зямлі і дрэвам гэты незвычайны дзед. *(Белае, іскрыстае, брыльянцістае, прыгожае.)*

– А яшчэ? *(Лёгкае, але цёплае. Якуб Колас піша: «Туліць дрэвы лёгкім пухам». Воўна, як і пух, лёгкая і цёплая.)*

– Падбярыце сінонімы да слова «іней». *(Намаразь, шэрань.)*

– Заўважце, наколькі «гаваркое» слова «шэрань». Здаецца, бачыш дрэвы пад яе срэбным покрывам.

– Хто з вас паспрабуе расказаць, як выглядае казачны дзед? *(Дзед Мароз у доўгім кажусе. У яго прыгожая белая барада, сівыя бровы і чырвоныя шчокі. На нагах у дзеда – валёнкі, а ў руках – чароўны посах.)*

– Пастарайцеся прачытаць так, каб усе мы ўбачылі чараўніка Дзеда Мароза. Вось ён прыпыніўся, набраў у прыгаршчы інею, сыпануў раз і другі – бярозкі заіскрыліся, звёў Дзед Мароз рукі перад сабою – лёгкім пухам атуліліся дрэвы, развёў рукі ўшыркі – рэчкі пакрыліся лёдам... *(Вучні чытаюць верш, шукаюць патрэбны тэмп і інтанацыю, пазначаюць лагічны націск.)*

– Уявіце цяпер, што Дзед Мароз расказвае верш пра сябе самога. Падумайце, як ён гэта рабіў бы. *(Выслухоўваюцца і аналізуюцца яшчэ некалькі варыянтаў чытання.)*

**З. М.** Пры чытанні верша Якуба Коласа, у прыватнасці яго першай часткі, няма неабходнасці займацца слоўным маляваннем, тлумачэннем створаных аўтарам вобразаў. Дзед Мароз успрымаецца дзецьмі як жывая істота, і гэта вельмі добра. Не трэба «прызямляць» твор, бо дзеці і без таго выдатна зразумеюць мастацкую алегорыю.

Калі першыя тры страфы чытаюцца крыху запаволена, патаемна-казачным тонам, то пры чытанні дзвюх наступных, якія ўтрымліваюць клічныя сказы, інтанацыя мяняецца. Тут трэба перадаць найперш захапленне. («А ялінка!.. Чаго толькі на яе няма галінках!», «А як ззяюць на ёй шышкі, нібы ў іх гараць алмазы!»)

Выбіраючы патрэбную інтанацыю, дзеці некалькі разоў перачытаюць радкі пра ўбранне навагодняй ёлкі. У дыялогу настаўніка з класам павінны неаднойчы прагучаць магчыма новыя для вучняў словы: «ліхтарыкі», «стужкі» і інш.

– Ці падабаецца Дзеду Марозу на святе? *(Так, падабаецца. Паэт піша, што «дзед белабароды толькі ў вусы смех пускае».)*

– Што значыць «пускаць смех у вусы»? *(Сінонім «смяяцца» не прымаецца настаўнікам у якасці станоўчага адказу. Вучні шукаюць больш дакладныя адпаведнікі ці перадаюць значэнне дадзенага словазлучэння апісальна: «пасміхаецца», «задаволена ўсміхаецца»... Дзед Мароз сівы, разважлівы, і таму ён не можа смяяцца звонка і бадзёра.)*

– А цяпер давайце прачытаем заключныя радкі хорам.

**З. М.** Варта заўважыць, што апошняе чатырохрадкоўе – гэта запрашэнне да свята, да весялосці. Клічная інтанацыя яшчэ болей узмацняецца. Настаўнік не зробіць памылкі, калі выкарыстае харавое чытанне.

– Як вы зразумелі радок «Дык рассунем кола шырай...»? *(Аўтар заклікае ў карагод вакол ёлкі ўсіх дзяцей. У такі дзень ніхто не павінен сумаваць.)*

– Давайце ўявім, што мы з вамі таксама ў карагодзе. Якімі словамі вы прывіталі б казачнага Дзеда? *(Вучні выказваюць словы падзякі, пашаны.)*

6. Усведамленне аўтарскай задачы, «пошук аўтара»

– Што хацеў нам сказаць Якуб Колас гэтым вершам? («*Каб і мы ўсе палюбілі зіму*». «*Каб вучыліся бачыць прыгажосць зімы*». «*Паэт падзяліўся з намі добрым настроем*».*)*

7. Заключнае слова настаўніка

– Мне здаецца, што гэты верш заўсёды напамінае кожнаму дарослаcму чалавеку дзяцінства, школу, асацыіруецца з водарам сасновай смалы. Якуб Колас, сам настаўнік па прафесіі, вельмі любіў дзяцей і склаў для іх выдатны верш, які запамінаецца на ўсё жыццё.

8. Выразнае чытанне верша і завучванне яго на памяць

– Прачытайце верш так, каб Дзед Мароз быў рады, каб затрымаўся на дзіцячым свяце як мага даўжэй. *(Дзеці практыкуюцца ў выразным чытанні ўсяго верша.)*

9. Дамашняе заданне

Вывучыць верш на памяць.

**З. М.** Тыя з вучняў, хто можа расказаць яго на памяць, атрымліваюць высокія адзнакі ўжо на ўроку. Усе астатнія вывучаць верш дома. І не толькі для таго, каб атрымаць добрыя і выдатныя адзнакі, але і каб парадаваць дарослых на навагоднім ранішніку, расказаць бацькам і малодшым у сям’і, каб праз многа гадоў перажыць трапяткое, непаўторнае хваляванне, пачуўшы класічны твор з вуснаў уласнага дзіцяці.

### *Верш Якуба Коласа «На рэчцы»*

Ніхто з дамашніх не згадае,
Чым рэчка Костуся займае,
Якая іх звязала сіла
І чым яна так хлопцу міла.

Паэтычнае слова дае магчымасць ствараць запамінальныя слоўныя малюнкі, якія не могуць пакінуць абыякавым ўражлівага і ўдумлівага чытача. Якуб Колас – выдатны паэт-жывапісец у беларускай літаратуры. Непараўнальныя малюнкі прыроды створаны ім у паэме «Новая зямля», урывак з якой («На рэчцы») стала замацаваўся на старонках чытанак для пачатковай школы. У ім, як і ва ўсёй паэме, незаўважна прысутнічае светлы сум, калі паэт успамінае дзяцінства – непаўторную пару свайго

жыцця. Паэтычныя ўспаміны аўтара яднаюцца з уражаннямі дзяцей ад зімовых забаў – і ў выніку адбываецца цуд сутворчасці, суперажывання.

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець эстэтычны змест верша Якуба Коласа «На рэчцы»;

– зацікавіць вучняў жыццём і творчасцю народнага паэта, даць неабходныя для паўнацэннага асэнсавання верша звесткі з яго біяграфіі;

– спрыяць развіццю творчага і ўзнаўляльнага ўяўлення дзяцей, вучыць малодшых школьнікаў бачыць і адчуваць створаныя аўтарам зрокавыя і слыхавыя малюнкі прыроды;

– выхоўваць сродкамі паэзіі здольнасць дзяцей бачыць і адчуваць прыгожае вакол сябе ў штодзённым жыцці.

***Парадак працы***

1. Уступная гутарка

– Раскажыце, калі ласка, што вы ведаеце пра дзіцячыя гады Якуба Коласа. Якімі рысамі характару вылучаўся будучы пісьменнік?

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

Настаўнік выразна і не спяшаючыся чытае верш, даючы дзецям магчымасць уявіць створаныя паэтам малюнкі.

3. Аналіз першаснага ўспрымання твора

– Якім вы ўяўляеце сабе Косціка? *(Выслухоўваюцца адказы вучняў.)*

4. Самастойнае чытанне верша вучнямі

– Перачытайце верш моўчкі. Уявіце, што вы стаіце побач і назіраеце за хлопчыкам.

5. Аналіз верша

– У каго з дарослых Костусь найперш вучыўся любіць прыроду? Што вы ведаеце пра дзядзьку Антося? *(Выслухоўваюцца адказы вучняў.)*

– Першыя ўрокі жыцця і любові да роднай прыроды даў паэту дзядзька Антось, бацькаў брат. Яны запалі ва ўражлівую дзіцячую душу на ўсё жыццё. Дзядзька Антось вучыў малых бачыць хараство прыроды, разумець яе мову.

– Якія радкі паказваюць, што Костусь не ўяўляе свайго жыцця без рэчкі? *(Вучні чытаюць:*

*Бывала, толькі чуць разднее,*
*Чуць трошкі ў лесе пасвятлее,*
*Глядзіш – на рэчку ён шыбуе...)*

– Як вы разумееце слова «шыбуе»? Чаму менавіта гэтае слова выкарыстаў Якуб Колас? *(Вельмі спяшаецца, ідзе напрасткі.)*

– Чаму ж так спяшаецца хлопчык? *(Ён не бачыў сваёй рэчкі з учарашняга дня і ўпэўнены, што тут з'явілася многа новага і цікавага.)*

– Як вы лічыце, чаму Костусь не бярэ з сабою братоў і сястрычак? *(Хлопчык любіць быць сам-насам з рэчкаю. Яму зусім не адзінока. Ніхто не перашкаджае думаць і назіраць.)*

– Пастарайцеся апісаць, як выглядае рэчка, бераг. *(Дзеці прапаноўваюць вусныя малюнкі.)*

– Так, хлопчык радуецца сустрэчы з ракой, неабсяжным прасторам, радуецца добраму надвор'ю, коўзкаму лёду. Знайдзіце, як пра гэта гаворыць паэт. *(Зачытваюцца радкі:*

*То падбяжыць і скаўзанецца,*
*І сам сабе ён засмяецца...)*

– А цяпер знайдзіце і прачытайце, дзе пра лёд гаворыцца як пра жывую істоту. (*Вучні чытаюць наступныя радкі:*

*Лядок закашляў, заіскрыўся,*
*На срэбра-друзачкі пабіўся...)*

– Звярніце ўвагу на тое, як удала паэт выбраў слова «закашляў». У ім так і чуецца, як адзываецца лёд на ўзмах сякеры. Паспрабуйце замяніць слова «закашляў» іншым. *(Вучні спрабуюць прапанаваць больш-менш прыдатныя словы: зазвінеў, затрашчаў, захрыпеў... Усе яны аргументавана адводзяцца. Лёд можа звінець, калі па ім біць нечым цяжкім, а не сячы; глуха трашчыць стары лёд у час вясновага крыгалому.)*

– Як вы пераканаліся, выбранае аўтарам слова найбольш дакладнае ў дадзеным кантэксце. А ці бачыў хто з вас, як прасякаюць палонку ў лёдзе? *(Вучні дзеляцца сваімі назіраннямі.)*

– У жыцці вам неаднойчы давядзецца быць на зімовай рэчцы або возеры, назіраць, як кашляе лядок і ляцяць убакі ледзяныя крупінкі. І тады абавязкова прыйдзе на памяць верш Якуба Коласа.

– Падумайце, якую інтанацыю трэба перадаць і які тэмп выбраць, каб правільна прачытаць апошнія чатыры радкі. *(Пасля першага радка робіцца паўза. Другі і трэці – чытаюцца без паўзы. Заключныя радкі неабходна прачытаць крыху паскорана, з паступовым узмацненнем сілы голасу.)*

– Выкарыстоўваючы аўтарскае апісанне, складзіце вуснае выказванне «Вада вызвалілася». *(Вада цякла пад лёдам, а цяпер вырываецца, вызваляецца з палону. Яна нібы чакала, пакуль хлопчык прасячэ палонку. Клубок вады падымаецца спачатку ўверх, а пасля з шумам расцякаецца ва ўсе бакі.)*

– А навошта Костусь робіць у лёдзе палонку? *(Яму цікава назіраць за вадою, а яшчэ, магчыма, падабаецца ратавацца ад яе, уцякаць да берага.)*

– Пастарайцеся знайсці словы, каб перадаць пачуцці хлопчыка. *(Захапленне, адчуванне сваёй сілы, радасць.)*

6. Творчае заданне

– Дапішыце (празаічнай мовай) твор за аўтара. *(Костусь доўга і ўважліва назірае, як клубок вады паступова страчвае сваю сілу, як, нарэшце, вада паступова супакойваецца, пакрываецца лядком.)*

7. Асэнсаванне эстэтычнага зместу твора, «пошук аўтара»

Мы ведаем, што Костусь Міцкевіч вырас і стаў знакамітым беларускім пісьменнікам Якубам Коласам. А чаму гэта адбылося? Ці выпадкова гэта? *(Костусь вельмі любіў прыроду, быў назіральным, удумлівым, разважлівым.)*

8. Заключнае слова настаўніка

Любоў да Радзімы ў будучага класіка беларускай літаратуры пачыналася з бацькавай леснічоўкі, з дарожкі, пратаптанай у снезе, па якой малы Костусь хадзіў да паўнаводнага Нёмана. Без усяго гэтага не было б паэта, а значыць, мы не ведалі б цудоўных вершаў, якія вучаць бачыць і цаніць прыгожае, дораць нам радасць.

9. Дамашняе заданне

Падрыхтавацца да выразнага чытання верша.

Індывідуальныя заданні:

а) з дапамогай дарослых выбраць з «Новай зямлі» і прачытаць аднакласнікам на наступным уроку іншыя цікавыя эпізоды, якія пацвярджаюць уражлівасць і незвычайную назіральнасць будучага паэта;

б) скласці вуснае сачыненне пра сваю рэчку зімою (для вучняў вясковай школы.)

## *Верш Якуба Коласа «Першы гром»*

Голасам моцы, ціха і важна
Гром пракаціўся ўгары.
Луг адазваўся грому працяжна
Лес адгукнуўся стары.

***Мэты:***

– дапамагчы вучням асэнсаваць вобразны змест верша Якуба Коласа «Першы гром»;

– фарміраваць уменне вызначаць танальнасць верша, яго агульны настрой; вучыць дзяцей разуменню гукавога ладу мовы (гукапісу);

– вучыць дзяцей бачыць і эмацыянальна адчуваць створаныя аўтарам малюнкі прыроды; выхоўваць цікавасць да паэзіі.

***Парадак працы***

1. Падрыхтоўка да асэнсаванага ўспрымання мастацкага твора

Настаўнік правярае вуснае дамашняе сачыненне «Якой я бачыў навальніцу». Адказы дзяцей удакладняюцца пытаннямі: Адкуль вы

назіралі за навальніцай? Які быў дождж? З чым можна параўнаць раскаты грому?

– Нашы продкі верылі: гром і маланка бываюць таму, што прарок Ілья едзе па небе на калясніцы і пасылае на зямлю вогненыя стрэлы. А ці назіралі вы за небам? Якое яно? *(Неба робіцца цёмным. Яго нібы разразаюць маланкі.)*

Неабходна прадугледзець, каб у сваіх адказах дзеці ўжывалі гаваркія беларускія словы: «грамы», «грымоты», «маланка», «бліскавіца», «залева» і інш.

– Паслухайце, якім пачуў першы гром Якуб Колас.

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

Настаўнік выразна, падкрэсліваючы голасам алітэрацыю, чытае верш на памяць. Паміж першым і другім радкамі паўза амаль не адчуваецца. Лагічны націск падае на словы «ціха і важна», «пракаціўся», «адазваўся», «адгукнуўся», «страсянуўся», «дрогнула», «воля», «радасць».

3. Аналіз першаснага ўспрымання твора; падрыхтоўка да выразнага чытання

– Чым адметны гэты верш? Што ў ім незвычайнага? *(Калі слухаеш верш Якуба Коласа, здаецца, чуеш, як грыміць гром.)*

– Якія гукі паўтараліся найчасцей? (*Гукі ггг, ррр.*)

– Назавіце словы, у якіх гэтыя гукі сустракаюцца. *(Гром, пракаціўся, угары, працяжна, стары.)*

– З якой мэтай паэт ужывае менавіта гэтыя словы? *(Каб мы не толькі ўявілі гром, але і пачулі яго.)*

Прачытайце верш яшчэ раз і падрыхтуйцеся да чытання ўслых.

4. Самастойнае чытанне верша вучнямі, падрыхтоўка да асэнсаванага чытання ўслых

**З. М.** Кожнае назіранне ў вершы народнага паэта надзвычай дакладнае. Яно сціснута ў ёмкі вершаваны радок, які можна разгарнуць у жывапісную карціну. Пры аналізе важна найперш засяродзіць увагу вучняў на вобразнай значымасці дзеясловаў-выказнікаў, а таксама удакладняльных акалічнасцей. Дзеясловы не толькі дакладна перадаюць рух, дынамізм дзеяння, але найперш забяспечваюць гукавую выразнасць вобраза.

5. Аналіз верша, адпрацоўка выразнасці чытання

– Звярніце ўвагу: у першым радку гром ціхі, але адначасова моцны і важны. Ён нібыта прыхоўвае, прыберагае сваю маладую сілу. Дзе яшчэ пра гэта гаворыцца? *(«У грукаце гэтым многа ёсць сілы. // Чуецца моц і прастор...»)*

– А як вы разумееце слова «пракаціўся»? *(Прагрукатаў працяжна і заціх.)*

– Калі я сам чую першы гром, заўсёды ўспамінаецца, як грукочуць калёсы па драўляным насціле старога маста. Паназірайце за гэтым, калі

будзе магчымасць. А цяпер давайце прасочым, як прастора, наваколле ўспрымаюць першы гром. (Адкрываюцца запісаныя ў слупок на дошцы словы. Вучні дагаворваюць, карыстаючыся тэкстам, дзеясловы-выказнікі:

луг – *адазваўся*;

лес – *адгукнуўся*;

гай – *страсянуўся*;

поле – *дрогнула*.)

– Чаму лес толькі адгукнуўся, а гай (бярэзнік) ажно страсянуўся ад грому? *(Дрэвы ў лесе старыя, моцныя. Магчыма, лес далей, чым поле, луг і гай.)*

– Як вы разумееце выраз «Долы той гук панеслі»? *(Па зямлі разносіцца рэха. Яно гудзе, і раскаты грому далёка чуваць.)*

– Цяпер прасачыце, у якім парадку размешчаны дзеясловы. *(Дзеянне спачатку нарастае, дасягае найвышэйшай сілы («гай страсянуўся, дрогнула поле»), а пасля зноўку ідзе на спад («долы той гук панеслі»).*

– Прачытайце, што чуецца паэту ў раскаце грому. *(Вучні знаходзяць і чытаюць радкі:*

*У гэтым раскаце чуецца воля,*
*Чуецца радасць зямлі.*
*У грукаце гэтым многа ёсць сілы,*
*Чуецца моц і прастор...)*

– Мне здаецца, што паэт схіляе галаву перад веліччу прыроды, ён адчувае ўсёю душою радасць зямлі, якая доўга жыла ў прадчуванні цёплых майскіх ліўняў, пасля якіх зацвітуць краскі, зазелянеюць сенажаці, зарунеюць палі. Першы гром абудзіў зямлю ад зімовага сну. Як селянін і паэт, Якуб Колас тонка адчувае родную прыроду. Першы гром надае моц яго думкам, напаўняе духоўнай і фізічнаю сілаю. Падрыхтуйцеся прачытаць два апошнія радкі верша. Якія пачуцці трэба перадаць пры чытанні? *(Захапленне, замілаванне, удзячнасць.)*

– Падрыхтуйцеся да выразнага чытання ўслых двух заключных радкоў. Падумайце, з якой інтанацыяй іх трэба прачытаць. *(Вучні практыкуюцца ў выразным чытанні двух апошніх радкоў:*

*Першыя громы! Сэрцу вы мілы,*
*Люб мне ваш смех паміж гор...)*

– Сваё захапленне прыродай Якуб Колас не стрымлівае. Гэта не магчыма. Яна для паэта – выток усяго цудоўнага. Не раз і не два, калі пясняр звяртаецца да прыроды роднага краю, ён ужывае слова «мілы».

Успомніце яшчэ вершы, дзе ёсць гэтае слова. *(Настаўнік дапамагае дзецям успомніць вядомыя Коласавы радкі: Вобразы мілыя роднага краю...; Мой родны кут! Як ты мне мілы...)*

– Пра які «смех паміж гор» ідзе размова ў заключным радку? *(Калі мясцовасць узгорыстая, рэха грому адбіваецца ад узгоркаў па некалькі разоў, пераклікаецца адно з адным. Здаецца, што яно дражніцца, гуляе, смяецца.)*

– У кожнага паэта гром розны. А які ж гром у Якуба Коласа? Якія з прыведзеных азначэнняў найбольш дакладныя і чаму? *(Настаўнік адкрывае запісаныя на дошцы словы: адзінокі, вясёлы, лагодны, нясмелы, магутны, несціханы, радасны, працяглы, раскацісты, аглушальны, гнеўны, рэзкі, далёкі, строгі. Вучні выбіраюць патрэбныя словы, аргументуючы свой выбар.)*

– А ці страшны першы гром у Коласа? *(Не, зусім не страшны. Ён не наробіць шкоды. Першы гром толькі спрабуе сваю сілу.)*

– У адным са сваіх вершаў паэт пісаў: «І першы гром – як музыка...» Ці можна параўнаць з музыкай гром у гэтым Коласавым творы? *(Вучні выказваюць свае меркаванні.)*

– Падрыхтуйцеся цяпер да самастойнага чытання ўсяго верша.

6. Практыкаванні ў выразным чытанні ўслых усяго твора

7. Раскрыццё аўтарскай задумы, «пошук аўтара»

– З якой мэтай Якуб Колас напісаў верш «Першы гром»? *(Выслухоўваюцца адказы вучняў.)*

8. Заключнае слова настаўніка

– Чытаючы вершы Якуба Коласа пра прыроду, мы вучымся слухаць, назіраць і думаць. Сёння паэт дапамог нам пачуць першы веснавы гром, а таксама зразумець, якую вагу мае кожнае слова ў паэтычным творы.

9. Дамашняе заданне

Вывучыць верш на памяць. Падрыхтавацца да конкурсу чытальнікаў.

### ***Верш Максіма Багдановіча «Зіма»***

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер.
І волен лёгкіх санак бег.

І цяпер, праз чатыры дзясяткі гадоў, перад вачыма заснежанае русла Днепра-Бугскага канала і мы, чацвёра сябрукоў-трэцякласнікаў, што вяртаемся (кіламетра паўтара па лёдзе) са школы. Як цудоўна крочыць па свежым рыпучым снезе, удыхаць марознае паветра, страсаць шэрань з прыбярэжнага вербалозу і дэкламаваць на поўны голас то хорам, то па

чарзе несмяротныя радкі Паэта! У дзённіках пяцёркі за вывучаны на памяць Багдановічаў верш, а ў «Родным слове» яшчэ не адзін верш пра зіму. Праўду сказаць, многія з іх «самі завучыліся» па новенькіх чытанках яшчэ з лета. Ад тых шчаслівых гадоў ураженне на ўсё жыццё, што дакрануўся душою да нечага крынічна-чыстага. Багдановічавы радкі шчасліва жывуць у памяці, хвалююць, вучаць радавацца жыццю, цаніць жыццё.

Верш Максіма Багдановіча «Зіма» – адзін з найцудоўнейшых узораў класічнай паэзіі, даступнай для разумення малодшых школьнікаў. Мастацкая сіла твора ў тым, што аўтару ўдалося перадаць хваляванне, захапленне перапоўненага пачуццямі лірычнага героя. Усё паэтычнае апісанне – гэта паступовае назапашванне эмоцый, неабходнае для таго, каб у канцы выгукнуць на поўную моц незабыўнае: «У грудзях пачала кроў кіпець». Хуткасць... Лёгкія сані ляцяць праз ноч, праз казку, стралою са звонам бомаў праносяцца паміж зямлёю і небам...

Няма ніякага апраўдання таму, што ў сучасных падручніках для пачатковай школы дадзены толькі першыя восем радкоў. Ва «ўрэзаным» выглядзе гэты класічны твор (на жаль, ёсць многа іншых падобных прыкладаў) губляе сваю мастацкую сілу, скажае аўтарскую задуму. Так і застанецца для некаторых школьнікаў адзін з найлепшых узораў слоўнага мастацтва недавучаным на ўсё жыццё.

***Мэты:***

– дапамагчы дзецям зразумець вобразна-эстэтычны змест верша Максіма Багдановіча «Зіма»;

– фарміраваць уменне вызначаць танальнасць верша, яго агульны настрой; практыкаваць вучняў у чытанні клічных сказаў і сказаў са звароткамі;

– паказаць ролю вобразных сродкаў мовы ў абмалёўцы мастацкага вобраза;

– зацікавіць дзяцей жыццём і творчасцю Максіма Багдановіча; выхоўваць пачуццё гонару за беларускую нацыянальную літаратуру.

***Парадак працы***

1. Падрыхтоўчая праца

Настаўнік расказвае дзецям пра асобу і ворчасць Максіма Багдановіча, аднаго з самых любімых беларусамі паэтаў.

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

3. Высвятленне эмацыянальнага ўздзеяння твора на вучняў

– Што вы адчулі, слухаючы верш Максіма Багдановіча? *(Адчуваецца радасць, свята. Здаецца, нібы сам едзеш на санках і вецер свішча ў вушах. Хочацца бегчы на вуліцу ў марозны дзень і крычаць.)*

**З. М.** Такімі ці прыкладна такімі будуць дзіцячыя адказы. У тым, што верш не пакіне  нікога абыякавым, можна быць упэўненым. Пра гэта

паклапаціўся сам паэт. Настаўніку застаецца толькі дапамагчы дзецям убачыць хараство паэтычнага слова, далучыцца да таямніц высокай паэзіі.

– А цяпер паспрабуем разабрацца, з дапамогай чаго аўтар перадае, як вы сказалі, сілу, хуткасць, прыгажосць. Для гэтага давайце перачытаем твор яшчэ раз, пастараемся глянуць на малюнкі зімовай ночы вачыма чалавека, што ляціць па снезе ў лёгкіх санях.

2. Самастойнае чытанне верша вучнямі, падрыхтоўка да асэнсаванага чытання ўслых

3. Аналіз верша, адпрацоўка выразнасці чытання

**З. М.** Ужо першыя радкі звароту «Здароў, марозны, звонкі вечар! Здароў, скрыпучы, мяккі снег!» перадаюць фізічную сілу чалавека, яго душэўную энергію. Спрыяе гэтаму гукавы фон, утвораны націскнымі складамі «ро», звонкімі і санорнымі зычнымі «з», «р», «н». Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на своеасаблівасць гэтага звароту:

– Прачытайце першыя два радкі некалькі разоў напаўголасу, прыслухайцеся да іх гучання. Што вы заўважылі? *(Выслухоўваюцца адказы вучняў.)*

– Каму звычайна кажуць «здароў»? *(Блізкаму сябру, сустрэчы з якім даўно чакалі.)*

– Чаму, на вашу думку, аўтар ужыў менавіта гэтае слова? *(Герой вельмі рады. Да снегу, вечара ён звяртаецца як да жывой істоты. А яшчэ гэтае слова добра вымаўляць уголас.)*

– Вельмі добра, малайцы! Прыгледзьцеся: у гэтым слове сустракаюцца толькі цвёрдыя звонкія зычныя, таму голас набывае асаблівую сілу. Уявіце, што герой звярнуўся б да прыроды са словамі «прывітанне» або «добры вечар». Настрой адразу памяняўся б... Які ж вечар у вершы? *(Марозны, звонкі.)*

– Як выдумаеце, чаму паэт паставіў гэтыя словы побач? *(Калі на вуліцы мароз, то далёка чуваць. Асабліва вечарам.)*

– А што чуваць? Якія гукі перадаюцца ў вершы? Прасачыце. *(Чутно, як рыпіць снег пад палазамі, як звіняць бомы.)*

**З. М.** Слова «бомы» трэба абавязкова ўдакладніць, калі яно не сустракалася на папярэдніх уроках. Пасля гэтага вучні без дадатковых тлумачэнняў зразумеюць выраз «вясёлых бомаў медзь». І «скрыпучы... снег», і «вясёлых бомаў медзь» асабліва выразна чуваць у звонкай і марознай цішы, бо і «мяцель не вее, сціхнуў вецер».

– А цяпер давайце папрактыкуемся ў чытанні першага чатырохрадкоўя. *(Вучні ацэньваюць чытанне сваіх сяброў. Настаўнік кожны раз пытаецца, якое пачуццё імкнуўся перадаць чытальнік.)*

– Падрыхтуйцеся да выразнага чытання другога чатырохрадкоўя. Пастарайцеся ўявіць намаляваную аўтарам карціну. (Вучні рыхтуюцца да выразнага чытання ўслых.)

**3. М.** Другое чатырохрадкоўе не патрабуе ніякіх дадатковых каментарыяў. Дзеяслоў-метафара «дрыжаць» і метафарычнае азначэнне «пахаладзелыя ад марозу» робяць малюнак жывым. Бярозы – як застылыя пад начной сінявою мары. Настылыя зоркі дрыжаць у халодным небе. Усё зразумела, усё дакладна, выразна, паэтычна.

– Перачытайце самі сабе трэцюю страфу. Як вы разумееце словы «стуль», «стоўп», «рыза»? *(«Стуль» – адтуль, з неба, «стоўп» – след ад святла месяца, празрысты і светлы, «рыза» ў прамым сэнсе – адзенне святара пры набажэнстве, у вершы – срэбны колер ад месячнага святла на снезе.)*

– Уявіце агульны малюнак. Якім вы бачыце месяц, месячнае святло? *(Месяц таксама жывы: ён не проста адбівае святло, а «спусціў» на поле «празрысты, светлы стоўп», накрыў «срэбнай рызай» снежную прастору.)*

– Прыгледзьцеся марозным вечарам да зорак, да месячыка. Магчыма, ён вам таксама здасца вільготным, а магчыма, вы знойдзеце сваё слова, якое не сустракалася ні ў аднаго паэта. Максім Багдановіч любіў узірацца ў неба і думаць пра вечнае. Калі ў будучым вы прачытаеце ўсе-ўсе яго вершы, то ўбачыце, што месяц у паэта не толькі вільготны, але і «белы, заплаканы», а яшчэ вясёлы.

– Перачытайце яшчэ раз другую і трэцюю строфы. Заўважце, якімі колерамі створаны малюнак зімовай ночы. *(«Срэбная рыза», «белыя бярозы», «сінеючыя снягі», «начная сінява».)*

– Як да жывой асобы лірычны герой звяртаецца не толькі да вечара, да снегу, але нават і да бомаў пад дугою. Падрыхтуйцеся прачытаць гэты зварот услых. *(Вучні практыкуюцца ў чытанні заключнай страфы.)*

– «Узрывайце ж іх (снягі) санямі, коні! // Звіні, вясёлых бомаў медзь!..» Гэта кліч ехаць яшчэ хутчэй, яшчэ хутчэй несціся ў лёгкіх санях у ноч. Герой настолькі захапіўся шпаркай яздою, харастэм краявідаў, бязмежнасцю прасторы, што нават пачынае адчуваць, як «у грудзях пачала кроў кіпець». Гэта і ёсць вяршыня пачуцця.

4. Заключная гутарка

– Чым спадабаўся вам верш Максіма Багдановіча? Чаму на працягу стагоддзя ён не пакідае нікога абыякавым?

5. Дамашняе заданне

Вывучыць верш Максіма Багдановіча на памяць.

### *Верш Алеся Гаруна «Ты, мой брат, каго зваць беларусам...»*

Ты, мой брат, каго зваць беларусам,
Роднай мовы сваёй не цурайся;
Як не зрокся яе пад прымусам,
Так і вольным цяпер не зракайся...

Перад тым як даваць настаўніку канкрэтныя рэкамендацыі па вывучэнні дадзенага верша на ўроку, ёсць неабходнасць сказаць, наколькі выхаванне любові да роднага слова спрыяе станаўленню нацыянальнай самасвядомасці малодшага школьніка, фарміруе яго асобу. Педагогі-метадысты заўсёды здзіўляліся чуйнасці, з якой малое дзіця заўважае надзвычай тонкія адрозненні ў адценні слоў. Пачуўшы слова, яно ўводзіць яго ў сказ і словазлучэнне. Па словах К.Д. Ушынскага, родная мова – гэта незвычайны педагог, які вучыць лёгка, па якімсьці недасягальна аблегчаным метадзе. Адарваная ад нацыянальнага грунту адукацыя дзейнічае разбуральна і негатыўна ўплывае на фарміраванне асобы вучня. Засвойваючы мову, дзіця засвойвае «часцінкі творчай сілы» (К.Д. Ушынскі), якая дала народу магчымасць яе стварыць. Мовазнаўцы, метадысты і псіхолагі, гаворачы пра гэтую «творчую сілу», усё часцей прыходзяць да высновы, што функцыя авалодання роднай мовай у шэрагу з іншымі важнейшымі функцыямі жыццядзейнасці закладзена ў чалавеку спрадвечна. Яна прачынаецца яшчэ да нараджэння і існуе прыкладна да дзевяці гадоў. Калі ж дзіця ад нараджэння чуе некалькі моў, роднай (паводле Ш.А. Аманашвілі) становіцца тая мова, разам з якой засвойваецца культура народа, яго фальклор, слоўнае мастацтва. Менавіта на аснове функцыі, а не на аснове памяці ідзе моўнае развіццё асобы ў малодшым школьным узросце. Таму так важна прывіваць дзіцяці любоў да роднай мовы ў першыя гады навучання. Найвялікшага жалю вартае дзіця, адарванае ад роднага слова.

Колькасць урокаў беларускай мовы, асабліва ў школах з рускай мовай навучання, мізэрная. Але і ў такіх школах трэба прыкласці ўсе сілы, каб навучанне было нацыянальным па змесце.

Навучыць любові да зямлі бацькоў, дапамагчы дзецям адчуць сваю нацыянальную годнасць, дапамагчы палюбіць словы роднай мовы, тыя назвы, якімі, як казаў паэт, «мы павінны, як імем сваім, даражыць» – неабходная і пачэсная задача для настаўніка!

Любая праца на ўроку літаратурнага чытання: успрыманне твора, асэнсаванне яго ідэйна-вобразнага зместу, суразмоўніцтва аўтара і чытача, педагога і вучня, разуменне і асэнсаванне вобразнай функцыі мастацкага слова – не можа быць паспяховай, калі настаўнік настойліва і мэтанакіравана не будзе выхоўваць у сваіх вучняў любоў да роднага слова як асновы нацыянальнай самасвядомасці.

Асаблівую ўвагу настаўнік пачатковых класаў павінен звяртаць на вывучэнне класічных твораў, закліканых абуджаць нацыянальную годнасць маленькіх грамадзян Беларусі, шанаваць і берагчы найвялікшы дар – роднае слова. Несумненна, што такім творам з’яўляецца верш Алеся Гаруна «Ты, мой брат...».

Рыхтуючыся да ўрока, неспрактыкаванаму настаўніку давядзецца, хутчэй за ўсё, наведаць чытальную залу ці звярнуцца да падручнікаў

па гісторыі літаратуры. Неабавязкова гэта толькі пры ўмове, калі пачынаючы педагог здолее без падрыхтоўкі растлумачыць вучням наступныя радкі:

Як не зрокся яе [мовы] пад прымусам,
Так і вольны цяпер не зракайся;
У сялянскай аграбленай хаце
Толькі ён [скарб, мова] незабраным застаўся.

Пра якую волю гаворыць паэт? Чаму ў «аграбленай» хаце? Кім аграбленай і калі? Няма сумнення, што пра ўсё гэта вучні спытаюць.

Трэба заўважыць, што названы верш Алеся Гаруна сустракаецца ў сучасных падручніках для рускамоўнай і беларускамоўнай школы ў аднолькава скарочаным выглядзе, па два фрагменты – восем першых і чатыры апошнія радкі. Гэта і ўскладняе працу нявопытнага настаўніка.

У чым адметнасць працы над вершам Алеся Гаруна? Найперш у тым, што разуменне гэтага звернутага да пачуццяў чытача верша патрабуе пэўных ведаў з гісторыі Беларусі. Дакладней сказаць, яго разуменне прынцыпова немагчымае без выкарыстання элементаў літаратуразнаўчага аналізу. Названую акалічнасць неабходна ўлічваць настаўніку. Гэты класічны верш, што ніколі не губляў свайго мастацка-публіцыстычнага запалу, надзвычай актуальны і сёння. На працягу стагоддзя ён настойліва кліча змяніць рэчаіснасць да лепшага. Настаўнік зробіць недаравальную памылку, калі не выкарыстае закладзены ў творы публіцыстычны, эмацыянальны напал для абуджэння пачуцця гонару за нашу родную мову.

На ўроку літаратурнага чытання, сцвярджае методыка, неабходна чытаць трыццаць і болей чвілін. Асаблівых пярэчанняў мы не маем, але ж і пастулата з гэтага рабіць не варта. Вучні з добрай зрокавай і слыхавой памяццю, няма ніякага сумнення, вывучаць верш за дзесяць хвілін, калі атрымаюць такое заданне. Але не гэта галоўнае, не для бяздумнага завучвання пісаўся верш у далёкім 1910 годзе да чатырохгоддзя «Нашай нівы». Твор лёгка і назаўсёды запомніцца сам па сабе, калі дзеці ўсвядомяць глыбокі сэнс кожнага радка і кожнага слова. А калі пасля гэтага ўрока ў вучняў узнікнуць дзясяткі «чаму?», на якія яны будуць нецярпліва чакаць адказу, – значыць час, патрачаны настаўнікам на падрыхтоўку да ўрока, не прапаў марна.

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець ідэйна-вобразны змест верша Алеся Гаруна «Ты, мой брат, каго зваць беларусам...»;

– вучыць дзяцей выказваць свае ўражанні, дыскутаваць, даказваць правамернасць сваіх поглядаў, абапіраючыся на тэкст твора;

– зацікавіць вучням жыццём і творчасцю Алеся Гаруна; вучыць пачынаючых чытачоў «бачыць асобу аўтара», разумець яго пазіцыю;

– выхоўваць любоў да беларускай мовы, жаданне карыстацца ёю і аберагаць яе.

***Парадак працы***

На перапынку перад пачаткам урока нямоцна гучыць музыка. Вельмі дарэчы запіс Данчыка (Багдана Андрусішына), асабліва песня «Я не ганю землі чужыя…» на словы Генадзя Бураўкіна.

1. Уступнае слова настаўніка

– Мала каму з нашых паэтаў выпаў такі трагічны лёс, як Алесю Гаруну. Ужо ў 20-гадовым узросце Алесь Гарун трапіў у турму за тое, што змагаўся з самадзяржаўем. Дзесяць гадоў адбыў у Сібіры, дзе невылечна захварэў на сухоты. А праз тры гады пасля вызвалення памёр у далёкім Кракаве, куды яго зусім бездапаможнага вывезлі санітарным цягніком.

Сваё жыццё Алесь Гарун прысвяціў змаганню за лепшую долю роднай зямлі, але больш як шэсцьдзясят гадоў беларускі народ, той народ, для якога тварыў паэт, не меў права чытаць ягоныя творы, называць яго імя, успамінаць добрым словам.

Пяцьсот гадоў таму наша дзяржава, як вы, пэўна, ведаеце, была часткай Вялікага Княства Літоўскага. Усе ў гэтай дзяржаве гаварылі на беларускай мове: і просты люд, і кіраўніцтва, і паны. А пасля здарылася так, што Беларусь папала спачатку пад уладу Польшчы, а потым – Расіі. І польскія каралі, і рускія цары ненавідзелі ўсё беларускае. Яны забаранілі нават назву «Беларусь». Беларуская мова таксама была пад забаронай. На ёй нічога не пісалася, і толькі ў вёсках простыя людзі на беларускай мове размаўлялі, не давалі ёй загінуць. Але настаў 1905 год. Цар, баючыся рэвалюцыі, дазволіў выпускаць газеты і кнігі на беларускай мове. У гэтыя гады і напісаны верш, які сёння мы з вамі можам прачытаць.

2.Чытанне верша настаўнікам на памяць

3. Праверка першаснага ўспрымання

– Да чаго заклікае паэт? *(Выслухоўваюцца вучнёўскія адказы.)*

4. Самастойнае чытанне верша вучнямі

Кожны радок верша быў выпакутаваны паэтам, ён пра многае гаворыць. Перачытайце верш самі сабе ўважліва, не спяшаючыся. Спытайце пра значэнне незразумелых слоў, калі такія сустрэнуцца.

5. Аналіз верша, асэнсаванне аўтарскай пазіцыі

– Прачытайце першае чатырохрадкоўе.

– Да каго звяртаецца Алесь Гарун? Да чаго ён заклікае?

– Пра які прымус ідзе размова?

– Чаму, на вашу думку, беларуская мова выжыла?

– У кнізе, якую я прынёс на наш сённяшні ўрок (настаўнік паказвае кнігу Алеся Гаруна «Сэрцам пачуты звон» (Мінск: Маст. літ., 1991)), адно са

слоў у канцы першага радка напісана з вялікай літары. Якое, думаеце, гэта слова? *(У аўтарскім варыянце: «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам…»)*

– Як трэба прачытаць гэтае слова?

– Прачытайце яшчэ раз услых першыя чатыры радкі. Якое пачуццё трэба перадаць пры чытанні?

– Падрыхтуйцеся да чытання ўслых наступных чатырох радкоў *(Вучні практыкуюцца ў выразным чытанні.)*

– Што такое «скарб»?

– Што называе скарбам паэт? Чаму?

– Чаму паэт піша «ў аграбленай хаце»? *(Вучням можна сказаць пра падаткі, пра рэкруцтва і інш.).*

– Уважліва перачытайце заключнае чатырохрадкоўе.

– Да чаго заклікае паэт?

– Чаму мова – «скарб на вечныя годы»?

– Як вы разумееце два апошнія радкі?

– У якім чатырохрадкоўі найбольш акрэслена выражана аўтарская думка, аўтарская пазіцыя? Падрыхтуйцеся прачытаць яго ўслых. Якія словы выдзеліце голасам пры чытанні?

6. Практыкаванні ў выразным чытанні ўсяго твора

7. Заключнае слова настаўніка

– Усім нам неабходна шанаваць родную мову. Ніколі і нідзе нас не будуць паважаць у свеце, калі мы будзем грэбаваць родным словам, цурацца яго.

8. Завучванне верша на памяць

Першы рад чытае ўслых першае чатырохрадкоўе, другое чатырохрадкоўе чытаюць першы і другі рады сумесна. Нарэшце, заключныя чатыры радкі чытае ўвесь клас. Пры такім чытанні верш паступова набывае моц, што лагічна апраўдана.

9. Дамашняе заданне

Вывучыць верш на памяць.

Індывідуальныя заданні: асобным вучням прапануецца падрыхтаваць да наступнага ўрока вершы і выказванні беларускіх пісьменнікаў і вядомых людзей пра мову (матэрыялам забяспечвае настаўнік).

### ***Верш Алеся Гаруна «Добрыя дзеці»***

Паставілі дзеці сіло. Вераб'я  
Хацелі злавіць на пацеху.  
Злавілі сініцу, крычаць: – Вой – я – я!  
А радасці колькі, а смеху!

Імчацца да маткі: – Сінічк, глядзі!
– А дзе ж вы узялі? – Злавілі,
Дастань ты ёй клетку, хутчэй пасадзі.
– Нядобра вы, дзеткі, зрабілі!

«Найбольш цяжкія пакуты, – піша вядомы літаратуразнаўца Уладзімір Казбярук у прадмове да кнігі “Сэрцам пачуты звон”, – выпалі на долю Алеся Гаруна. І калі мы сёння акінем позіркам увесь цярністы шлях аўтара “Матчынага дару” і ўсвядомім сабе, у якіх умовах ён пісаў свае вершы, то міжвольна вымушаны будзем нізка схіліцца перад яго мужнасцю, жыццёвым і творчым подзвігам». З біяграфіяй, вершаванымі і празаічнымі творамі Алеся Гаруна вучні больш падрабязна знаёмяцца ў старэйшых класах сярэдняй школы, але заслугоўвае ўхвалы той факт, што ў праграму па чытанні для малодшых вучняў уключаны вершы паэта «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...» і «Добрыя дзеці». Апошні з названых твораў надзвычай пераканаўча раскрывае дзіцячыя характары, выхоўвае ў пачынаючых чытачоў найлепшыя чалавечыя якасці.

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець ідэйна-вобразны змест верша Алеся Гаруна «Добрыя дзеці»;

– пазнаёміць вучняў з жыццём і творчасці беларускага пісьменніка, дапамагчы зразумець некаторыя адметнасці яго творчай манеры;

– вучыць пачынаючага чытача «бачыць асобу аўтара», разумець аўтарскую пазіцыю;

– •выхоўваць пачуццё гонару за беларускую нацыянальную літаратуру.

***Парадак працы***

1. Уступнае слова настаўніка

Сучаснік Янкі Купалы і Якуба Коласа Алесь Гарун пражыў кароткае і цяжкае жыццё – усяго 33 гады. З іх 10 гадоў – у далёкай Сібіры, куды быў сасланы за тое, што змагаўся за лепшы лёс народа. У Сібіры Максім Гарун падрыхтаваў сваю першую і адзіную кнігу «Матчын дар». Ён вельмі любіў маці і малодшую сястру. Яны былі той сілай, каторая заўсёды цягнула паэта дамоў, дзеля іх ён стараўся выжыць у непрыветнай, суровай сібірскай глушы, дзе нават па пошту прыходзілася ісці пешшу васямнаццаць кіламетраў. Па іх сумавала сэрца, да іх імкнуліся думкі. Нездарма на вокладцы кнігі «Матчын дар» Алесь Гарун напісаў: «Гэтую першую кніжку думак і песняў сваіх матцы сваёй прысвячаю».

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

**З. М.** Зазначым, што і настаўніку неабходна папярэдняя дамашняя падрыхтоўка. Як вядома з біяграфіі, паэт выхоўваўся ў заходнебеларускім

моўным асяроддзі, таму ў яго вершах сустракаюцца лексічныя і марфалагічныя адметнасці, у прыватнасці дыялектызмы і паланізмы. Гэта ў некаторай ступені ўскладняе працу, але ж, з другога боку, трэба помніць, што ўсе яны ўяўляюць сабой характэрную асаблівасць жывой народнай мовы. У вершы «Добрыя дзеці» ўжыванне дыялектных формаў дзеяслова («ідзець», «не пушчае») мае месца ў дыялогу, таму ўспрымаецца натуральна. Што да парушэння акцэнталагічнай нормы ў перадапошнім радку, думаецца, не варта парушаць вершаваны памер, мелодыку твора. З дзецьмі можна «дамовіцца»: будзем чытаць «прыкла́д», хоць гэтае слова цяпер вымаўляецца з націскам на першым складзе.

Падобным чынам можна абгаварыць ненарматыўнае ўжыванне дзеяслоўных формаў.

3. Праверка першаснага ўспрымання

– Як вы думаеце, чаму верш мае такую назву? – пытае настаўнік пасля непрацяглай паўзы. *(Дзеці адпусцілі на волю сініцу. Тут птушка адчувае сябе лепш, чым у клетцы.)*

– Правільна, але ж верш «Добрыя дзеці», які напісаны сто гадоў таму назад, не такі просты, як здаецца на першы погляд. Каб лепш зразумець, што паэт хацеў сказаць чытачам, якія думкі данесці, давайце прачытаем яго яшчэ раз уважліва, не спяшаючыся.

4. Самастойнае чытанне верша вучнямі, падрыхтоўка да асэнсаванага чытання ўслых

Вучні чытаюць спачатку моўчкі, пасля напаўголасу (кожны ў сваім тэмпе).

5. Паўторнае чытанне верша настаўнікам

Перад паўторным чытаннем настаўнік звяртае ўвагу вучняў на нязвыклыя пакуль што для іх паўзы ў сярэдзіне вершаванага радка, на клічныя сказы ў дыялогу.

6. Аналіз мастацкага твора, практыкаванні ў выразным чытанні

– Прачытайце першыя чатыры радкі. Пастарайцеся перадаць настрой дзяцей. *(Вучні практыкуюцца ў выразным чытанні.)*

– Чаму так узрадаваліся малыя? *(Яны хацелі злавіць вераб'я, а злавілі нават не вераб'я, а сініцу. Сініца прыгожа спявае.)*

– Ці трымаў хто з вас злоўленую птушку або малое птушанё? Што вы адчувалі ў гэты час? *(Калі ў дзяцей няма пра што сказаць, настаўнік пачуццёва, усхвалявана гаворыць пра свае адчуванні. Спалоханая птушка, намагаецца вырвацца, моцна трапечацца яе сэрца. Несумненна, кожнаму даросламу чалавеку знаёма падобнае адчуванне).*

– Чаму дзеці пабеглі адразу да маці? *(Яны чакалі, што яна пахваліць іх за спрыт, парадуецца разам з імі.)*

– Што малыя намерыліся зрабіць з птушкай? Прачытайце. *(«Мы будзем яе і паіць і карміць. // Спявала б нам птушка прыгожа».)*

– Як жа маці ацаніла іх учынак? Прачытайце. *(«Нядобра вы дзеці зрабілі!»)*

– Чаго не разумелі дзеці? Па якой прычыне? *(Яны былі малымі і не здагадваліся нават, што ў няволі птушкі не спяваюць.)*

– Вельмі правільна. А яшчэ ў няволі птушкі часта зусім адмаўляюцца ад корму і гінуць. Уяўляеце, якое гэта было б гора для ўсіх... Які ж прыклад прывяла маці, каб пераканаць, як цяжка птушцы ў няволі? *(Зачытваецца адпаведнае месца ў творы.)*

– Што вы можаце сказаць пра маці? Якая яна? *(Маці клапатлівая, добрая, ласкавая.)*

– Дакажыце гэта словамі тэксту. *(Яна звяртаецца да малых са словамі «дзеткі», «рыбулькі мае».)*

– Пра што найперш клапоціцца маці, як вы думаеце? *(Каб дзеці яе выраслі добрымі людзьмі.)*

– Ці шкада малым адпускаць птушку? *(Не, не шкада. Дзеці рады, што далі ёй волю.)*

6. Практыкаванні ў выразным чытанні дыялогу

Настаўнік чытае словы маці, вучні – словы дзяцей. Пасля гэтага ў чытанні дыялогу практыкуюцца вучні, што сядзяць побач.

7. Працяг аналізу мастацкага твора

– Перачытайце моўчкі заключнае чатырохрадкоўе і скажыце: як трэба разумець радкі «Матчыны словы ў сэрцах дзяцей // Ласкавыя струны кранулі»? *(Дзецям стала шкада птушку. Яны адчуваюць сябе вінаватымі, перажываюць, што пакрыўдзілі маці.)*

8. Заключнае слова настаўніка

– У сэрцы дзяцей не было зла, і нядобры ўчынак яны зрабілі ад няведання. Мудрыя словы маці, якія вучаць цаніць і разумець волю, запомняцца ім на ўсё жыццё. Пра гэта няма звестак, але можа быць і такое, што героі верша – будучы паэт і яго малодшая сястра. Маці, шчаслівыя гады дзяцінства ніколі не сціраліся ў яго памяці.

9. Асэнсаванне ідэйна-вобразнага зместу твора, «пошук аўтара»

– За каго вы парадаваліся, прачытаўшы верш Алеся Гаруна»? *(Выслухоўваюцца адказы вучняў.)*

**З. М.** Тут ёсць над чым паразважаць. Птушка на волі – радасць; словы маці кранулі «ласкавыя струны ў сэрцах дзяцей» – можна парадавацца за маці; радасна і за саміх дзяцей: яны далі свабоду сініцы. Настаўнік акцэнтуе ўвагу на пачуццях дзяцей, бо чым вастрэй чалавек адчувае, суперажывае, тым багацейшы ён сам, багацейшая яго сувязь са светам.

– Перачытайце яшчэ раз два апошнія радкі. Як вы іх разумееце? *(Выслухоўваюцца вучнёўскія адказы.)*

**З. М.** «І добрыя дзеці – прыклад для людзей! – // Сініцы свабоду вярнулі...» Алесь Гарун, палітычны ссыльны, цешыцца дзіцячай дабрынёю.

Яна – прыклад і для дарослых. А дарослы свет жорсткі і нялітасцівы. Гэта па загадзе надзеленых уладай людзей пакутуе ў астрозе і ссылцы паэт. Няхай кожны настаўнік вырашыць для сябе, ці будзе ён гаварыць пра гэта з дзецьмі ў класе, але не выключана, што вучні самі не пройдуць міма згаданых слоў.

– Якое, на вашу думку, слова галоўнае ў заключным радку? *(Слова «свабода».)*

– Вельмі правільна. Гэтае слова важнае для ўсяго твора. Яго добра было б надрукаваць вялікімі літарамі. Свабода, «залатая воля» – гэта тое, што ніхто не мае права забраць ні ў птушкі, ні ў чалавека.

10. Практыкаванні ў выразным чытанні ўсяго верша

11. Дамашняе заданне

Навучыцца чытаць верш выразна і без памылак.

### ***Верш Змітрака Бядулі «Вясна»***

То не снег,
То чаромха цвіце.
То не снег –
То бярозка расце.
То не снег –
Расцвітае садок.
То не снег,
А ляціць матылёк...

Верш Змітрака Бядулі цікавы тым, што ўтрымлівае яркія зрокавыя і гукавыя вобразы, у аснове якіх ляжыць параўнанне. Кожная вершаваная страфа, за выключэннем апошніх, складаецца з двух такіх параўнанняў. Яны гучаць як адказ цікаўнаму дзіцяці, што глядзіць на свет шырока расплюшчанымі вачыма паэта.

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець эстэтычны змест верша Змітрака Бядулі «Вясна»;

– паказаць ролю вобразных сродкаў мовы (эпітэтаў і параўнанняў) у стварэнні аўтарам мастацкага вобраза;

– дапамагчы пачынаючым чытачам усвядоміць, што кожнае ўжытае паэтам слова найлепшым чынам адпавядае дадзенаму кантэксту, з’яўляецца незаменным;

– вучыць дзяцей заўважаць вобразныя малюнкі ў вершаваных і празаічных творах розных аўтараў;

– вучыць пачынаючых чытачоў бачыць прыгожае вакол сябе, шукаць словы для выказвання сваіх пачуццяў.

***Парадак працы***

1. Падрыхтоўка да асэнсаванага ўспрымання твора

Назавіце два асноўныя колеры вясны. *(Зялёны і белы.)*

– Так, галоўны, святочны колер маладой вясны – белы. Гэта і белая квецень чаромхі, і белыя камлі бяроз, і сад у квецені. Нават белыя крыльцы матылькоў нагадваюць сняжынкі. У суладдзі з белым – зялёны колер лісця і травы. Паслухайце, як выдатна напісаў пра гэта вядомы беларускі пісьменнік, сучаснік Янкі Купалы і Якуба Коласа Змітрок Бядуля.

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

3. Аналіз першаснага ўспрымання

– Чым не падобны гэты верш на іншыя вядомыя вам творы? (*У вершы ўвесь час нешта параўноўваецца. Адзін радок паўтараецца па некалькі разоў.)*

4. Самастойнае чытанне твора вучнямі

5. Аналіз мастацкага твора, пошук аўтара

– Назавіце яшчэ раз, каму і чаму вясна падарыла белы колер. *(Выслухоўваюцца вучнёўскія адказы.)*

– Ці бачылі вы шаўковую тканіну? Якая яна? *(Бліскучая, прыгожая. Калісьці шаўковыя сукенкі адзявалі толькі на святы.)*

– Чаму і рунь, і мурожны лужок, і маладзенькі лянок напамінаюць шоўк? *(Рунь густая, зялёная, сакавітая. Яна аж пераліваецца пад яркім вясновым сонцам.)*

– Перачытайце дзве наступныя страфы. Заўважце, пра якія галасы вясны гаворыць аўтар. (*Салаўі пяюць, ручаі звіняць, пчолка гудзе…*)

– Якая ж па настроі песня, якую пяюць і салавей, і дрозд, і ручай, і працавітая пчолка? *(Вясёлая, светлая, бадзёрая, жыццярадасная.)*

– Якія словы паказваюць, што аўтар любіць вясну, дзівіцца з яе прыгажосці? *(Ён ужывае «ласкавыя» словы: бярозка, садок, матылёк, лужок, пчолка… Паэт захапляецца вясною, радасна ўскліквае: «Ах, вясна, маладая мая!..»)*

– Сёння на ўроку мы многа разоў ужывалі слова «маладая вясна». Чаму вясна «маладая»? *(У гэты час нідзе няма ніводнай сухой травінкі, пажоўклага лісціка. Усё буйна расце і цвіце. А яшчэ «маладой» называюць нявесту на вяселлі. Вясна – як нявеста.)*

– Калі гаварыць пра колеры, якая вясна ў Змітрака Бядулі? *(Белая і зялёная.)*

– Цікава, што асноўныя колеры вясны заўважылі і іншыя нашы вядомыя пісьменнікі. Напрыклад, Янка Брыль піша ў адным з апавяданняў: «Лунае ў прасторы задушэўная песня пра нашу бела-зялёную вясну». (Сказ можна ўспомніць і запісаць на ўроку беларускай мовы.)

– А якая вясна, калі мець на ўвазе гукі? *(Звонкая, шумная, гаманлівая.)*

– Ці можна ўсе словы, якімі мы называлі колеры і гукі вясны, замяніць азначэннем «маладая»? *(Так, можна. Маладая – гэта і пявучая, і сонечная, і вясёлая.)*

– Заўважце, як удала выбраў патрэбнае слова Змітрок Бядуля. Калі будзеце чытаць творы іншых пісьменнікаў пра вясну, абавязкова звярніце ўвагу на тое, якія азначэнні даюцца гэтай пары года.

6. Практыкаванні ў выразным чытанні твора

7. Дамашняе заданне:

а) вывучыць верш Змітрака Бядулі на памяць;

б) падрыхтаваць вусныя вызванні на тэму «Якога колеру вясна» ці «Галасы вясны».

### *Верш Канстанцыі Буйло «Люблю наш край»*

Люблю наш край – старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла,
Дзе першы раз спазнала шчасце,
Слязу нядолі праліла.

У чым магічная сіла паэтычных радкоў Канстанцыі Буйло? У вершы ж няма ні яркіх метафар, ні вобразных параўнанняў. Усё названа сваімі імёнамі. Паэтэса нічога не прыдумляе, не ўпрыгожвае верш. Чаму ж адразу, як толькі пачуеш такія дарагія гукі і словы, цябе ахоплівае хваляванне, замілаванасць, душа адкрываецца для любові? Мелодыя? Думаецца, не толькі, хоць спалучэнне музыкі і слоў надзвычай гарманічнае. Усё ж «у пачатку было слова», у нашым выпадку – верш на той час маладой беларускай паэтэсы Канстанцыі Буйло, адметнасцю якога з’яўляецца гранічная шчырасць, душэўнасць, натуральнасць паэтычнага слова. Чытаючы верш, мы адчуваем любоў да радзімы ў яе канкрэтным, а не абстрактным уяўленні. Радзіма тут – не ў значэнні ‘дзяржава’. Для паэтэсы – гэта хаты, лес, поле, жнеі... У вершы пра радзіму гэтае слова не прысутнічае зусім. Паэтэса нібы саромеецца яго. «Люблю *наш край...*» – больш сціпла, ціха, прыземлена, але ў той жа час больш даверліва і шчыра. Пачуццё суперажывання надае прыналежны займеннік *наш* у першым радку. Канстанцыя Буйло не заклікае любіць радзіму, яна гаворыць пра сваю да яе любоў. Калі слухаеш вядомую песню на словы Канстанцыі Буйло ці ўчытваешся ў яе паэтычныя радкі, дзіўная рэч, у цябе няма адчування, што гэта верш-прызнанне маладога, але ўжо вядомага на тую пару паэта. Складваецца ўражанне, што пра свае пачуцці гаворыць захопленая прыгажосцю вясковая дзяўчынка-падлетак. Прынамсі, такое адчуванне спадарожнічала аўтару гэтай кнігі ў дзяцінстве. Прызнаюся, што яно не знікла да гэтага часу, бо чысціня і шчырасць у вершы на самай справе дзіцячая, непадробная.

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець ідэйна-эстэтычны змест верша Канстанцыі Буйло «Люблю наш край»; вучыць пачынаючых чытачоў бачыць асобу аўтара;

– фарміраваць уменне вызначаць танальнасць верша, яго агульны настрой;

– дапамагчы вучням зразумець, што кожнае ўжытае аўтарам слова ў высокамастацкім творы незаменнае і нясе вобразную нагрузку;

– выхоўваць цікавасць да паэзіі, павагу да пісьменніцкай працы, пачуццё гонару за беларускую нацыянальную літаратуру.

***Парадак працы***

1. Уступнае слова настаўніка

– У адзін час з Янкам Купалам і Якубам Коласам жылі і іншыя вядомыя творцы. Адзін з іх – паэтэса Канстанцыя Буйло. Яна пражыла доўгае жыццё, але, на жаль, толькі трэць яго – на Беларусі. Нарадзілася будучая паэтэса ў 1897 годзе ў Вільні. Бацькі гадавалі сямёра дзяцей. Ужо ў шаснаццацігадовым узросце Канстанцыя Буйло надрукавала ў «Нашай ніве» верш «Хвоя», а яе першую кніжку «Курганная кветка» рэдагаваў сам Янка Купала. Многія вершы паэтэсы сталі песнямі, а найбольшую вядомасць набыў напісаны ў 1919 годзе верш «Люблю наш край», які стаў народнай песняй. Мы абавязкова паслухаем сёння песню на словы Канстанцыі Буйло, але спачатку я хачу прачытаць вам яе верш.

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

3. Аналіз першаснага ўспрымання

– Якое слова паўтараецца ў творы часцей за ўсё? (*Слова «люблю».)*

– За што паэтэса любіць свой край? *(Выслухоўваюцца адказы вучняў.)*

4. Самастойнае чытанне верша вучнямі, падрыхтоўка да асэнсаванага чытання ўслых

5. Аналіз твора, практыкаванні ў выразным чытанні

– Дзе, на вашу думку, расла будучая паэтэса? *(Канстанцыя Буйло вырасла ў вёсцы.)*

– Адкуль гэта бачна*? (Сустракаюцца словы «хаты», «палі», «нівы», «жнеі», «садзік».)*

– Так, Канстанцыя Буйло, як і Якуб Колас, расла сярод прыроды. Яе бацька быў арандатарам, лясным аб’ездчыкам.

– Падрыхтуйцеся да чытання трох першых строф. Падумайце, якія пачуцці неабходна данесці да слухача. *(Выслухоўваецца некалькі чытальнікаў.)*

– Падумайце, што магло быць для паэтэсы першым спазнаным у жыцці шчасцем. Ці памятаеце вы той дзень, калі ўпершыню адчулі сябе шчаслівымі? Што магло азмрочыць дзіцячую радасць? *(Выслухоўваюцца адказы вучняў на кожнае з пастаўленых пытанняў.)*

– Мне здаецца, што «сляза нядолі» ў паэткі – гэта найперш вайна, час, калі давялося надоўга пакідаць родныя месцы. Ды і ў мірным жыцці радасць і бяда вельмі часта суседнічаюць. Для паэтэсы вельмі важна, што першыя радасці і першыя засмучэнні адбываліся менавіта тут.

6. Асэнсаванне ідэйна-эстэтычнага зместу твора, «пошук аўтара»

– Якія радкі ў вершы паўтараюцца двойчы, амаль без змен? *(Вучні знаходзяць і чытаюць радкі:*

*Дзе першы раз спаткала шчасце,*
*Слязу нядолі праліла.*
*Дзе з першым шчасцем я спазналась*
*І з першай горкаю слязой.)*

– Якія словы ў гэтых радках самыя важныя? *(«Першы раз», «з першым шчасцем», «з першай слязой».)*

– Чаму вы так вырашылі? *(Выслухоўваюцца адказы вучняў.)*

– Тут, у родным краі, пачула паэтэса першую песню і казку, упершыню залюбавалася залатым колерам хлебнага поля. Чалавек ніколі не павінен забываць зямлю бацькоў, той куток, дзе нарадзіўся, з якога пачалося пазнанне вялікага свету.

7. Выразнае чытанне ўсяго верша

Перад выразным чытаннем усяго верша вучні зноў называюць ключавыя словы: «люблю», «у першы раз».

8. Абагульняльная гутарка

– Дадзены верш неўзабаве пасля напісання стаў песняй, якую з задавальненнем слухае кожны беларус. Чаму? Як вы думаеце? *(Дзеці гавораць пра меладычнасць верша, паўторы, пра тое, што ў самім вершы ёсць словы пра родную песню.)*

– Якая ж яна, народная песня, што гэтак уразіла чулае сэрца паэткі? *(Яшчэ раз цытуюцца радкі:*

*Гукі звонкія над нівай*
*Пераліваюцца, плывуць.)*

– Беларуская песня прыгожая, звонкая, задушэўная. А цяпер у нас ёсць магчымасць паслухаць песню кампазітара Міколы Равінскага на верш Канстанцыі Буйло «Люблю наш край».

9. Праслухоўванне песні

Дзеці напаўголасу спяваюць разам з выканаўцамі. Хто саромеецца – проста слухае.

10. Дамашняе заданне

Вывучыць верш на памяць.

### *Верш Петруся Броўкі «Восень»*

Непрыкметна зусім
Праплыве павуцінкай,
Гляне жоўтым лістком
З-пад зялёнай хусцінкі.

Многія пакаленні вучняў з задавальненнем, душэўнай радасцю чытаюць гэты верш Петруся Броўкі, у якім намаляваны жывыя партрэты восені, што пачала свой шлях, калі «адспявала калоссе», і завершыць яго разам з апошнім сарваным ветрам лістком.

***Мэты:***

– дапамагчы малодшым школьнікам зразумець эстэтычны змест верша «Восень»;

– фарміравань уменне вызначаць агульны эмацыянальны настрой верша;

– паказаць ролю вобразных сродкаў мовы (эпітэты, параўнанні, метафары) у абмалёўцы мастацкага вобраза;

– выклікаць у дзяцей захапленне прыгажосцю прыроды, жаданне назіраць і бачыць вакол сябе яе хараство.

***Парадак працы***

1. Падрыхтоўка да асэнсаванага ўспрымання верша

На рабочым стале настаўніка ў прыгожай вазе стаяць акуратна зрэзаныя ў час экскурсіі галінкі з гронкамі рабіны ці каліны, букеты з лісця клёна і дуба. Гірлянда featureнакаляровага лісця расцягнута паверх класнай дошкі.

Перад чытаннем дарэчы будзе выкарыстаць рэпрадукцыю карціны Ісака Левітана «Залатая восень», а таксама восеньскія пейзажы айчынных мастакоў. Уражанні ад карцін дапаўняюцца ўражаннямі ад нядаўняй экскурсіі. Настаўнік імкнецца ажывіць у дзіцячай памяці найбольш выразныя малюнкі. Разам з дзецьмі ён успамінае прасветленасць і чысціню паветра, блакіт неба і птушыныя чароды, павуціну на баразне, пахі, гукі восеньскага лесу і поля.

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

Настаўнік чытае верш на памяць. Яго чытанне суправаджаецца нягучнай музыкай. Гэта спрыяе стварэнню ў дзяцей адпаведнага настрою.

3. Высвятленне эмацыянальнага ўздзеяння твора на вучняў

– Мастак малюе восень фарбамі, кампазітар перадае восеньскі настрой у музыцы з дапамогай гукаў, а ў паэта не менш цяжкая і адказная задача – знайсці такія словы, каб мы, чытачы, убачылі і пачулі восень. Як вы думаеце, ці ўдалося гэта зрабіць Петрусю Броўку? *(Дзеці дзеляцца сваімі ўражаннямі ад праслуханага.)*

– Які настрой выклікае верш? *(Верш сумны, бо канчаецца лета.)*

– Атрымліваецца, што паэт не рады, яму не падабаецца восень? Прачытайце верш яшчэ раз і падумайце, ці так гэта.

3. Паўторнае чытанне верша вучнямі

– Адкажыце яшчэ раз на пытанне: які агульны настрой верша? *(У вершы не толькі сум, але і захапленне, нават радасць.)*

4. Аналіз верша, практыкаванні ў выразным чытанні__

– Радасць, захапленне паэта ідзе ад таго, што ў восені свая, непаўторная прыгажосць. Сум – ад усведамлення, што ўсё гэта хутка пройдзе, а наперадзе восеньская непагадзь. Можна сказаць, што сум у паэта светлы, нават урачысты. Пятрусь Броўка шчыра дзеліцца з чытачамі тым, што ён адкрыў у прыродзе для сябе, што напоўніла яго сэрца прыгажосцю. Восень у яго – жывая істота. Давайце разам пашукаем словы, якія дапамагаюць гэта адчуць. *(Дзеці перачытваюць твор напаўголасу, вылучаюць дзеясловы, якія малююць лёгкі, але настойлівы поступ восені-чарадзейкі.)*

– Уявіце на момант, што пра ўсё гэта напісаў бы не паэт. Ён проста пералічыў бы прыкметы восені. Якія напрыклад? *(Ляціць павуціна, жаўцее лісце на дрэвах, над вадою падымаецца туман, на палях капаюць бульбу, пачынае чырванець рабіна, птушкі адлятаюць у вырай.)*

– Правільна. І ўсё гэта кожнаму з нас даводзілася назіраць многа разоў. Але для паэта мала назваць усім вядомыя прыкметы восені і зарыфмаваць іх. Ён прапануе нам спыніцца, угледзецца, зірнуць на свет яго вачыма. І мы здзіўляемся: як цудоўна! Мне цікава, якія думкі выклікаў у вас кожны са створаных пры дапамозе слова паэтычных малюнкаў. Перачытайце першую страфу і скажыце, як называецца той час, калі ў паветры праплывае павуціна. *(Бабіна лета.)*

– Восень праплывае павуцінай. Ці не праўда, прыгожа? Павуціна плыве павольна над самай зямлёю. Успомніце, які вядомы паэт пісаў пра гэта. *(Якуб Колас. «На ніцях белай павуціны праводзяць восень павучкі...»)*

– З чым аўтар параўноўвае адзенне дрэў. *(З зялёнай хусцінкай.)*

– Паназірайце, калі ласка, ці выглянуў жоўты лісток з-пад зялёнай хусцінкі бярозы, што расце каля школы.

– Прачытайце наступнае чатырохрадкоўе і скажыце, які малюнак кожны з вас уяўляе, чытаючы паэтава: «Усплыве туманом // Над рачулкаю соннай». *(Выслухоўваюцца вучнёўскія адказы.)*

– Чаму рачулка сонная? На што падобны туман? Чаму аўтар піша «устрывожыць дымком»? *(Выслухоўваюцца адказы на кожнае з пастаўленых настаўнікам пытанняў.)*

– Мне здаецца, што ў гэтым вершы паэт узгадвае сваё дзяцінства. Памяць дзяцінства не можа не хваляваць кожнага дарослага чалавека, тым больш паэта, на працягу ўсяго жыцця.

**З. М.** Калі гэтая памяць блізкая настаўніку, няхай і ён «устрывожыць» яе, раскажа дзецям пра смак спечанай у прысаку бульбы.

– З чым паэт параўноўвае колер рабіны? Якое слова дапамагае нам зразумець, што рабіна вельмі падабаецца паэту*? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.)*

5. Выразнае чытанне ўсяго верша

Папярэдне пазначаюцца паўзы (пасля кожнага вобраза-малюнка). Увага скіроўваецца на тое, што ў кожнай страфе ёсць словы, якія указваюць на запаволены тэмп чытання: «непрыкметна», «праплыве», «над рачулкаю соннай».

6. Асэнсаванне аўтарскай задумы, «пошук аўтара»

– Дакажыце словамі верша, што паэту падабаецца восень.

Каб падмацаваць свае адказы, вучні шукаюць словы з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі: «павуцінкай», «лістком», «хусцінкай», «рачулкаю», «дымком». Пра захапленне аўтара гэтаю парою года гавораць і дзеясловы: «устрывожыць», «зачаруе». Нарэшце, на гэта ўказваюць і заключныя радкі:

Ды не знаю, чаму
Ты мне, восень, па сэрцу!

7. Дамашняе заданне

Вывучыць верш на памяць.

***Верш Кастуся Кірэенкі «На санках»***

Які сягоння
Коўзкі снег!
Як лёгка
З ветрам дужацца!
Ніпто не спыніць
Санак бег,
Хоць і галовы кружацца...

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець эстэтычны змест верша Кастуся Кірэенкі «На санках»;

– вучыць дзяцей правільнаму інтаніраванню клічных сказаў;

– дапамагчы вучням зразумець, што кожнае ўжытае паэтам слова найлепшым чынам адпавядае кантэксту і з’яўляецца незаменным;

– вучыць дзяцей выказваць свае ўражанні, абапіраючыся на тэкст твора, развіваць маўленчую практыку малодшых школьнікаў.

***Парадак працы***

1. Падрыхтоўка да асэнсаванага ўспрымання твора

**З. М.** Ні ўступнае слова настаўніка, ні гутарка па пытаннях у дадзеным выпадку не дапамаглі б класу настроіцца на ўспрыманне верша. Найлепшы варыянт уступнай працы – праслухоўванне дамашніх міні-сачыненняў «З гары», «На санках з гары». У такіх сачыненнях можна пачуць і пра бліскучы снег, і пра свіст ветру ў вушах, і пра перакуленыя санкі. Дзеці «змагаюцца з ветрам», «ляцяць насустрач ветру», «ладзяць санныя цягнікі», «з разгону трапляюць у снежныя гурбы», адчайна «ідуць на таран…». Фантазіі няма межаў. Асобныя выказванні вызначаюцца дзіцячай непасрэднасцю, арыгінальнасцю погляду.

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

Настаўнік чытае верш Кастуся Кірэенкі, імкнучыся перадаць пачуццё руху, шчаслівага ўзбуджэння.

3. Аналіз першаснага ўспрымання

– Што вы ўяўлялі, слухаючы верш Кастуся Кірэенкі? (Выслухоўваюцца звязныя выказванні вучняў.)

4. Самастойнае чытанне верша вучнямі, падрыхтоўка да асэнсаванага чытання ўслых

5. Аналіз верша, адпрацоўка выразнага чытання

– Як трэба чытаць гэты верш? *(Весела, бадзёра, жыццярадасна.)*

– Чаму вы так лічыце? *(На гары ніколі не бывае сумна. Усе стараюцца хутчэй падняцца ўверх, каб праз хвіліну падаць уніз.)*

– Чаму ўсё ж такі ў дзяцей асабліва прыўзняты настрой? Ці толькі таму, што ехаць на санках з гары вельмі прыемна? *(Дзецям трохі страшнавата. Паэт піша, што ў іх «галовы кружацца». А калі страшна, але адзін раз не пабаяўся, – тады вельмі прыемна.)*

– Іншы раз, адказваючы на пытанне «Як вы правялі зімовыя канікулы?», вучні пішуць: «спускаліся з гары», «каталіся з гары», «з’язджалі на санках з гары». А якія словы выкарыстаў Кастусь Кірэенка? *(Імчым, ляцім.)*

– Чаму, як вы лічыце? *(Гара вельмі крутая, санкі ляцяць.)*

– Але ж можна было ўжыць слова «нясуцца», яно таксама паказвае на хуткасць, імгненнасць. *(Слова «нясуцца» доўгае, а яшчэ санкі вельмі лёгкія, яны, здаецца, не дакранаюцца да зямлі, «ляцяць» у паветры.)*

– Заўважце, першыя дзве страфы быццам вымаўлены дзецьмі, якія толькі што зляцелі з гары. Яшчэ не перавёўшы дыханне, яны ўсклікваюць здзіўлена і задаволена: «Які сягоння коўзкі снег!» Паспрабуйце прачытаць першыя чатыры радкі так, нібыта вы самі толькі што спусціліся з гары. *(Праводзяцца практыкаванні ў выразным чытанні.)*

– Дык чаму ж уся зямля для дзетвары здаецца бязмежнай? *(Дзеці могуць з'ехаць з самай крутой гары. Няма межаў іхняй радасці. Калі чытаеш гэты верш, хочацца хутчэй ухапіць санкі і бегчы на гару.)*

– Бывае такое адчуванне, што хочацца спяваць, гукаць нешта і бегчы ўдалечыню.

**З. М.** Аналізуючы верш, настаўнік і дзеці неаднойчы звярталіся да выразнага чытання. Без правільна выбранай інтанацыі ніяк нельга было б паказаць агульны ўзнёслы настрой верша. З шасці сказаў, якія ён утрымлівае, – чатыры клічныя. У той жа час, рыхтуючы дзяцей – на працягу ўсяго ўрока – да выразнага чытання, чытаючы і перачытваючы твор, важна не збіцца на залішнюю патэтыку. Першыя два сказы – гэта захапленне, радасць, магчыма, здзіўленне. «З дарогі, гурбы снежныя!» – пераможны кліч-папярэджанне. Інтанацыя апошняга сказа павінна перадаць задавальненне, паўнату жыцця.

6. Асэнсаванне эстэтычнага зместу твора, «пошук аўтара»

– Што хацеў перадаць у вершы Кастусь Кірэенка? Што вы можаце сказаць пра аўтара верша? *(Паэт захапляецца разам з дзецьмі, уяўляе сябе на іх месцы, успамінае сваё маленства; паэту хораша ад таго, што вакол столькі весялосці; ён рады за дзяцей.)*

7. Практыкаванні ў выразным чытанні верша; завучванне верша на памяць

8. Дамашняе заданне

Падрыхтавацца да выразнага чытання верша або вывучыць яго на памяць (па жаданні вучняў).

### *Верш Максіма Танка «Чаму птушкі лётаюць»*

Уся зямля гарыць у майскай квецені.
Колькі год я па ёй вандраваў!
А сёння спыніўся:
як жа ісці
Па вуснах пявучых траў,
Па жывых, раскрытых вачах лотаці?
Дык вось чаму птушкі лётаюць!

Глыбокім лірызмам, спалучэннем думкі і пачуцця вылучаюцца творы Максіма Танка, нястомнага адкрывальніка таямніц роднага беларускага свету. У прыведзеным вершы ўсяго сем радкоў. Наўрад ці ёсць неабходнасць працаваць з ім на працягу цэлага ўрока, тым не менш памылкай будзе не заўважыць гэты твор ці прачытаць яго паспешліва. «Чаму птушкі лётаюць?» – характэрны ўзор філасофскай лірыкі Максіма

Танка. З яго пачнецца далучэнне пачынаючых чытачоў да духоўнай скарбніцы знакамітага паэта, шырока прадстаўленай у старэйшых класах.

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець ідэйна-эстэтычны змест верша Максіма Танка «Чаму птушкі лётаюць»;

– спрыяць развіццю ўзнаўляльнага і творчага ўяўлення малодшых школьнікаў, вучыць дзяцей бачыць і пачуццёва ўспрымаць створаныя аўтарам малюнкі прыроды;

– паказаць ролю вобразных сродкаў мовы (метафары, параўнанні) і сродкаў сінтаксічнай выразнасці (паўторы, рытарычныя пытанні) ў стварэнні мастацкага вобраза;

– вучыць пачынаючага чытача «бачыць асобу аўтара, разумець аўтарскую пазіцыю»;

– выхоўваць цікавасць да паэзіі, павагу да пісьменніцкай працы, пачуццё гонару за беларускую нацыянальную літаратуру.

***Парадак працы***

1. Уступная гутарка

Якія творы Максіма Танка вам знаёмы? *(Казкі «Галінка і верабей», «Жук і слімак»* і іншыя творы.)

– На сённяшнім уроку мы з вамі пазнаёмімся з «сур'ёзным» вершам Максіма Танка «Чаму птушкі лётаюць?» Вывешваецца партрэт паэта. Вучні ўглядаюцца ў рысы сталага, мудрага пяражытым паэта.

**З. М.** Гэта пажадана рабіць кожны раз, калі чытаюцца творы аўтараў, з якімі вучні неаднойчы сустрэнуцца на ўроках беларускай літаратуры ў наступныя гады навучання. Звяртацца да партрэта тым больш мэтазгодна, калі дзеянне перадаецца ад першай асобы.

– Ці задумваліся вы над тым, чаму птушкі лётаюць? *(Таму што ў птушак ёсць крылы. Таму што іх косці напоўнены паветрам. У большасці птушак вельмі слабыя ногі. Зверху лепш відаць здабычу...)*

– Усё гэта правільна. Калі б мы запыталі пра гэта ў арнітолагаў (людзей, якія вывучаюць жыццё і паводзіны птушак), яны расказалі б нам пра іх паводзіны многа цікавага. Але давайце паслухаем, як адказаў на пастаўленае пытанне *паэт*.

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

3. Праверка першаснага ўспрымання

– Дык чаму птушкі лётаюць? *(Выслухоўваюцца адказы вучняў.)*

**З. М.** Хутчэй за ўсё, у кожным класе знойдуцца вучні, якія прагледзелі верш раней і зразумелі, што птушкам шкада таптаць кветкі і траву. Тым не менш такі «правільны» адказ не пазбаўляе ад неабходнасці паўней, глыбей раскрыць эстэтычны змест дадзенага твора.

4. Самастойнае чытанне верша вучнямі

Настаўнік просіць вучняў перачытаць верш напаўголасу, не спяшаючыся, правільна выгаворваючы кожнае слова.

5. Аналіз твора, практыкаванні ў выразным чытанні

Пасля гэтага ўвага засяроджваецца на першым радку.

– Як добра было б, калі б мы з вамі апынуліся цяпер на лузе. «Уся зямля гарыць у майскай квецені...» Што мае на ўвазе аўтар? *(У гэты час на лузе заўсёды многа кветак, зелянеюць няскошаныя травы.)*

– Што яшчэ можна ўбачыць і пачуць? *(У паветры не заціхаюць галасы птушак. Лятаюць прыгожыя матылькі. Гудуць пчолы і паласатыя чмялі.)*

– Жаўранак завіснуў над лугам і расказвае нам у сваёй песні пра тое, якая прыгожая наша зямля. У чыстым ў небе, у кронах высокіх дрэў, у кустах спяваюць іншыя птушкі. Некаторыя з іх ніколі не апускаюцца на зямлю.

– Адкажыце радкамі верша, чаму спыніўся паэт. *(«Як жа ісці // Па вуснах пявучых траў, // Па жывых, раскрытых вачах лотаці?»)*

– Перачытайце гэтыя радкі моўчкі, падрыхтуйцеся прачытаць услых. Якія пачуцці неабходна перадаць пры чытанні? *(Вучні адказваюць на пастаўленае настаўнікам пытанне, практыкуюцца ў выразным чытанні твора.)*

– Раскрытыя бутоны, пяшчотныя пялёсткі Максім Танк назваў вуснамі траў. Якія гэта вусны? *(Духмяныя, зялёныя, мядовыя, пахучыя, пяшчотныя.)*

– Пра што ж пяюць травы на лузе сваімі пяшчотнымі вуснамі, калі раптам павее ветрык? *(Яны дзякуюць сонцу за цяпло. Травы і кветкі радуюцца жыццю.)*

– Давайце крыху паразважаем. Скажыце, як можна назваць раскінутыя ўбакі зялёныя лісты, часам прадаўгаватыя, выцягнутыя, іншым разам акруглыя, увогнутыя. На іх перакачваюцца раніцай празрыстыя кропелькі расы. *(Іх можна назваць далонямі, далонькамі.)*

– Якога колеру гэтыя далоні? *(Зялёнага колеру.)*

– А ці бачыў хто з вас, дзеці, лотаць? Якая яна? *(Лотаць расце на нізкіх месцах, у яе яркія жоўтыя кветкі.)*

– Якімі вачыма будзе глядзець на нас лотаць? *(Жоўтымі вачыма.)*

– Знайдзіце і прачытайце, як піша пра гэта Максім Танк. *(«Па жывых. раскрытых вачах лотаці...»)*

– Звярніце ўвагу: паэт гаворыць пра травы і кветкі, як пра жывыя істоты. Адкажыце, калі ласка, якімі вачыма глядзяць у блакітнае неба валошкі, званочкі, рамонкі. *(Васільковымі, жоўтымі, сінімі.)*

– Які ж адказ знайшоў аўтар на сваё пытанне? *(Выслухоўваюцца звязныя выказванні вучняў.)*

– Чалавек заўсёды абагаўляе хараство прыроды, захапляецца ім. У прыродзе ўсё разумна і мудра. Застаецца толькі любавацца гэтым хараством, каб багацець душою.

– Якое спалучэнне слоў неабходна выдзеліць у апошнім сказе? *(«...дык вось чаму...»)*

5. Выразнае чытанне ўсяго верша

– Уявіце, што гэтае паэтычнае адкрыццё зрабілі вы самі і цяпер хочаце падзяліцца ім з іншымі. Неабходна звярнуць увагу на працяглыя паўзы пасля трэцяга радка і перад заключным радком.

6. «Пошук аўтара», высвятленне аўтарскай пазіцыі

– Што вы можаце сказаць пра аўтара верша «Чаму птушкі лётаюць»? (Ён вельмі любіць прыроду. Ён вельмі назіральны. *А яшчэ ён заўсёды думае над тым, што бачыць. Паэт увесь час здзіўляецца...)*

– Толькі вельмі ўражлівы чалавек, толькі паэт можа пачуць, як расце трава, можа ўбачыць вусны траў і вочы кветак. У адным са сваіх вершаў Максім Танк піша, што ён сябруе з вятрамі, птушкамі і зорамі, што ў госці да яго прыходзяць не толькі людзі, але і дрэвы, кветкі. Яму нельга не паверыць.

7. Дамашняе заданне

Вывучыць верш на памяць.

**З. М.** Адбылася яшчэ адна сустрэча з сапраўднай Паэзіяй. Восем радкоў класічнага верша, у гэтым мы пераканаsucc, пераважаць па сіле ўздзеяння дзясяткі невыразных старонак пра беражлівыя адносіны да прыроды, западуць у чуллівыя дзіцячыя сэрцы і знойдуць там водгук. Верш Максіма Танка зрабіў пачынаючых чытачоў багацейшымі на яшчэ адно паэтычнае адкрыццё свету.

### *Верш Сяргея Грахоўскага «Чалавеку патрэбна не слава...»*

Чалавеку патрэбна не слава,
А людская ўвага і ласка,
І сардэчнае шчырае слова,
І вясёлая добрая казка...

Вершы Сяргея Грахоўскага напоўнены глыбокім роздумам пра людскае ў чалавеку. Пры гэтым глыбока ўражвае дакладнасць, яснасць у выказванні думак. Нездарма ж нават некаторыя «дарослыя» вершы Сяргея Грахоўскага ўключаны ў падручнікі для пачатковай школы. Прыкладам сказанаму вышэй служыць верш «Чалавеку патрэбна не слава...»

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець ідэйна-эстэтычны змест верша Сяргея Грахоўскага «Чалавеку патрэбна не слава...»;

– зацікавіць малодшых школьнікаў жыццём і творчасцю паэта;

– вучыць дзяцей выказваць свае ўражанні, дыскутаваць, даказваць правамернасць сваіх поглядаў, абапіраючыся на тэкст твора;

– вучыць пачынаючага чытача «бачыць асобу аўтара», разумець аўтарскую пазіцыю;

– выхоўваць пачуццё дабрыні, шчырасці, бескарыслівасці.

***Парадак працы***

1. Уступнае слова настаўніка

– Свой першы верш Сяргей Грахоўскі надрукаваў у трынаццацігадовым узросце (1926). Працяглы час ён быў рэдактарам часопіса «Вясёлка». Па ілжывым абвінавачванні паэт быў рэпрэсаваны і жыў далёка ад дому. Сваю першую кнігу Сяргей Іванавіч пабачыў ажно праз сорак пяць гадоў пасля таго, як парадаваўся першаму вершу. Пасля гэтага напісаў яшчэ многа кніг для дзяцей і дарослых, пражыў доўгае і складанае жыццё.

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

Чытанне завяршаецца працяглай псіхалагічнай паўзай. Настаўнік нібы сам удумваецца ў апошнія радкі.

3. Высвятленне эмацыянальнага ўздзеяння твора на вучняў

– Якую якасць чалавека Сяргей Грахоўскі лічыць самай важнай? *(Выслухоўваюцца вучнёўскія адказы.)*

4. Самастойнае чытанне верша вучнямі

5. Аналіз верша, практыкаванні ў выразным чытанні

**З. М.** Зробім некалькі заўваг, якія могуць быць карыснымі пры выпрацоўцы навыку выразнага чытання верша Сяргея Грахоўскага.

Па-першае, трэба звярнуць увагу на інверсію ў першай і чацвёртай страфе. Яе аўтар выкарыстоўвае для таго, каб сэнсава найбольш значнае слова стала ў канец вершаванага радка і рыфмавалася:

Чалавеку патрэбна *не слава*...
Каб сяброў сустракаў *клапатлівых*...

Аўтарскую думку ўзмацняе таксама парадак слоў у радках, што нясуць значную сэнсавую нагрузку:

Чалавеку *не толькі спагада,* –
*Дабрата* чалавеку патрэбна...

Па-другое, важкую сэнсавую нагрузку нясе таксама працяглая паўза, што падзяляе гэтыя радкі. Яна асабліва заўважная ў спакойнай плыні аднародных даданых членаў сказа.

Напаследак заўважым, што азначэнні ў трэцім і чацвёртым радку не раздзелены коскамі. Аўтар не лічыць іх аднароднымі

– Падрыхтуйцеся да чытання ўслых першай страфы. *(Выслухоўваюцца некалькі чытальнікаў. Настаўнік робіць неабходныя заўвагі.)*

– Якое слова патрэбна чалавеку? *(Сардэчнае, шчырае, ласкавае, добрае, спагадлівае, пяшчотнае, цёплае слова.)*

– Як вы разумееце значэнне слова «шчыры». *(Праўдзівы, душэўны, пазбаўлены прытворства.)*

Падрыхтуйцеся да выразнага чытання другой страфы. *(Пасля адпаведнай падрыхтоўкі вучні чытаюць услых:*

Чалавеку патрэбна ўсмешка
Незнаёмых вачэй і знаёмых,
Каб дажджамі размытая сцежка
Стала лёгкай на кручах і стромах.)

– З чым, на вашу думку, параўноўвае паэт чалавечае жыццё?

**З. М.** Правільны адказ утрымліваецца ў самім вершы. Магчыма і такое, што вучні ўжо сустракаліся з гэтай агульнапаэтычнай метафарай: чалавечае жыццё – гэта сцежка.

– Па якой сцежцы цяжка ісці? *(Па пясчанай, размытай дажджамі.)*

– А якія яшчэ перашкоды падпільноўваюць чалавека на гэтай сцежцы? Знайдзіце і прачытайце. *(Кручы, стромы, прорвы і спады.)*

– Мне хочацца ведаць, ці дакладна вы разумееце значэнне гэтых слоў. *(Высвятляецца прамое лексічнае значэнне кожнага слова, бо без гэтага цяжка зразумець іх вобразны змест:*

*круча – круты спуск, абрыў;*
*строма – круты схіл, абрыў;*
*прорва – тут глыбокі абрыў, бездань;*
*спад – абрыў, круча, схіл.)*

– Бачыце, якая багатая наша беларуская мова. І гэта нават не ўсе словы, што маюць значэнне ‘круты спуск ці абрыў’. Якую мэту ставіў паэт, ужываючы іх, пра што ён хацеў нас папярэдзіць? *(Пра тое, што ў жыцці чалавека бывае многа непрыемнасцей, яно не заўсёды простае.)*

– Упарта пераадольваючы на сваёй жыццёвай сцежцы прорвы і спады, чалавек узбіраецца на стромкія грэбні. Як вы разумееце значэнне слова *грэбні*? *(Гэта вяршыні, на якія цяжка ўзысці.)*

– А што мае на ўвазе паэт, калі піша пра гэта? *(Узабрацца на грэбень – значыць дабіцца поспеху, нейкай перамогі ў жыцці, спраўдзіць сваю мару.)*

– Што ж дапамагае чалавеку на размытай дажджамі сцежцы пераадольваць перашкоды і падымацца на стромкія грэбні? *(Яму дапамагае людская дабрата.)*

– Прачытайце, як выдатна пра гэта сказаў паэт. *(Вучні чытаюць трэцюю і чацвёртую строфы.)*

6. Асэнсаванне ідэйна-эстэтычнага зместу твора, «пошук аўтара»_

– Калі чалавек шчаслівы? *(Чалавек заўсёды шчаслівы, калі прыносіць шчасце іншым. Толькі добры чалавек можа быць шчаслівым. Добры чалавек заўсёды клапоціцца пра іншых, і гэта прыносіць яму задавальненне.)*

– Для чаго ж Сяргей Грахоўскі склаў гэты верш, што ён хацеў нам сказаць? *(Ён хацеў пераканаць нас у тым, што што самая каштоўная чалавечая якасць – дабрата. Яна патрэбна ў жыцці кожнаму, але кожны з нас таксама абавязаны дарыць дабрату людзям, дапамагаць ім стаць шчаслівымі.)*

– Добрае слова, велікадушны ўчынак, спагадлівасць і дабрыня выратавалі не аднаго чалавека. Нездарма кажуць, што, пакуль існуе дабрыня, да той пары будзе існаваць свет. Часам, калі чалавек трапляе ў бяду, зусім незнаёмыя людзі прыходзяць яму на дапамогу.

7. Заключная гутарка

– Мы з вамі, дзеці, ніколі не сустракаліся з Сяргеем Грахоўскім, мала знаем пра яго жыццё, але, пазнаёміўшыся з вершам, тым самым больш даведаліся і пра самога паэта. Ці ж не так? Як вы думаеце, гэты верш напісаны паэтам у маладым ці ўжо ў сталым узросце? *(Верш напісаў немалады паэт.)*

– Чаму? *(Ён многа ведае пра жыццё, напэўна, многа пабачыў і перажыў.)*

– Што яшчэ вы можаце сказаць? *(Паэт не імкнецца да славы. Найвышэй у чалавеку Сяргей Грахоўскі цэніць дабрату.)*

– Вялікае дзякуй вам за працу на ўроку. Добра запомніце ўсё тое, пра што гаварылася.

8. Дамашняе заданне

Падрыхтавацца да выразнага чытання верша.

***Верш Генадзя Бураўкіна «Край мой»***

Не залаты зусім,
не срэбны
Быў на табе заўсёды ўбор,
Звычайны самы, самы зрэбны:
Зялёны луг ды сіні бор...

Названы верш Генадзя Бураўкіна – адзін з цудоўнейшых узораў як для выхавання паэтычнага густу, так і для фарміравання нацыянальнай самасвядомасці малодшых школьнікаў. Любоў аўтара да Радзімы найперш выяўляецца ў вершы праз замілаванне яе прыродай. Любіць Радзіму – значыць умець бачыць яе някідкую прыгажосць, блізкую і дарагую для кожнага беларуса.

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець ідэйна-эстэтычны змест верша Генадзя Бураўкіна «Край мой»;

– зацікавіць дзяцей жыццём і творчасцю паэта;

– спрыяць развіццю ўзнаўляльнага і творчага ўяўлення малодшых школьнікаў, вучыць іх разуменню вобразнага значэння моўных сродкаў;

– вучыць пачынаючага чытача бачыць асобу аўтара, разумець аўтарскую пазіцыю;

– выхоўваць цікавасць да паэзіі, павагу да пісьменніцкай працы, пачуццё гонару за беларускую літаратуру.

***Парадак працы***

1. Уступная праца

– Сёння на ўроку мы пазнаёмімся з вершам пра Радзіму аднаго з вядомых сучасных паэтаў Генадзя Бураўкіна. Я прачытаю верш двойчы, а вы выкажаце свае заўвагі.

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

– Спачатку педагог чытае гучна, пафасна першыя восем радкоў, пасля чаго звяртаецца да класа:

– Ці так трэба чытаць гэты верш? *(Не, не так.)*

– Чаму не так? *(Паэт піша, што ўбор роднага краю самы звычайны, таму і чытаць трэба так, як мы гаворым.)*

– Усё правільна. Я рады, што вы гэта зразумелі. Цяпер прачытайце верш моўчкі і падкажыце мне, якія пачуцці неабходна перадаць у вершы. *(Пачуццё любові, замілаванасці.)*

– Малайцы, вельмі добра. Як сын ганарыцца сваёй маці, якая ў кожнага чалавека толькі адна, так і паэт ганарыцца сваёй Радзімай, беларускім краем.

Настаўнік яшчэ раз чытае верш на памяць, выдзяляючы ключавыя словы, прытрымліваючыся адпаведнага тэмпу.

3. Самастойнае чытанне верша вучнямі

4. Аналіз верша, практыкаванні ў выразным чытанні

– Звярніце ўвагу на назву твора: звычайна гавораць і пішуць «мой край», а ў гэтым выпадку словы памяняліся месцамі. Чаму паэт зрабіў так?

**З. М.** У дыялогу настаўніка з класам высвятляецца, што пры такім становішчы лагічны націск пераходзіць на слова «мой», якое набывае статус выказніка ў двухсастаўным сказе (вядома, дзецям гэта трэба сказаць па-іншаму). Тым самым паэт падкрэслівае сваю вернасць зямлі бацькоў.

– Падрыхтуйцеся прачытаць услых першыя восем радкоў. Як вы разумееце слова «зрэбны»? *(Зрэб'е – гэта саматканае адзенне, якое нашы продкі насілі штодня.)*

– Чаму аўтар ужыў гэтае не зусім зразумелае сёння слова? *(Генадзю Бураўкіну дарагое ўсё, што звязана з Радзімай, з яе даўнінай. «Зрэбны» – гэта не толькі «просты», але і «дарагі».)*

– А якое слова супрацьпастаўлена слову «зрэбны»? *(Срэбны.)*

– Як гучаць гэтыя словы, чым адрозніваюцца? *(Яны рыфмуюцца, адрозніваюцца ўсяго адным гукам.)*

– Такая вельмі дакладная рыфма дапамагае нам выразней уявіць створаную карціну, а таксама робіць паэтычныя радкі запамінальнымі. А што мае на ўвазе аўтар, калі піша, што ўбор роднага краю «не залаты зусім, не срэбны»? *(На Беларусі няма высокіх гор, мора, ніякіх цудаў... Няма таго, што можа здзівіць чалавека.)*

– Прачытайце верш моўчкі і знайдзіце радкі, у якіх гэтая ж думка выказана па-іншаму, другімі словамі. (Вучні знаходзяць і чытаюць:

Ты не сляпіў вачэй.
Быў просты
Ва ўсе вякі твой родны ўзор:
Гаёў бялюткія бярозы.
Густы блакіт лясных азёр...)

– Якія малюнкі прыроды вабяць, захапляюць паэта? Чытайце па адным малюнку. *(«Зялёны луг». «Ды сіні бор». «Каля дарогі жыта ў полі»...)*

– Як вы разумееце слова *прыпол? (Ніжні пярэдні край сукенкі, кашулі, фартуха.)*

– У прыполе насілі букецікі лекавых траў, шчаўе. Калі жанчыны вышывалі ці вязалі, у прыполе ляжалі клубкі нітак. Што ўбачыў паэт у прыполе восені? Прачытайце. *(Вучні знаходзяць і чытаюць радкі:*

*Ды ў жоўтым восеньскім прыполе*
*Рабін даспелых аганькі.)*

– А што яшчэ можна заўважыць у «жоўтым восеньскім прыполе»? *(Грыбы, арэхі, кветкі верасу.)*

– Бачыце, якую цудоўную карціну сапраўдны паэт здольны намаляваць усяго некалькімі словамі. Калі б мы прачыталі, што восенню паспела рабіна, – усё было б вельмі звычайна, нецікава. Давайце мы з вамі трохі паразважаем. Якога колеру прыпол у лета, як вы лічыце? *(Зялёны, яркі, у рамонках.)*

– А што ў зялёным прыполе лета? *(Маліны, суніцы, парэчкі...)*

– Выходзіць, што ён духмяны і салодкі. А ці можна сказаць: *у прыполе вясны*? *(Нельга. Вясною не бывае ягад, грыбоў, садавіны.)*

– Пералічыце, калі ласка, яшчэ раз, якія колеры сустракаюцца ў вершы. *(Сіні, белы, зялёны, чырвоны.)*

– Які з іх найчасцей? *(Блакітны, сіні.)*

– Якога колеру ў вершы азёры? *(Аўтар піша: «Густы блакіт лясных азёр».)*

– Чаму паэт кажа, што блакіт густы? *(Неба блакітнае, але ад дрэў падае густы цень. Таму колер здаецца менавіта такім.)*

– А ці ёсць у вершы залаты колер? *(Генадзь Бураўкін не выкарыстаў гэтае слова, але залатым можа быць «каля дарогі жыта ў полі».)*

– Знайдзіце радкі, у якіх выказана прызнанне паэта ў любові да роднага краю. Падрыхтуйцеся прачытаць іх услых. *(Выслухоўваюцца некалькі чытальнікаў.)*

– Прасачыце, якія азначэнні выбірае паэт да слова «край». *(На дошцы, як працяг назвы твора, запісваецца: «Край мой, беларускі, адзіны, ад калыскі дарагі».)*

5. Асэнсаванне ідэйна-эстэтычнага зместу верша, пошук аўтара

– Што вы можаце сказаць пра паэта Генадзя Бураўкіна? З якой мэтай ён напісаў верш «Край мой»? *(Выслухоўваюцца адказы вучняў на кожнае з пастаўленых пытанняў. Настаўнік робіць падагульненне.)*

6. Выразнае чытанне ўсяго верша

**З. М.** Неабходна заўважыць, што ў творы няма ніводнага клічнага сказа і нават два апошнія радкі, дзе паэт прызнаецца ў любові да роднага краю, якая ідзе з ім ад самай калыскі, чытаюцца без клічнай інтанацыі.

7. Заключнае слова настаўніка

– Генадзь Бураўкін напісаў многа вершаў, прысвечаных Радзіме. Можа, гэта таму, што сам паэт часта быў адарваны ад яе. Ён працяглы час жыў і працаваў у Амерыцы, дзе абараняў інтарэсы Беларусі ў ААН. На словы Генадзя Бураўкіна напісана шмат песень. Яны склалі кнігу, якая называецца «Табе, Беларусь». *(Праслухоўваецца адна з вядомых песень на словы Генадзя Бураўкіна, прысвечаных Радзіме.)*

8. Дамашняе заданне

Вывучыць верш Генадзя Бураўкіна «Край мой» на памяць.

### *Верш Рыгора Барадуліна «Восьмы дзень сакавіка»*

Светлы месяц
Сакавік
Светлым дням
Вядзе падлік.
Як два сонцы –
Лічба восем.
Кветкі ўдзячнасці
Прыносім.

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець эстэтычны змест верша Рыгора Барадуліна «Восьмы дзень сакавіка»;

– зацікавіць дзяцей жыццём і творчасцю паэта;

– удасканальваць навыкі выразнага чытання клічных сказаў;

– актывізаваць эмацыянальную памяць вучняў, стварыць атмасферу суперажывання, эмацыянальнага водгуку на твор;

– выхоўваць пачуццё любові да маці, да роднай мовы, цікавасць да беларускай паэзіі.

***Парадак працы***

1. Уступная праца

Дзеці чытаюць дамашнія сачыненні, прысвечаныя маці.

**З. М.** Пры аналізе мастацкага твора настаўнік не павінен саромецца іншым разам выканаць заданні, што прапануюцца вучням. Пасля таго, як дзеці прачыталі дамашнія сачыненні, ён можа ўспомніць самага дарагога яму чалавека. Словы гэтыя паспрыяюць духоўнаму яднанню настаўніка з выхаванцамі, нададуць шчырасці і адкрытасці ва ўзаемаадносінах. Дзеці адчуюць у настаўніку старэйшага сябра, якому можна даверыць самае патаемнае.

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

3. Высвятленне эмацыянальнага ўздзеяння твора на вучняў

Дзеці дзеляцца ўражаннямі ад пачутага, гавораць пра тое, што ім найбольш запомнілася.

**З. М.** Верш надзвычай лёгкі для ўспрымання. Няма неабходнасці «даследаваць» тут кожную метафару. Ёсць толькі нагода здзівіцца майстэрству сапраўднага мастака слова, адчуць радасць ад судакранання з сапраўднай Паэзіяй. Рыгор Барадулін выдатна арыентуецца на ўзрост юнага чытача, ніколі не абражае недаверам да яго здольнасцей разумець паэтычнае слова. Ужо першы сказ напоўнены сонцам, святлом і вясною: *сакавік, светлы месяц, светлыя дні*. Вучні ўчытваюцца ў барадулінскія словы і атрымліваюць задавальненне ад мелодыкі верша.

4. Аналіз верша, практыкаванні ў выразным чытанні, асэнсаванне аўтарскай задумы і «пошук аўтара»

– Колькі ж дзён ужо адлічыў сакавік?

– З чым параўноўвае паэт лічбу восем? *(«Як два сонцы лічба восем».)*

– За што вы прыносіце мамам «кветкі ўдзячнасці»? *(За тое, што мама найлепшая, самая прыгожая, за тое, што любіць, проста за тое, што яна мама...)*

– Падрыхтуйцеся да чытання клічных сказаў. Падумайце, з якой інтанацыяй іх трэба прачытаць. *(Выслухоўваюцца некалькі чытальнікаў.)*

Мамін дзень –
Жаданы самы!
Сонца,
Мыйся даясна!..

– Як вы разумееце заключныя радкі «Ад усмешкі любай мамы пачынае шлях вясна»? *(«Маміна ўсмешка сагравае сэрцы дзяцей, як сонца саграваае зямлю», «Усе мамы заўсміхаліся – і таму пачалася вясна», «Калі мама ўсміхнулася, пахваліла цябе за нешта, тады і ў дрэннае надвор'е настрой робіцца выдатным...» Настаўнік хваліць дзяцей за цікавыя адказы, робіць падагульненне.)*

– Напэўна, усё гэта меў на ўвазе народны пісьменнік Беларусі Рыгор Барадулін, калі пісаў верш. І для яго вясна пачынала шлях «ад усмешкі любай мамы», Куліны Андрэеўны. Бацька не вярнуўся з вайны, і маці на ўсё жыццё засталася для паэта самым дарагім чалавекам. Рыгор Барадулін усюды гаворыць, што ён заўсёды вучыўся ў маці дабрыні, любові да людзей і да роднай зямлі. Ад маці ён запісаў некалькі соцень народных песень, з яе вуснаў пачуў мноства прыказак, жартаў, цікавых выразаў. І нават паэтам, па прызнанні самога Рыгора Іванавіча, ён стаў дзякуючы маці. *(Настаўнік паказвае вучням кнігу Рыгора Бадуліна «Евангелле ад мамы», чытае асобныя радкі вершаў.)* Цікава заўважыць, што народны пісьменнік, немалады чалавек, называе маці, як і ў дзяцінстве, – «мама». А з якімі словамі звяртаецеся да сваіх маці вы? *(Дзеці па чарзе называюць словы. На чыста вымытай дошцы каляровай крэйдай і прыгожым каліграфічным почыркам, не спяшаючыся, настаўнік запісвае шчымлівыя словы-пачуцці.)*

Дзеці, паслухайце, якімі яшчэ словамі звяртаюцца да маці ў розных кутках нашай  Беларусі. Ні ў аднаго народа свету няма столькі ласкавых слоў пра самага дарагога чалавека. Гэтым трэба ганарыцца, бо адносіны да маці характарызуюць яго самога. Вось гэтыя цудоўныя словы: *мама, мамачка, мамулька, мамулечка, мамуля, мамуленька, маці, матуля, матулька, матулечка, матуленька…* (даследчыкі налічваюць больш за сорак слоў). Паспрабуем да запісаных слоў падабраць азначэнні. Дапамагайце мне: *родная, дарагая… (Мілая, любая, любімая, добрая, нястомная, адзіная, клапатлівая, ласкавая, пяшчотная, руплівая…).*

**З. М.** Усе гэтыя словы народжаныя пачуццём. Моўныя сродкі і пачуццё павінны яднацца не толькі на ўроках, прысвечаных маці, але і на ўсіх астатніх уроках літаратурнага чытання. Слова, сагрэтае пачуццём пісьменніка і прапушчанае праз уражлівую дзіцячую душу, набывае магічную сілу. Такія словы асабліва выразна высвечваюцца ў кантэксце мастацкага твора.

– Які чалавек мог напісаць верш «Восьмы дзень сакавіка»? *(Таленавіты, добры, чалавек, які з павагаю ставіцца да ўсіх маці.)*

– Так, і зрабіў ён гэта па-майстэрску. На цяперашні час Рыгор Барадулін – адзін з найбольш вядомых беларускіх паэтаў. Яго вершы перакладзены на многія мовы свету.

5. Дамашняе заданне

Вывучыць верш на памяць, падрыхтавацца да конкурсу чытальнікаў.

**З. М.** Як можна заўважыць, на дадзеным уроку арганічна спалучыліся слова і пачуццё, па вялікім рахунку – методыка, лінгвістыка, псіхалогія і літаратуразнаўства. Але ў пачатку было слова, у нашым прыкладзе – «мама».

***Верш Веры Вярбы «Пралеска»***

Белыя бярозы
Спалі на ўзлеску,
Як сваю галоўку
Узняла пралеска.

***Мэты:***

– дапамагчы вучням зразумець эстэтычны змест верша Веры Вярбы «Пралеска»;

– стварыць атмасферу суперажывання, пачуццёвага водгуку на твор;

– вучыць дзяцей заўважаць вобразную ролю моўных сродкаў, дапамагчы зразумець, што ўжытае паэтам слова найлепшым чынам адпавядае кантэксту і ў высокамастацкім творы з’яўляецца незаменным;

– вучыць дзяцей разумець аўтарскую задуму праз паглыбленае асэнсаванне мовы мастацкага твора;

– выхоўваць любоў да прыроды, жаданне і ўменне бачыць прыгожае ў навакольным свеце.

***Парадак працы***

1. Падрыхтоўчая праца

– Ці назіраў хто-небудзь з вас за вясеннімі першацветамі? Раскажыце пра гэта.

2. Чытанне верша настаўнікам на памяць

3. Высвятленне эмацыянальнага ўздзеяння твора на вучняў

– Які агульны настрой верша? *(Верш трохі сумны: пралеска зусім адна, але ён добры, бо кветачцы ўсе рады.)*

– На самай справе, цяжка адказаць адным словам, які верш. Я сказаў бы, што верш Веры Вярбы светлы. Ці згодныя вы?

4. Аналіз верша, практыкаванні ў выразным чытанні

Пастарайцеся ўявіць кветачку на праталіне сярод лесу. Падрыхтуйцеся прачытаць адзін аднаму першую частку верша. Як вы будзеце чытаць? *(Нягучна, няспешна.)*

– Чаму? *(Бярозы спяць, лес маўчыць, вакол ляжыць снег.)*

Дзеці паўшэптам чытаюць адзін аднаму верш да слоў «Страшна стала кветцы: “Я адна жывая”».

– Дык якая ж кветка? *(Тоненькая, кволая, маленькая.)*

– А яшчэ? *(Слабая, безабаронная.)*

– Чаму вы так вырашылі? *(Вера Вярба піша, што пралеска «ўзняла галоўку». Спачатку галоўка яе была схілена да зямлі, і кветка баялася нават зірнуць на свет.)*

– Чаго ж болей за ўсё баялася пралеска? Адкажыце словамі верша. *(«Страшна стала кветцы: “Я адна жывая”».)*

– Пастарайцеся пры чытанні перадаць трывогу пралескі, страх перад невядомым. Кветачка не ведае, што чакае яе. *(Дзеці практыкуюцца ў чытанні трэцяй страфы.)*

– Хто першы павітаў пралеску? Падумайце, як трэба прачытаць словы сонца, і падрыхтуйцеся прачытаць іх услых.

– Што вас асабліва кранула ў прачытаных радках? *(Сонца для пралескі як ласкавая маці. Так маці звяртаецца да свайго дзіцяці – «зорачка». Сонейка вельмі рада, што пралеска зноў нарадзілася на свет.)*

– Бачыце, як многа ў вершы можна сказаць усяго адным словам… Давайце разам прыгледзімся да наступнай страфы. Чаму, на вашу думку, «белыя бярозы разам зашапталі…»? Можа, лепш было б сказаць «усміхнуліся», «загаманілі», «зашумелі». *(Бярозы толькі прачнуліся. Яны яшчэ без лісточкаў, таму не могуць шумець.)*

5. Асэнсаванне эстэтычнага зместу твора

– Малайцы, я вельмі рады, што вы ўважлівыя да слова. Без гэтага нельга зразумець верш, а чаго не разумееш – ніколі не палюбіш. Тым, хто вельмі жадае спасцігнуць верш, абавязкова адкрыюцца яго сакрэты. Нам засталося прачытаць усяго адну, заключную страфу. Менавіта ў ёй аўтары часцей за ўсё імкнуцца прыхаваць ключ ад верша. Скажыце, калі ласка, чаму ўздыхнула старая елка, пра што падумала.

(Ніжэй мы пастараемся узнавіць дыскусію, якая ўзнікла пры вывучэнні дадзенага верша ў канкрэтным класе.)

– Старая елка радая вясне, – заўважыў адзін з вучняў.

– Зусім не. Калі б яна радавалася, то паэтэса напісала б «радасна ўздыхнула».

– Уявім сабе, – спрабуе дапамагчы настаўнік, – што елка шкадуе аб мінулай зіме. Ёй і зімою было добра, утульна пад снежным покрывам. Як у такім выпадку ўздыхнула б старая елка?

– Цяжка ўздыхнула б, з горыччу.

– Чаму ж усё-такі старая елка ўздыхнула «голасна»?

– Елка пражыла многа гадоў, і яна вельмі рада, што дачакалася яшчэ адной вясны.

– Старая елка шкадуе, што так хутка ідзе час.

– Яна ведае: у пралескі кароткі век, і ёй шкада кветку.

– Елка таксама рада вясне, але яна старая і радуецца па-свойму...

– Вось і добра, што мы не прыйшлі да адзінай высновы, – бярэ слова настаўнік. – Было б вельмі нецікава, каб верш разумелі аднолькава ўсе чытачы. Разважаючы пра старую елку, мы з вамі імкнуліся асэнсаваць мастацкі вобраз, адчуць, што ўклаў у гэты вобраз паэт, наблізіцца да задумы паэта. Усе выказванні цікавыя. Я прапаную наступнае: няхай дома кожны пастараецца напісаць невялічкае, усяго некалькі радкоў, сачыненне «Чаму ўздыхнула старая елка?». Вашыя сачыненні мы прачытаем на наступным уроку.

**З. М.** Сачыненне, выказванне, пасланае канкрэтнаму адрасату, дысцыплінуе вучняў, абавязвае шукаць патрэбныя словы, прывучае да акуратнасці.

6. Дамашняе заданне

Вывучыць верш на памяць. Скласці пісьмовае выказванне «Чаму ўздыхнула старая елка?».

## ЗМЕСТ

*Слова да чытача*........................................................................ 3
Байка Францішка Багушэвіча «Воўк і авечка» ……………………..... 4
Верш Янкі Купалы «Над калыскай»..................................................... 7
Верш Янкі Купалы «Восень»................................................................. 11
Верш Янкі Купалы «Мароз»................................................................... 13
Верш Янкі Купалы «Зімой у лесе»........................................................ 15
Урывак з паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка»................................ 17
Верш Якуба Коласа «Родныя вобразы»................................................ 22
Верш Якуба Коласа «Адлёт жураўлёў»................................................ 25
Верш Якуба Коласа «Жытні колас»...................................................... 30
Верш Якуба Коласа «Зіма»..................................................................... 32
Верш Якуба Коласа «Дзед-госць»......................................................... 35
Верш Якуба Коласа «На рэчцы»............................................................ 38
Верш Якуба Коласа «Першы гром»....................................................... 41
Верш Максіма Багдановіча «Зіма»........................................................ 41
Верш Алеся Гаруна «Ты, мой брат, каго звяць Беларусам...»............. 47
Верш Алеся Гаруна «Добрыя дзеці»...................................................... 51
Верш Змітрака Бядулі «Вясна»............................................................... 55
Верш Канстанцыі Буйло «Люблю наш край»....................................... 57
Верш Петруся Броўкі «Восень»............................................................. 60
Верш Кастуся Кірэенкі «На санках»..................................................... 62
Верш Максіма Танка «Чаму птушкі лётаюць».................................... 64
Верш Сяргея Грахоўскага «Чалавеку патрэбна не слава...»……….... 67
Верш Генадзя Бураўкіна «Край мой»................................................... 70
Верш Рыгора Барадуліна «Восьмы дзень сакавіка»............................ 73
Верш Веры Вярбы «Пралеска»……………………………………... 76